WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

21 КАСТРЫЧНІКА 2009 г.
СЕРАДА
№ 199
(26557)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

У Сакратарыят АДКБ паступіў падпісаны Аляксандрам Лукашэнкам пакет дакументаў па КСАР

У Сакратарыят Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы паступіў падпісаны Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам пакет дакументаў, якія датычацца стварэння Калектыўных сілаў аператыўнага рэагавання (КСАР) АДКБ. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе арганізацыі.

У пакет дакументаў уваходзяць Пагадненне аб КСАР АДКБ і рашэнне Савета калектыўнай бяспекі АДКБ «Аб складзе Калектыўных сілаў аператыўнага рэагавання Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы». Прэзідэнт Беларусі таксама падпісаў Пагадненне аб асноўных прынцыпах стварэння сістэмы скрытага кіравання сіламі і сродкамі сістэмы калектыўнай бяспекі АДКБ.

Дамоўленасць аб фарміраванні Калектыўных сілаў аператыўнага рэагавання была дасягнута краінамі — удзельніцамі АДКБ у лютым гэтага года.

БЕЛТА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«УСІМ КАНДЫДАТАМ НА ВЫБАРАХ ПРЭЗІДЭНТА І Ў МЯСЦОВЫЯ САВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ БУДУЦЬ СТВОРАНЫ АДНОЛЬКАВЫЯ ЎМОВЫ»

Аб гэтым заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 20 кастрычніка на сустрэчы са старшынёй Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіяй Ярмошынай.

«Я прыхільнік правядзення сумленных, справядлівых, і, самае галоўнае, адкрытых палітычных кампаній, як у Саветы дэпутатаў, так і прэзідэнцкай. Я маю на ўвазе, што трэба даць усім роўныя магчымасці для падрыхтоўкі і ўдзелу ў гэтых кампаніях. Асабліва ў прэзідэнцкай кампаніі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Хачу адразу сказаць: мы заўсёды, як бы нас ні абвінавачвалі, паводзілі сябе сумленна і прыстойна, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Таму, я думаю, нам адыходзіць ад гэтага крытэрыю сумленнасці і прыстойнасці ў правядзенні такіх мерапрыемстваў нельга». Пры гэтым, закранаючы будучыя выбары, Прэзідэнт адзначыў, што «гэта будуць незвычайныя кампаніі, яны нічым не будуць падобныя на папярэднія, хоць і папярэднія для нас не былі лёгкімі, але з-за многіх абставінаў гэта будуць асабліві кампаніі, асабліва прэзідэнцкая».

Што датычыцца тэрмінаў дзвюх выбарчых кампаній, то выбары Прэзідэнта Беларусі пройдуць у пачатку 2011 года, а ў мясцовыя Саветы дэпутатаў — у другой палове вясны 2010 года, як мяркуецца, у красавіку.

Аляксандр Лукашэнка выказаў, што гэтыя выбарчыя кампаніі (у мясцовыя Саветы і прэзідэнцкая) пройдуць раздзельна. На яго думку, прэзідэнцкія выбары не павінны сумяшчацца з якой-небудзь выбарчай кампаніяй, каб не дэвальваваць іх сутнасць.

«Некаторыя гавораць, што трэба зэканоміць грошы і аб'яднаць гэтыя дзве палітычныя кампаніі: выбары ў Саветы і выбары Прэзідэнта. Так, штосьці мы зэканомім, але нас будуць крытыкаваць за тое, што нібыта ў хаосе правялі прэзідэнцкія выбары. Усё роўна абвінавацяць Прэзідэнта», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік беларускай дзяржавы лічыць, што сумяшчэнне дзвюх выбарчых кампаній створыць толькі нейкі хаос і цяжкасці для людзей, якім будзе складана разабрацца ў бюлетэнях. Акрамя таго, у гэтым няма і эканамічнай мэтазгоднасці. «Калі мы праводзім сумесныя выбары, мы мала што выйграем эканамічна або фінансава, але паставім пад пытанне перш за ўсё прэзідэнцкія выбары. Таму я прыхільнік таго, каб развесці гэтыя палітычныя кампаніі. І як мага большы прамежак пакінуць для падрыхтоўкі да прэзідэнцкіх выбараў. Гэта значыць, правесці выбары ў Саветы, а потым правесці выбары Прэзідэнта», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Зноў жа — сумленна і адкрыта», — дадаў ён.

На думку беларускага лідара, прэзідэнцкія выбары не варта праводзіць датэрмінова: «Некаторыя кажуць: не па нашай віне эканамічны крызіс пачаўся, пакуль сітуацыя церпіць, давайце датэрмінова правядзём прэзідэнцкія выбары. Але Канстытуцыя не дазваляе. У нас і крайні тэрмін, дарэчы, абмежаваны — не пазней за люты 2011 года. Я лічу, гэтак таксама рабіць нельга, таму што зноў адразу ж пачнуцца абвінавачванні, што ўлада пайшла на правядзенне выбараў як мага раней, нашы палітычныя апаненты не былі да гэтага падрыхтаваны, грошай не сабралі, не аб'ядналіся, не раз'ядналіся — зноў абвінавацяць нас».

«Таму я прыхільнік таго, каб стварыць максімальна аднолькавыя ўмовы для ўсіх. І, калі гэта магчыма, дапусцім, правесці выбары ў Саветы вясной будучага года (паглядзім па нашаму заканадаўству), а прэзідэнцкія выбары — як ні было б складана ў краіне, якая б ні была складаная эканамічная сітуацыя, палітычная — правесці ў 2011 годзе», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Усе ўбачаць свой рэйтынг, калі пройдуць выбары ў Саветы. І зробяць адпаведныя высновы, праўкі, у сувязі з гэтым вылучаць сваіх кандыдатаў на выбары ў 2011 годзе. Ужо ніхто не абвінаваціць нас, што мы штосьці не зрабілі. Ужо з сённяшняга дня павінен быць час, каб падрыхтавацца да гэтых прэзідэнцкіх выбараў», — лічыць беларускі лідар.

«Вельмі важна, каб мы настроіліся на тое, што да нас прыедуць тысячы, а не сотні розных назіральнікаў, добразычліўцаў і нядобразычліўцаў. Мы на гэта павінны пайсці. Няхай робяць высновы. І калі нехта баіцца, што сітуацыя наша зменіцца ў 2010 годзе не ў лепшы бок і што гэты крызіс прадоўжыцца і народ адпаведным чынам на гэта адрэагуе, я павінен сказаць, што гэта права народа», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Народ мае права рэагаваць так, як ён лічыць патрэбным. Гэта выбары. Націскаць на выбарах ні на каго нельга. Калі будзе дрэнная сітуацыя, калі мы не зможам народу растлумачыць і пераканаць яго, што гэта не наша віна, што ж, права народа зрабіць адпаведныя высновы. Растлумачым мы людзям (а людзі ў нас дасведчаныя і разумныя, яны зразумеюць сітуацыю), растлумачым народу, нават калі і пагоршыцца сітуацыя, паверыць народ — дзякуй. Гэта права народа — права выбару, — падкрэсліў Прэзідэнт. — І мне здаецца, калі мы сумленна пойдзем на гэтыя выбары, у нас ёсць шанц застацца ў гісторыі перад сваім народам сумленнымі і прыстойнымі людзьмі».

Яшчэ адно важнае рашэнне, якое прыняў учора Прэзідэнт, датычыцца лібералізацыі выбарчага заканадаўства Беларусі. Цэнтрвыбаркам унясе кіраўніку дзяржавы шэраг прапаноў, накіраваных на ажыццяўленне некаторых прапаноў АБСЕ і беларускіх палітычных партый. Яны датычацца спрашчэння парадку вылучэння кандыдатаў у дэпутаты, мераў па дадатковай ахове скрынь для галасавання, забеспячэнню надзейнасці датэрміновага галасавання і іншых тэхнічных момантаў, якія маюць патрэбу ва ўдасканаленні. Як адзначыла Лідзія Ярмошына, некаторыя прапановы датычацца таго, што ўжо даўно прымянялася ў Беларусі на практыцы, аднак цяпер гэта будзе заканадаўча ўрэгулявана.

Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, выбары павінны прайсці ў рамках беларускай Канстытуцыі і тых законаў, якія сёння існуюць. «Калі толькі мы адступім ад Канстытуцыі, будзе гэта па патрабаванню Еўропы, Амерыкі, усходніх суседзяў або яшчэ некага, значыць, мы будзем браць пад сумненне сам дакумент», — адзначыў Прэзідэнт. «Нас таксама крытыкавалі за гэта, але мы стойка і мужна дзейнічалі ў рамках нашай Канстытуцыі. Канстытуцыя — гэта святое, таму будзем праводзіць нашы выбары у рамках нашай Канстытуцыі, у рамках тых законаў, якія сёння існуюць», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

«Калі ў рамках гэтых законаў можна зрабіць найбольшы ліберальны клімат (а мы маем вопыт), мы з вамі павінны гэта зрабіць, каб нас зноў жа не папракалі ў тым, што мы узурпіравалі ўладу, што тут дыктатура і мы праводзім выбары так, як трэба нам. Гэтага быць не павінна. Таму я прыхільнік самых ліберальных выбараў», — сказаў Прэзідэнт.

Прапануецца таксама заканадаўча адрэгуляваць паўнамоцтвы такога важнага грамадскага органа Цэнтральнай камісіі, як Наглядальны савет па інфармацыйных спрэчках. Цэнтрвыбаркам унясе прапановы, каб палажэнні аб гэтым савеце і яго паўнамоцтвах увайшлі ў выбарчае заканадаўства, паколькі гэты орган вельмі важны ў перыяд правядзення агітацыі на выбарах, адзначыла Лідзія Ярмошына.

У пачатку 2011 года заканчваецца тэрмін паўнамоцтваў дзеючага Прэзідэнта Беларусі, таму не пазней за 7 лютага 2011 года павінны адбыцца прэзідэнцкія выбары. І не пазней за 13 снежня 2010 года — выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. Пры гэтым выбары Прэзідэнта — у тэрміны, устаноўленыя Канстытуцыяй, гэта значыць не пазней за два месяцы да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў. Таму выбары Прэзідэнта пройдуць у пачатку 2011 года, як вызначае Канстытуцыя і выбарчае заканадаўства, а выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў — раней. «Дэпутаты недзе паўгода не дапрацуюць, таму што выбарчыя кампаніі трэба па часе расцягваць даволі значна», — сказала Лідзія Ярмошына.

Паколькі выбарчая кампанія доўжыцца тры месяцы, то ўжо ў студзені 2010 года краіна ўступіць у кампанію па выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў, адзначыла Лідзія Ярмошына. «Мы знаходзімся напярэдадні вялікага палітычнага сезона, які закране ўсе бакі жыцця краіны», — дадала яна.

Падводзячы вынікі праведзенай сустрэчы, Лідзія Ярмошына паведаміла, што «сустрэча была вельмі насычанай і дала магчымасць у многім вызначыць стратэгію работы Цэнтральнай камісіі, а таксама органаў, якія працуюць у галіне ўдасканалення заканадаўства».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Цана газу для Беларусі павінна фарміравацца з улікам пераносу тэрмінаў выхаду на роўнадаходныя цэны ў Расіі

Цана газу для Беларусі павінна фарміравацца з улікам пераносу на больш позні тэрмін выхаду на роўнадаходныя цэны ў Расіі. Такую думку выказаў учора журналістам першы намеснік міністра энергетыкі Беларусі Эдуард ТАЎПЯНЕЦ.

«Мы не столькі гаворым аб паніжэнні цаны для Беларусі, колькі аб тым, што мы павінны сінхронна ісці з Расіяй у дасягненні роўнадаходных цэнаў», — сказаў Эдуард Таўпянец. Калі беларускія прадпрыемствы будуць атрымліваць газ па еўрапейскіх цэнах, а расійскія — па цэнах значна ніжэйшых, канкурыраваць у гэтых умовах беларускім суб'ектам гаспадарання будзе цяжка. «Неабходна забяспечыць роўныя ўмовы для суб'ектаў гаспадарання дзвюх краін», — падкрэсліў ён.

Разам з тым першы намеснік міністра не чакае, што перагаворы з расійскім бокам па цане газу на 2010 год будуць простыя. «Не трэба забываць, што ёсць кантракт, і расійскі бок будзе настойваць на тым, каб прапісаная ў ім цана захоўвалася».

Эдуард Таўпянец адзначыў, што пазіцыя беларускага боку ў тым, каб «пры любых абставінах цана газу была прымальная». Паводле яго слоў, беларуская дэлегацыя яшчэ не накіроўвалася ў Маскву для перагавораў з ААТ «Газпрам» па пастаўках газу на 2010 год. Дата перагавораў яшчэ не ўзгоднена.

БЕЛТА.

КАЗАКІ ДАПАМОГУЦЬ МАНАШКАМ

У вёсцы Баркалабава Быхаўскага раёна, дзе цяпер адраджаецца жаночы манастыр, казакі вырашылі заснаваць сваю станіцу.

— Казакі заўсёды ахоўвалі праваслаўе, — пракаментаваў атаман Магілёўскага гарадскога казацкага аддзела Сяргей Лемяшэўскі. — Мы маем намер пабудавацца побач з царкоўным комплексам, весці падсобную гаспадарку для патрэбаў манастыра і паломнікаў, а таксама праводзіць там казацкія мерапрыемствы і адзначаць духоўныя святы. Казакі будуць несці дзяжурства ў Баркалабаве і, можа, знойдуцца мясцовыя жыхары з казацкімі каранямі, якія будуць даглядаць станіцу.

Будаўніцтва плануецца на наступны год, а да канца гэтага магілёўскія казакі зоймуцца падрыхтоўкай будаўнічай пляцоўкі для станіцы і дапамогуць ва ўзвядзенні манастырскіх пабудоў.

Цяпер на беразе Дняпра, дзе ў старажытнасці быў вялікі манастыр, ёсць не толькі сімвалічны крыж і часовы храм-палатка. Завяршаецца будаўніцтва жылога корпуса, расце будынак царквы. Баркалабава сёння мае статус аграгарадка і размяшчаецца непадалёк ад абласнога цэнтра. Тут адраджаецца манастыр, у суседняй вёсцы Залахвенне ёсць аграэкасядзіба.

Ілона ІВАНОВА.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

22 кастрычніка 2009 г. у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу трэцяя сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.10.2009г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	2 718,00
▼ 1 еўра	4 071,02
1 латвійскі лат	5 747,52
1 літоўскі літ	1 177,23
1 чэшская крона	157,93
1 польскі злоты	973,98
▲ 1 расійскі рубель	93,11
1 украінская грыўня	329,45

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрбанк РФ

USD	29,1911
UAH	35,3832
1000 BYR	10,7084
EUR	43,7166

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ВЫКРАЎ ЦЕСЦЯ

5 мільёнаў рублёў запатрабаваў у былой жонкі за выкрадзенага цесця неаднаразова судзімы гамяльчанін.

П'яны ён завітаў на вяслярную базу Гомельскай установы алімпійскага рэзерву, выкраў мабільнік вартаўніка, яго былога цесця, 1939 года нараджэння. Пасля чаго вар'ят з гвалтам і пагрозамі звязаў былога сваяка і загрузіў у салон яго ж «Масквіча». Злачынец патэлефанаваў былой жонцы і паведаміў, што калі тая не дасць яму грошы, ён абалье бацьку бензінам і падпаліць. Дачка паведаміла аб пагрозе ў міліцыю, якая адразу накіравала на месца здарэння экіпаж дэпартамента аховы міліцыі. 34-гадовы злачынец недалёка ад'ехаў ад вяслярнай базы, калі пабачыў за сабой пагоню. Ён кінуў машыну са звязаным 70-гадовым цесцем і знік у цемры. Пасля ўцёкаў мужчына хаваўся ў вёсцы Ніўкі Добрушскага раёна, зноў патрабаваў грошы ў былой жонкі і планаваў перайсці ўкраінскую мяжу. Перашкодзіла міліцэйская аперацыя. Як паведаміў начальнік крымінальнага вышуку Навабеліцкага РАУС Павел Закалодны, які асабіста затрымаў ліхадзея, той быў здзіўлены з'яўленню міліцыі ноччу ў доме яго сястры і не паспеў аказаць значнага супраціўлення. Ён абвінавачваецца ў выкраданні транспартнага сродку, у пагрозе забойства і ў рабаванні.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЖЫВОЕ ПАВІННА БЫЦЬ ЖЫВЫМ!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Учора раніцай, яшчэ зацёмна, я адправіўся на Лагойшчыну на фотаздымкі ласёў, казуль і кабаноў. Але і ўявіць сабе не мог, што, ад'ехаўшы якіх пятнаццаць кіламетраў ад сталіцы, убачу забітага лася і пашкоджаныя аўтамабілі.

Інцыдэнт адбыўся літаральна за некалькі хвілін да майго з'яўлення. На аўтаімагістраль Мінск—Віцебск паблізу павароту на Раўбічы, выскачыўшы на праезную частку, лясны госць імгненна патрапіў пад удар мікрабуса, які рухаўся ў бок Віцебска. Потым пяцігадовы лось (мяркуючы па колькасці адростаў на рогах) адскочыў на сустрэчную паласу і стаў ахвярою іншамаркі, якая рухалася ў бок сталіцы. Пасля другога сутыкнення хутканогі звяліўся на раздзяляльнай паласе. Не ведаю, на якой хуткасці імчаліся аўтамабілі, але звычайна ў гэты час дарога пустая. Магчыма, сутыкненне адбылося з-за дрэннай бачнасці, і да таго ж на аўтатрасе пасля туманна-марознай ночы было слізка. Вадзіцелі павінны ўлічваць усе абставіны, у тым ліку і магчымасць нечаканага з'яўлення жывёлы на дарозе. Жывёлам, як вядома, законы не пішуць.

Несумненна, гэта каварны збег абставінаў, крыўдны і непапраўны. Аўтасродкі давядзецца аддаваць у рукі аўтарамонтнікаў. Але, галоўнае, абышлося без чалавечых ахвяраў і нават без сур'ёзных траўмаў. Хай гэта стане добрым урокам на будучыню. Мне міжволі падумалася, магчыма, гэта быў той самы лось-прыгажун, якога я збіраюся фатаграфаваць, толькі не ў гэткім стане...

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

Ва ўрадзе

КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦЬ І Ў ЯКАСНЫМ АБНАЎЛЕННІ

Беларусь — транзітная краіна, таму транспартнікі павінны шукаць спосабы павелічэння аб'ёмаў аўтаперавозак. Гэта зазначыў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, дзе разглядаўся ход выканання Дзяржаўнай праграмы развіцця міжнародных аўтамабільных перавозак пасажыраў і грузаў на 2003—2010 гады, першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка. Нягледзячы на аб'ектыўныя прычыны, у прыватнасці, сусветны крызіс, гэтая задача цалкам вырашальная. Тым больш, што ёсць станоўчыя прыклады іншых міністэрстваў і ўстаноў, якія ў няпростых умовах, што склаліся на сусветных рынках, працуюць з плюсам. Так, паводле слоў Уладзіміра Сямашкі, у тым жа канцэрне «Белнафтахім» тэмп росту за дзевяць месяцаў склаў 111,6 працэнта.

Урад не ўпершыню звяртаецца да згаданай праграмы. Два гады таму на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў ішло сур'ёзнае яе абмеркаванне і па яго выніках прынялі рашэнне прадоўжыць праграму да 2010 года. Тады ж адзначалася, што праграма спрацоўвае, дае добрыя вынікі. Так, за 2002—2008 гады экспарт паслуг па міжнародных грузавых аўтаперавозках узрос у 3,4 раза, экспарт перавозак пасажыраў — у 5,2. Аднак летась і сёлета, нягледзячы на пэўны рост транспартных паслуг, даводзіцца канстатаваць, што дадатковыя захады, якія прымаліся, спрацавалі не ў поўным аб'ёме. Напрыклад, за 8 месяцаў гэтага года пры заданні ў 122 працэнты тэмп росту аўтаперавозак да ўзроўню аналагічнага перыяду 2008 года склаў 71,8 працэнта. Як зазначыў Уладзімір Сямашка, такія паказчыкі не могуць задавальняць. Да канца года, падкрэсліў ён, яшчэ ёсць час, каб атрымаць рост аб'ёму паслуг на 10 працэнтаў.

У сваю чаргу міністр транспарту і камунікацый Іван Шчэрба напачатку распавёў пра тыя захады, якія дазволілі з 2002 па 2008 гады істотна павялічыць паказчыкі па экспарце паслуг па перавозцы грузаў аўтатранспартам. У прыватнасці, ён звярнуў увагу на павышэнне эфектыўнасці выкарыстання транспартных сродкаў, а таксама на якаснае абнаўленне аўтапарка. Што датычыцца апошняга, то доля грузавога аўтатранспарту, які выкарыстоўваецца ў міжнародных перавозках, з тэрмінам эксплуатацыі, меншым за тры гады, павялічылася з 10 працэнтаў у 2002 да 33 працэнтаў летась. Разам з тым, міністр прызнаў і тое, што гэтыя тэмпы ўсё яшчэ недастатковыя і што гэта негатыўна ўплывае на колькасць тых жа паездак беларускіх перавозчыкаў, якая пачала зніжацца. Сёлета па выніках дзевяці месяцаў беларускія міжнародныя перавозчыкі ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года зменшылі колькасць паездак на 8,6 працэнта. Між іншым, на фоне нашых суседзяў гэтая лічба падаецца не такой ужо і катастрафічнай: напрыклад, колькасць паездак перавозчыкаў у Расіі за гэты перыяд скарацілася на 11 працэнтаў, у Латвіі — на 13, у Польшчы — на 21, ва Украіне — на 25, у Літве — на 33 працэнты.

На думку Івана Шчэрбы, перспектывы развіцця міжнародных перавозак пасажыраў шмат у чым залежаць ад стану і структуры парка аўтобусаў. Тут таксама канкурэнтаздольнасць айчынных перавозчыкаў будзе ўзрастаць па меры абнаўлення парка. Паводле агучанай інфармацыі, пакуль у беларускіх перавозчыкаў сучасных мадэляў аўтобусаў недастаткова — 34 працэнты ад агульнай колькасці парка складаюць аўтобусы з тэрмінам эксплуатацыі, большым за 20 гадоў. Разам з тым, міністр адзначыў і той факт, што за некалькі апошніх гадоў у рэспубліцы ўдалося значна папоўніць парк новымі аўтобусамі. Удзельная вага аўтобусаў з тэрмінам эксплуатацыі да 10 гадоў павялічылася з 19 працэнтаў у 2002 годзе да 41,5 у 2009, узрасла іх колькасць з тэрмінам эксплуатацыі да 5 гадоў — з 23 працэнтаў у 2006 да амаль 29 у 2009-м. Прычым, удзельная вага аўтобусаў замежных марак («Ікарус», «Сетра», «Неаплан») змяншаецца, а доля айчынных аўтобусаў МАЗа павялічваецца — з 12 працэнтаў у 2006 годзе да 18,6 у гэтым.

Міністр таксама паведаміў, што для забеспячэння турыстычнай індустрыі рэспублікі аўтобусамі, а таксама з цэлым для развіцця міжнародных аўтамабільных перавозак пасажыраў, у тым ліку ў турыстычных мэтах, падрыхтаваны і ўнесены ва ўрад праект указа, які прадугледжвае захады па забеспячэнні арганізацый аўтатранспарту аўтобусамі турыстычнага класа.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

САВЕТАМ, КАРДЫНАЛЕ!

Сёння Кардынал Казімір Свёнтэк адзначае 95-годдзе



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Кардынал Казімір Свёнтэк для мяне ёсць сімвал таго, як высокадухоўны, рэлігійны чалавек аддана служыць Госпаду і свайму народу. У цяжкія часы, калі рэлігія не была ў пашане, Кардынал захаваў веру ў Бога і ў людзей.

Рэдка хто мае такі пакручасты лёс, поўны цяжкіх выпрабаванняў, нібы ў біблейскага Ёва. Нарадзіўся Казімір Свёнтэк да рэвалюцыі, у далёкім 1914 годзе. Калі Казіміру было 3 гады, бацькоў выслалі ў Сібір. У 1939 годзе Свёнтэк скончыў Вышэйшую духоўную семінарыю ў Пінску. 8 красавіка таго неспакойнага года атрымаў святарскае пасвячэнне і быў накіраваны ў Пружанскі прыход. Новая ўлада пераследавала святароў — Свёнтэка арыштавалі (са звычайнай у тыя страшэнныя часы фармулёўкай «за шпіянаж») і прысудзілі да смерці. Два месяцы ў Брэсцкай турме будучы Кардынал знаходзіўся ў камеры смяротнікаў. Воляю лёса ўратавала яго вайна — у 1941 годзе Брэст занялі немцы і выпусцілі вязняў. У 1944 савецкая ўлада зноўку арыштавала святара і дала 10 гадоў катаргі ў Сібіры. Адседзеў ад званка да званка.

У 1954 годзе, вярнуўшыся ў Пінск, ксёндз Казімір спраўдзіў даўнюю мару — адправіў Святую Імшу ў касцёле. Ягонымі намаганнямі і малітвамі была адноўленая Пінская катэдра — адзін з першых адноўленых храмаў у Беларусі. У канцы 1980-х прыйшла доўгачаканая свабода веравызнання.

Пастырская дзейнасць, нязломнасць і адданасць веры не мінуліся незаўважанымі. У 1991 годзе Папа Ян Павел II прызначыў Казіміра Свёнтэка першым Мітрапалітам нанова створанай Мінска-Магілёўскай Мітраполіі і апостальскім Адміністратарам Пінскай епархіі.

СТАР. 2

МІЛЬЁНЫ З МЕХА

Учора ноччу сталічныя праваахоўнікі затрымалі злодзея, які вяртаўся са «справы» з мехам, набітым дабром на дзясяткі мільёнаў.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, глыбокай ноччу спрацавала сігналізацыя ў краме «Пяты элемент», і трывожны сігнал паступіў на пульт дзяжурнага аддзела дэпартамента аховы Першамайскага раёна. Да месца здарэння тэрмінова прыбыла група затрымання, якая заспела зладзюжку ў той момант, калі ён выбіраўся праз разбітае шкло з крамы. Апошні, калі ўбачыў людзей пры пагонах, паспрабаваў збегчы. Спрытнюгу спыніў толькі папераджальны стрэл у паветра, які зрабіў міліцыянер з табельнай зброі. Калі ж праваахоўнікі пацікавіліся, што стала здабычай злодзея, высветлілася — выкрадзенага ў мяху было на 80 мільёнаў рублёў. Затрыманы «затаварыўся» відэакамерамі, лічбавымі фотаапаратамі і мабільнымі тэлефонамі.

Ігар ГРЫШЫН.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ГЕАГРАФІЯ ГАНДЛЮ КРАІНЫ ПАШЫРАЕЦЦА

За мінулыя дзевяць месяцаў гэтага года колькасць краін, з якімі гандлявала Беларусь, істотна павялічылася.

Так, паводле апошніх звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, на пачатку года наша краіна ажыццяўляла экспартна-імпартныя аперацыі са 127 краінамі, а ў студзені—жніўні ўжо гандлявала са 169 краінамі. Сёлета ў студзені—жніўні беларускія тавары пастаўляліся на рынкі 132 дзяржаў, а імпартавалася прадукцыя са 158 краін. Паранейшаму асноўным гандлёвым партнёрам рэспублікі застаецца Расія, на якую прыпадала 47,1 працэнта ўсяго аб'ёму таваразвароту. Акрамя таго, сярод асноўных нашых партнёраў: Нідэрланды — 8 працэнтаў усяго аб'ёму таваразвароту, Германія — 6,1, Украіна — 5,9, Латвія — 3,4, Польшча — 3,3, Кітай — 2,5, Злучанае Каралеўства — 2, Італія — 1,8, Бразілія — 1,6 працэнта.

Ігар ГРЫШЫН.

«ВАЯЖ» У ШВЕЦЫЮ САРВАЎСЯ

На чыгуначным вакзале ў Мінску супрацоўнікі ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі ГУУС Мінгарвыканкама затрымалі 45-гадовую грамадзянку Казахстана, якая спрабавала вывезці трох беларусак за мяжу для сэксуальнай эксплуатацыі.

Паводле звестак начальніка аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандра Ластоўскага, пра тое, што вярбоўшчыца арганізоўвае канал вывазу нашых суайчыннiц для занятку прастытуцыяй на тэрыторыю Заходняй Еўропы, супрацоўнікі міліцыі даведаліся месяц таму. Увесь гэты час сталічныя праваахоўнікі вялі дэталёвую аператыўную распрацоўку гэтай інфармацыі, у выніку чаго і затрымалі «сваццю» з доказамі віны. Жанчына, дарэчы, арганізавала «ваяж» для беларусак у Швецыю, аднак далей за сталічны чыгуначны вакзал «падарожніцы» не выехалі. Гэта ўжо 11 падобнае затрыманне трафікёраў пры спробе вывазу нашых грамадзян з мэтай сэксуальнай эксплуатацыі за мяжу.

Ігар ГРЫШЫН.

МІНЧАНІНА З СЯБРОЎКАЙ ЗАГУБІЎ «ДУРМАН»?..

У Мінску ноччу ў кватэры дома па вуліцы Прытыцкага супрацоўнікі міліцыі знайшлі нежывымі 38-гадовага гаспадара і яго 25-гадовую сяброўку, целы якіх ляжалі на канапе.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр Ластоўскі, на месцы здарэння не было знойдзена ніякіх слядоў гвалтоўнай смерці. Ахвяры, хутчэй за ўсё, самі вінаватыя ў сваёй заўчаснай смерці. Сутнасць у тым, што і мужчына, і жанчына неаднаразова спажывалі наркотыкі, і таму адна з версій здарэння — перадазіроўка «дурманам». Больш за тое, напярэдадні яны разам з братам загінулага ўвесь дзень пілі спіртное. А падчас апошняга застолля вечарам на траіх выпілі больш за пяць бутэлек гарэлкі. Між іншым, асобы нябожчыкаў добра знаёмыя супрацоўнікам міліцыі. Напрыклад, гаспадар кватэры, раней неаднаразова судзімы за крадзяжы, у гэтым годзе таксама трапіў у поле зроку праваахоўнікаў па падазрэнні ва ўчыненні аналагічнага злачынства ў складзе групы. Яго сяброўка таксама прыцягвалася да крымінальнай адказнасці за крадзеж.

Ігар ГРЫШЫН.

ТАК ЗАХАЦЕЛАСЯ Ў МІЛІЦЫЮ

50-гадовы цясляр аднаго з гомельскіх прадпрыемстваў, каб вызваліцца на дзень ад працы, паказаў свайму начальству павестку ў міліцыю. Афіцыйны дакумент быў зроблены сваімі рукамі. Менавіта таму па гэтым факце ўзбуджана крымінальная справа.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

У КІРАЎСКУ РАСІЯНЕ І БЕЛАРУСЫ ЗАКЛАЛІ АЛЕЮ СЯБРОЎСТВА

Больш за сотню саджанцаў дубоў і клёнаў прывезлі і пасадзілі ў цэнтры Кіраўска госці з Белгародскага раёна і Бранскай сельскагаспадарчай акадэміі. Такім чынам у Год роднай зямлі расіяне і беларусы вырашылі замацаваць сваё шматгадовае сяброўства.

У акцыі бралі ўдзел госці з Белгарада і Бранска, а з беларускага боку — намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Валерый Іваноў, старшыня Кіраўскага райвыканкама Уладзімір Пяскіжаў, кіраўнікі ўстаноў і сельскіх гаспадарак Кіраўскага раёна, работнікі райвыканкама, вучні і іншыя. Расіяне павезлі дадому падарунак з Кіраўска: саджанцы яблынь і грушавых дрэў, якія пасадзяць у знак сяброўства на алеях сваіх гарадоў.

Ілона ІВАНОВА.

ІНДУСТРЫЯ ДАБРАБЫТУ

PRO бюджэт

Сёння пластыкавыя карткі для жыхароў нашай краіны ўжо не з'яўляюцца атрыбутам прыгожага і дарагога жыцця. Яны трывала ўвайшлі ў паўсядзённы побыт, заваявалі папулярнасць і ў шэрагу выпадкаў прадэманстравалі перавагу ў параўнанні з гатоўкаю ў кашальку. Паводле статыстыкі Нацыянальнага банка, на 1 ліпеня гэтага года колькасць банкаўскіх пластыкавых картак у Беларусі складала больш за 6,5 млн штук, за адзін толькі 2008 год колькасць картак у абарачэнні вырасла на 35 працэнтаў. Пры гэтым амаль 90 працэнтаў — гэта карткі міжнародных сістэм разлікаў.

«Беларускі Індустрыяльны Банк» таксама прыступіў да эмісіі міжнародных пластыкавых картак Visa Electron, самых папулярных і даступных у свеце картак аплатнай сістэмы Visa International. У чым жа перавагі гэтага банкаўскага прадукта? Пра гэта нам раскажа **начальнік падраздзялення банкаўскіх пластыкавых картак Аляксей ПІВАВАРАЎ:**

— Перавагай пластыкавай карткі нашага банка з'яўляецца найперш тое, што яна спалучае ў сабе якасці міжнароднай і зарплатнай. З яе дапамогай вы можаце не толькі атрымліваць зарплату і выконваць аперацыі ў банкаматах і інфакіёсках, разлічвацца за пакупкі на тэрыторыі Беларусі ў нацыянальнай валюце, але і здзяйсняць такія ж аперацыі за мяжой, прычым у валюце краіны знаходжання. Пагадзіцеся, гэта вельмі зручна і бяспечна.

— Аляксей, я збіраюся ў хуткім часе паехаць на адпачынак у Аб'яднаныя Арабскія Эміраты. І, адкрыўшы карт-рахунак у беларускіх рублях у вашым банку, якім чынам я магу там рабіць пакупкі ў крамах, здымаць наяўныя?

— Усё гэта можна будзе зрабіць без праблем. У Эміратах пры неабходнасці вы зможаце зняць наяўныя — дырхамы, разлічыцца па безнаяўным разліку за тавары ці паслугі таксама ў валюце краіны знаходжання.

— А калі раптам на картцы скончыліся грошы, не разлічыла свой «фінансавы апетыт»?

— Хачу звярнуць вашу ўвагу на тое, што калі раптам у вас на картцы скончыліся грашовыя сродкі ў беларускіх рублях, то ўнесці грошы на вашу картку можа любая фізічная асоба — ваш муж, дачка ці мама. Для гэтага трэба падысці з пашпартам у банкаўскі офіс па вуліцы Мельнікайтэ, 8. І грошы праз некалькі хвілін будуць даступныя трымальніку карткі, дзе б ён ні знаходзіўся.

— Я зноў пра Эміраты. Запланавала там набыць ювелірныя вырабы для сябе і для дачкі, патраціць даволі шмат грошай. Адпаведна, і на картцы ў мяне будзе прыстойная сума. Ці трэба дэкларавать гэтыя грошы на мяжы?

— Яшчэ адной значнай перавагай пластыкавых картак з'яўляецца тое, што пры праходжанні мытнага кантролю іх не дэкларуюць, у адрозненне ад наяўных грошай.

— Аляксей, у што мне абыдзецца набыццё пластыкавай карткі і якія крокі трэба зрабіць, каб адкрыць карт-рахунак?

— Калі вы адкрываеце асабісты карт-рахунак (у доларах ЗША ці ў беларускіх рублях), то заплаціце толькі за так званы «пластык», картку, гэта ўсяго 7000 рублёў, ці 3 долары. Вы зможаце бясплатна здзяйсняць розныя плацяжы (за камунальныя паслугі, газ, электраэнергію, хатні і мабільны тэлефоны) праз банкаматы і інфакіёскі Сістэмы банкаўскага самаабслугоўвання — СБС, куды ўваходзіць ААТ «Беларускі Індустрыяльны Банк», а таксама ААТ «Белзнешэканамбанк», ААТ «Тэхнабанк», ААТ «Масква-Мінск», ААТ «Альфа-Банк», ААТ «Белсвісбанк», ЗАТ «РРБ-Банк».

Калі вы вырашылі набыць картку банка, вам неабходна прыйсці да нас з пашпартам і грашыма, запоўніць заяву і склясці дамову. Супрацоўнікі банка раскажуць пра правілы карыстання, адкажуць на ўсе пытанні.

— І вось я трымальнік карткі. Што неабходна зрабіць мне як трымальніку карткі перад паездкай за мяжу?

— Па-першае, праверыць працаздольнасць карткі ў банкамаце ці інфакіёску, па-другое, звярнуць увагу на ліміт расходавання грашовых сродкаў, па-трэцяе, пераканацца ў наяўнасці грашовых сродкаў на рахунку. І яшчэ адзін важны момант: у жыцці ўсякае здараецца, калі раптам у вас знікла картка (выкралі, згубілі), лепш загадзя набыць яшчэ адну. Гэта дазволіць заблакаваць картку, але пры гэтым захаваць доступ да свайго рахунку з дапамогай другой карткі. Па ўласным вопыце скажу, што ў адным месцы ніколі не варта трымаць абедзве карткі. Гэта засцеражэ вас ад розных непрыемнасцяў.

Алена АФАНАСЬЕВА.

САДРАМАНТАВАНЫЯ І... ПРОСТА ЗНОШАНЫЯ

Артэрыі эканомікі

Сёлета, 4 снежня, дзяржаўнай дарожнай службе на беларускіх землях спаўняецца 200 гадоў. Калі гаварыць увогуле, самым важным для службы застаецца развіццё тэхнічнага стану сеткі аўтамабільных дарог агульнага карыстання, стварэнне ўмоў для развіцця сацыяльнай галіны, інтэграцыя магістральных дарог у Еўрапейскую транспартную сістэму і адзіную сетку міжнародных аўтамагістраляў СНД.

Трансеўрапейскія калідоры

Беларускія рэспубліканскія аўтадарогі складаюць звыш 15 тысяч км, мясцовыя — звыш 70 тысяч. Пры гэтым больш за 70 працэнтаў пасажыраў і грузаў перавозяцца па рэспубліканскіх «артэрыях».

Тэрыторыю нашай краіны перасякаюць два трансеўрапейскія транспартныя калідоры, вызначаныя па міжнароднай класіфікацыі пад нумарамі II (Захад — Усход) і IX (Поўнач — Поўдзень). Аўтадарога М-1/Е 30 Брэст—Мінск—мяжа Расійкай Федэрацыі з'яўляецца ўчасткам трансеўрапейскага транспартнага калідора II Берлін—Варшава—Мінск—Масква—Ніжні Ноўгарад, які злучае Германію, Польшчу, Беларусь і Расію. Гэты транспартны калідор вызначаны Еўрапейскім Саюзам як найвышэйшы прыярытэт сярод трансеўрапейскіх транспартных калідораў у сувязі з важным значэннем гандлёвых патокаў, якія праходзяць па ім паміж Усходам і Захадам. Працягласць гэтага калідора па тэрыторыі Беларусі складае каля 610 км.

Аўтадарога М-8/Е-95 мяжа Расійскай Федэрацыі—Віцебск—Гомель—мяжа Украіны перасякае тэрыторыю рэспублікі з поўначы на поўдзень, мае працягласць 456 км і з'яўляецца ўчасткам трансеўрапейскага транспартнага калідора IX, які злучае Фінляндыю, Літву, Расію, Беларусь, Украіну, Малдову, Румынію, Балгарыю і Грэцыю. Адгалінаванне гэтага калідора ІХБ Гомель—Мінск—Вільнюс—Клайпеда—Калінінград на тэрыторыі Беларусі мае працягласць 468 км і забяспечвае выхад грузаўладальнікаў з абласцей Усходняй Украіны і Цэнтральнай Расіі да спецыялізаваных марскіх партоў Клайпеды, Вентспілса і Калінінграда.

Праграма «Дарогі Беларусі» на 2006—2015 гады

Транспартна-эксплуатацыйны стан аўтадарог агульнага карыстання не задавальняе ў дастатковай ступені патрэбы народнай гаспадаркі ў аўтаперавозках. Прычына — у недарамонце, абумоўленым, у сваю чаргу, дэфіцытам фінансавання галіны. Між тым, 70 працэнтаў дарог агульнага карыстання ўжо мае тэрмін службы звыш 40 гадоў. Не адпавядае сучасным патрабаванням і значная частка мастоў і пуцеправодаў.

Паступоваму вырашэнню праблем павінна спрыяць галіновая Праграма «Дарогі Беларусі», асноўнымі задачамі якой з'яўляюцца мадэрнізацыя дарог на ўсіх кірунках міжнародных транспартных калідораў, развіццё эксплуатацыйнага стану найважнейшых рэспубліканскіх дарог, рэканструкцыя па нарматывах I катэгорыі з пашырэннем праезнай часткі да 4 палос руху 314 км. Вызначаны і аб'ёмы работ па будаўніцтве абходаў гарадоў Баранавічы, Віцебск, Гродна, Слонім, Маладзечна і іншых. Да 2011 года запланавана будаўніцтва звыш 600 аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу.

За чатыры гады рэалізацыі Праграмы — з 2006-га па 2009-ы — бягучым рамонтам будзе адрамантавана 6,5 тысячы км рэспубліканскіх дарог і крыху больш за 9 тысяч мясцовых, капітальным — адпаведна 1,5 тысячы і звыш 700 км, пасля рэканструкцыі і будаўніцтва будзе ўведзена каля 250 км рэспубліканскіх і 310 км мясцовых аўтадарог.

На жаль, рэальнае фінансаванне не дазваляе выканаць поўны аб'ём мерапрыемстваў, прадугледжаных праграмай. Штогод фінансаванне забяспечваецца на 60-70 працэнтаў ад патрэбы.

Разглядаецца магчымасць прыцягнення замежных інвестыцый на рэканструкцыю рэспубліканскіх дарог. Перамовы па гэтым пытанні праводзіліся з прадстаўнікамі Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця, Сусветнага банка, японскага банка «Намура», расійскіх «Знешэканамбанка» і «Банка Масквы». На перамовах з прадстаўнікамі Сусветнага банка была выказана зацікаўленасць у рэалізацыі праекта рэканструкцыі дарогі М-5 на ўчастку Мінск—Бабруйск за кошт пазыкі банка ў памеры 150 млн долараў. Магчымасць рэалізацыі гэтага праекта прапрацоўваецца.

Вынікі года

Менавіта восенню здаецца асноўная колькасць дарожных аб'ектаў. Паводле слоў **дырэктара Дэпартамента «Белаўтадар» Анатоля ЛЫЦІНА,** сёлета плануецца выканаць бягучы рамонт 1169,7 км дарог і 1121,5 пагоннага метра мастоў, капітальны рамонт 50,6 км дарог і 298,9 пагоннага метра мастоў. Прадугледжана рэканструкцыя і будаўніцтва 70,2 км дарог і 776,1 пагоннага метра мастоў. Будуць уведзены ў эксплуатацыю ўчасткі дарог: Мінск—Віцебск, Мінск—Гомель, Мінск—Гродна, Мінск—Магілёў, Гомель—Кобрын, Віцебск—Лёзна, Кобрын—Макраны, Полацк—Глыбокае—Катлоўка і інш. Павінны быць уведзены ў эксплуатацыю масты праз Сож у Крычаве і Гомелі. На мясцовых дарогах у гэтым годзе прадугледжана выканаць бягучы рамонт 1413,2 км дарог і 600 пагонных метраў мастоў, капітальны рамонт 102,5 км дарог і 388,6 пагоннага метра мастоў, рэканструкцыю і будаўніцтва 40 км дарог і 186,8 пагоннага метра мастоў.

Новыя тэхналогіі

За апошнія гады Дэпартамент укараніў шэраг сучасных энерга- і рэсурсазберагальных тэхналогій. Напрыклад, тэхналогію халоднай рэгенерацыі асфальтабетоннага пакрыцця, якая дазваляе эканоміць энергію, каменны матэрыял і бітум. Распрацавана рэсурсазберагальная тэхналогія прыгатавання асфальтабетонных сумесяў з выкарыстаннем другасных прадуктаў. Тэхналогія ўладкавання канструктыўных слаёў дарожнага «адзення» з гравійна-эмульсійных сумесяў з паскораным тэрмінам фарміравання дазваляе знізіць агульны кошт работ на 20 працэнтаў. Гідраізаляцыйнае пакрыццё маставога палатна штучных збудаванняў забяспечвае высокую воданепранікальнасць і ўстойлівасць пакрыцця, дзякуючы чаму міжрамонтны тэрмін службы пакрыцця павялічваецца больш як у два разы. Істотна эканоміць матэрыяльныя і энергетычныя затраты прымяненне танкаслойных асфальтабетонных пакрыццяў «Тонфрыз-Слой». Тросавая агараджа — гэта эфектыўны інструмент павышэння бяспекі дарожнага руху і хуткі рамонт. Бітумна-палімерная стужка дазваляе зняць абмежаванне па даўжыні паласы ўкладкі асфальтабетону, павялічыць вытворчасць асфальтаўкладачнага комплексу на 10-20 працэнтаў, значна палепшыць паказчык роўнасці пакрыцця, папярэдзіць утварэнне трэшчын.

Прымяняюцца і іншыя сучасныя тэхналогіі і матэрыялы. Іх апрабацыя рэалізуецца ў межах ведамаснай праграмы праектавання і будаўніцтва эксперыментальных аб'ектаў. Сёлета ў праграму ўключана 10 мерапрыемстваў па прымяненні новых тэхналогій і матэрыялаў, эфектыўнасць якіх заключаецца ў павелічэнні тэрміну службы маставых і дарожных канструкцый, у зніжэнні матэрыяльных і энергазатрат на іх уладкаванне, у павышэнні якасных характарыстык маставых і дарожных канструкцый, у паляпшэнні экалагічнай сітуацыі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

СА СВЯТАМ, КАРДЫНАЛЕ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На той момант Казіміру Свёнтэку было 77 гадоў, але ён актыўна ўзяўся за справу — наведвае парафіі, стварае касцёльныя структуры, абараняе вернікаў, выступае на канферэнцыях. Спаўна зазначыўшы пераслед веры, ксёндз Казімір дачакаўся аднаўлення веры ў Беларусі.

У 1994 годзе Папа Ян Павел II надаў Свёнтэку сан кардынала — найвышэйшы ў Царкве. Казімір Свёнтэк стаў першым у Беларусі кардыналам пасля 1798 года!

Тры гады таму Папа Бенедыкт XVI прыняў прашэнне пра вызваленне Свёнтэка ад пастырскага кіравання Мінска-Магілёўскай архіепархіяй — усё-такі на той час Кардыналу было ўжо 92 гады. Сёння Казімір Свёнтэк працягвае пастырскую дзейнасць у Пінску, з'яўляецца Апостальскім Адміністратарам Пінскай епархіі.

Павіншаваць з днём нараджэння Кардынала Казіміра Свёнтэка мы папрасілі ягонага наступніка, шаноўнага Арцыбіскупа Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага Тадэвуша Кандрусевіча.

— Найстарэйшы іерарх каталіцкага касцёла Беларусі Кардынал Казімір Свёнтэк адзначае ў гэтыя дні сваё 95-годдзе. Гэта чалавек, які прайшоў агонь, ваду і медныя трубы, як гаворыцца. Напэўна, у гісторыі гэтага чалавека сабраная гісторыя многіх-многіх людзей. Але ён заўсёды захоўваў веру, вернасць свайму святарскаму пакліканню. Быў прызначаны біскупам, арцыбіскупам, потым кардыналам. Быў першым Мінска-Магілёўскім Мітрапалітам пасля аднаўлення структураў каталіцкага касцёла ў Беларусі. Ад усяго сэрца хацеў бы павіншаваць Яго Эмінэнцыю! Пажадаць яму добрага духоўнага і фізічнага здароўя. Пажадаць яму, каб і далей заўсёды ён жыў той надзеяй, якой кіраваўся ў сваім жыцці. Бо сапраўды шмат разоў ён жыў надзеяй і супраць надзеі, як гаворыць Святое Пісанне. Хацеў бы пажадаць, каб многа-многа гадоў Кардынал заўсёды заставаўся маладым душой. І той гумар, які заўсёды адзначаў Кардынала, ён захаваў і надалей. І каб далей служыў Касцёлу, служыў людзям — як і цяпер, нібыта малады духам святар. Каталіцкі Касцёл у Беларусі моліцца за яго. І асабліва я жадаю яму далейшых поспехаў. Каб далей мог несці тую місію, якая божы провід прызначана гэтаму іерарху. І як мы гаворым на лацінскай мове, Ad multos annos — гэта значыць «многія гады».

— Ойча Мітрапаліце, які галоўны ўнёсак Кардынала Свёнтэка як галавы каталіцкага касцёла Беларусі?

— На ягоную долю прыйшоўся цяжкі час — трэба было адраджаць касцёл. Была вернутая катэдра — сімвал, галоўная святыня Каталіцкага Касцёла ў Беларусі. Ён гэта здолеў. Таксама трэба было думаць аб падрыхтоўцы новых святароў — ён заснаваў семінарыю ў Пінску. Заснаваў выдавецтва «Про-Хрысто» ў Мінску, клапоцячыся, каб як мага больш літаратуры рэлігійнай выдавалася ў нас. Таксама распачаў вельмі вялікую працу па перакладзе і падрыхтоўцы літургічнай літаратуры. Пры ім быў выдадзены Імшал на беларускай мове. Кардынал вельмі добра прадстаўляў Беларусь за мяжой. Неаднойчы мне з ім давялося бываць на розных канферэнцыях, спатканнях з Папам, на злётах біскупаў. Кардынал Свёнтэк — гэта сімвал. І яго вельмі-вельмі ўсе шануюць за тое, што ён захаваў вернасць свайму пакліканню, вернасць касцёлу ў цяжкія часы. Кардынал і цяпер актыўна ўдзельнічае ў жыцці касцёла, часта прыязджае ў Мінск, колькі тыдняў таму быў на асвячэнні касцёла ў Віцебску.

Дарэчы, учора, 20 кастрычніка, у мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча таксама было свята — ён адзначаў 20-годдзе біскупскага пасвячэння. Біскупскую сакру, якую ён прыняў 20 кастрычніка 1989 года ў базіліцы Святога Пятра ў Рыме, удзяліў Папа Ян Павел II. Нашыя віншаванні!

А сёння «Звязда» шчыра віншуе Кардынала Казіміра Свёнтэка з 95-годдзем. Зычым ніколі не ведаць стомы, заўжды мець бадзёры дух і светлую свядомасць і далей вучыць маладых сваім прыкладам. Са святам, Кардынале!

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.

Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» смуткуе з нагоды смерці свайго былога супрацоўніка, міжнароднага аглядальніка газеты «Беларуская ніва» Ігара ДЫЛЕЎСКАГА і выказвае яго родным і блізкім шчырыя спачуванні.

Абзац

◢ **Упраўленне прафілактыкі УУС Гомельскага аблвыканкама накіравала ў раённыя выканаўчыя камітэты хадайніцтва з прапановай забяспечыць мабільнымі тэлефонамі адзінокіх пажылых грамадзян, якія пражываюць у глыбінцы. Па сведчанні міліцыянераў, у малых вёсках, аддаленых ад цэнтральных сядзібаў гаспадарак і населеных у асноўным старымі, многія не маюць доступу да стацыянарнай тэлефоннай сувязі. Часам яны пазбаўленыя магчымасці аператыўна паведаміць пра выпадкі крадзяжоў, махлярства або іншыя надзвычайныя здарэнні. Акрамя просьбаў аб забеспячэнні старых людзей мабільнікамі, упраўленне прафілактыкі адрасавала раённым службам сацыяльнай абароны просьбу навучыць пажылых карыстацца апаратамі сотавай сувязі.**

Поўны абзац

◢ На ўсходзе Швейцарыі паліцыя затрымала вадзіцеля-італьянца, які за 11 хвілін умудрыўся 15 разоў парушыць правілы дарожнага руху. Паліцэйскія, што сядзелі ў прыпаркаваным аўто, звярнулі ўвагу на аўтамабіль, які пранёсся з хуткасцю 160 км/гадз. Пры гэтым не захоўвалася дыстанцыя паміж гэтым аўто і іншымі ўдзельнікамі руху. Калі вартавыя парадку паспрабавалі спыніць парушальніка, той не адрэагаваў ні на патрабаванні, прамоўленыя ў гукаўзмацняльнік, ні на светлавыя сігналы паліцэйскага аўтамабіля. 47-гадовы італьянец перасоўваўся на сваёй машыне з хуткасцю, якая ўдвая перавышала дазволеную. У рэшце рэшт яго затрымалі, адабралі вадзіцельскае пасведчанне і аддправілі на медыцынскае даследаванне наяўнасці ў крыві алкаголю ці наркотыкаў.

◢ **Дэпутаты Чарнігаўскага гарадскога Савета вырашылі зарабіць на мэблю для мясцовага Палаца культуры ўласнымі спевамі. Рэпертуар канцэрта захоўваецца ў сакрэце. Білетаў на сябе дэпутаты мяркуюць прадаць на 400 грыўняў. На ўсю суму будуць закупленыя крэслы для залы, палова з якіх цяпер паламаныя. Прэм'ера адбудзецца праз два тыдні.**

◢ П'яўка, у страўніку якой захаваўся ўзор ДНК зламысніка, дапамагла аўстралійскай паліцыі праз восем гадоў выкрыць рабаўніка. Па звестках следства, 54-гадовы Пітэр Кэнан у верасні 2001 года разам з саўдзельнікам уварваўся ў хату пажылой жанчыны і выкраў у яе 550 долараў. Злодзея па гарачых слядах знайсці не атрымалася, аднак крыміналісты знайшлі на месцы злачынства садовую п'яўку і зрабілі аналіз выяўленай унутры яе крыві, узор якой быў занесены ў базу звестак пра асобаў, якія здзейснілі правапарушэнні. Так здарылася, што ў канцы 2008 года Кэнан быў абвінавачаны ў злачынстве, звязаным з наркотыкамі. Узяты ў яго аналіз ДНК супаў з узорам, які быў атрыманы восем гадоў таму ў п'яўкі. Напярэдадні Пітэр Кэнан прызнаўся ў здзяйсненні рабавання. А ў канцы мінулага года фінская паліцыя адшукала падазронага ў крадзяжы аўтамабіля дзякуючы аналізу ДНК камара, які знаходзіўся ва ўкрадзенай машыне.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Эльжбеце Радзівіл — 92!

Дачка апошняга ўладара Нясвіжскага замка распавяла карэспандэнту «Звязды» сакрэт свайго нараджэння.

Калі бачыш пані Эльжбету Радзівіл — здаецца, ажывае ўся 600-гадовая гісторыя гэтага магутнага роду. Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка, Барбара Радзівіл, Рыбанька, Францішка Уршуля, Пане Каханку — для нас гэта гістарычныя персанажы. Такія далёкія і магутныя, што падаюцца нават міфам. Для пані Эльжбеты гэта — сваякі, прабабкі і прадзеды. Гэтым летам князёўна Эльжбета Радзівіл упершыню за апошнія 16 гадоў прыехала ў Нясвіж. Папярэдні візіт адбыўся ў 1993 годзе намаганнямі прафесара Адама Мальдзіса. Сёлетні прыезд Радзівілаў стаў знакавым — упершыню пасля 1939 года на нашай зямлі знаходзіліся адначасова 10 прадстаўнікоў сям'і. Хоць галавой сям'і заўжды выбіраецца мужчына, сёння менавіта гэтая 92-гадовая князёўна яднае Радзівілаў усяго свету, з'яўляецца сімвалам. Іншыя Радзівілы выраслі ўжо ў гарадскіх кватэрах, а пані Эльжбета жыла ў Нясвіжскім замку. Бэтка памятае прыёмы, на якіх бывалі прэзідэнты, князі, нават прынц Манака...

Днямі пані Эльжбета тэлефанавала — і я вырашыў удакладніць дату яе народзінаў, бо ў розных крыніцах сустракаюцца розныя звесткі.

— Я нарадзілася 21 кастрычніка 1917 года ў Лондане, — распавяла князёўна. — Аднак бацька, калі запісваў мяне, памыліўся — і замест X месяца напісаў XI. Так я ўсё жыццё і маю афіцыйны дзень народзінаў 21 лістапада!

У свае 92 гады пані Эльжбета захоўвае надзвычайную актыўнасць і аптымізм. Падчас летняга візіту ўсе перажывалі, як яна вытрымае такую змястоўную праграму — паездкі, наведванне музеяў, сустрэчы. Аднак ледзьве вытрымалі ўсе астатнія, маладзейшыя, а князёўна толькі падбадзёрвала іншых. Калі я гляджу ў яе вочы, на яе постаць — я адчуваю неверагоднае шчасце ад таго, што наша краіна мае Радзівілаў. Што для Радзівілаў Нясвіж — родны дом. З Днём нараджэнаў, пані Эльжбета!.. Я памятаю Вашае абяцанне — адзначыць стогадовы юбілей у Замку!

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.

02 НОЯБРЯ 2009 г. В 12.30 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ
собрание акционеров ОАО «Сантехэлектромонтаж»
Повестка дня:
1. О совершении сделок Общества.
Собрание будет проходить по адресу:
г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8-А.
Начало регистрации участников собрания: 12.00.
УНП 400052115

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении аукциона по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договоров аренды земельных участков для обслуживания продаваемого недвижимого имущества

Лот № 1 Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Капитальные строения: **инв. №№ 420/С-30936, 420/С-30937, 420/С-30938, 420/С-30939, 420/С-30337, 420/С-30338, 420/С-30340,** расположенные по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский сельсовет, 51, здание хранилища техники южнее г. Лиды, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 423684000013000023 площадью 1,4618 га сроком на 50 лет
Начальная цена предмета аукциона – 332 392 354 руб., сумма задатка – 33 239 000 руб.	
Продавец недвижимого имущества по лотам №№ 1, 2: ГУ «Барановичское эксплуатационное управление Вооруженных Сил», контактные телефоны (8 0163) 41 25 92, 41 26 78	
Сведения об объектах недвижимости: капитальные строения: инв. № 420/С-30936: хранилище техники – 1976 г., кирпичное, общая площадь – 1593,5 м²; две кабельные линии электропередачи – 1976 г., 52,8 м.п. и 102,5 м.п.; **№ 420/С-30937:** здание КТП с двумя холодными пристройками и террасой – 1970 г., кирпичное, общая площадь 162,3 м²; кабельная линия электропередачи – 1976 г., 62,3 м.п.; **№ 420/С-30938**: хранилище техники – 1975 г., кирпичное, общая площадь – 1596,2 м²; кабельная линия электропередачи –1975 г., 27,6 м.п.; **№ 420/С-30939:** склад – 1985 г., кирпичный, общая площадь 23,4 м²; **№ 420/С-30337:** автозаправочная под склад ГСМ –1974 г., кирпичная, общая площадь 23,1 м²; кабельная линия электропередачи – 1976 г., 10,7 м.п.; асфальтобетонное покрытие – 1975 г. , 2478,9 м² с бордюром дорожным 64,1 м.п.; **№ 420/С-30338**: автозаправочная под кладовую – 1974 г., кирпичная, общая площадь 18,7 м², кабельная линия электропередачи 1976 г., 26,9 м.п.; **№ 420/С-30340:** склад – 1958 г., кирпичный, общая площадь – 124,5 м²; кабельная линия электропередачи – 1975 г., 32,6 м.п.	
Лот № 2 Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	**Капитальные строения: инв. № № 420/С-31498, 420/С-31496, 420/С-31497,420/С-32179,** зеленые насаждения – 57 единиц, расположенные по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский сельсовет, южнее г. Лиды, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 423684000013000006 площадью 2,5797 га, сроком на 50 лет.
Начальная цена предмета аукциона – 1 408 389 035 руб., сумма задатка – 140 838 000 руб.	
Сведения об объектах недвижимости: капитальные строения: инв. № 420/С-31498, здание общежития (казарма) – 1988 г., двухэтажное, из ж/б панелей, с пристройкой, двумя террасами, дымовой трубой, общая площадь – 2 234,9 м²; площадка – 1983 г., 4991 м², асфальтовая; пешеходные дорожки с дорожным бортом – 1983 г., 49 м², асфальт, борт бетонный – 906 м.п.; забор-сетка – 1983 г., металлический, 1090 м².; ворота – 1983 г., металлические, 12 м²; водопровод стальной 1988 г., 86,4 м.п.; канализация керамическая – 1988 г., 241,2 м.п.; три кабельные линии электропередачи – 1988 г. – общей протяженностью 905,1 м.п.; тепловая сеть – 1988 г., 24,88 м.п., стальная двухтрубная; дымовая труба – 1988 г., металлическая, диаметр 500 мм; **№ 420/С-31496:** склад – 1988 г., одноэтажный, кирпичный, общая площадь – 551,5 м²; канализация керамическая – 1988 г., 43,7 м.п.; две кабельные линии электропередачи – 1988 г., общей протяженностью 485,4 м.п.; эстакада – 1988 г. – заглубленная, из монолитного бетона; тепловая сеть -1988 г.-91,08 м.п., стальная, двухтрубная.; **№ 420/С-31497:** контрольно-пропускной пункт-1988 г. одноэтажное, кирпичное, с террасой, общая площадь – 64,5 м².; водопровод стальной – 1988 г., 5,4 м.п.; канализация керамическая – 1988 г., 51,37 м.п.; кабельная линия электропередачи – 1988 г., 63,4 м.п.; **№ 420/С-32179: склад** – 1989 г., блочный, общая площадь – 17,5 м². Многолетние зеленые насаждения – 57 единиц.	
Условия использования недвижимого имущества по лотам №№ 1,2: вовлечение в хозяйственный оборот в течение 2-х лет с момента заключения договора купли-продажи.	
Условия использования земельного участка, ограничения по использованию по лотам 1,2: заключение победителем аукциона с Лидским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ в случае изменения функционального назначения объекта, осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	
Лот № 3 Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Капитальное строение: **инв. № 400/С-52359**, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Скидельское шоссе, 18 и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 440100000002005815, площадью 0,0940 га, сроком на 50 лет.
Начальная цена предмета аукциона – 74 815 153 руб., сумма задатка – 7 481 000 руб.	
Продавец недвижимого имущества: РУП «Гродноэнерго», контактные телефоны: (80152) 75 53 00; 75 54 41.	
Сведения об объектах недвижимости: капитальное строение инв. № 400/С-52359: здание мастерской – 1980 г., одноэтажное, кирпичное, общая площадь 265,0м², асфальтобетонное покрытие – 1989 г., 615,0 м² с бетонным бордюром 49 м.п.	
Условия использования недвижимого имущества: вовлечение объекта в хозяйственный оборот, проведение благоустройства прилегающей территории в течение 2-х лет с момента заключения договора купли-продажи.	
Условия использования земельного участка, ограничения по использованию: заключение победителем аукциона с Гродненским горисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок.	
Лот № 4 Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Капитальное строение **инв. № 410/С-15917**, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. З. Космодемьянской, 34 и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 420850100001006579, площадью 0,2205 га, сроком на 50 лет.
Начальная цена предмета аукциона – 66 399 777 руб., сумма задатка – 6 639 000 руб.	
Продавец недвижимого имущества: Отдел внутренних дел Волковысского райисполкома, контактные телефоны: (801512) 72 1 01; 75 1 37.	
Сведения об объекте недвижимости: капитальное строение: инв. № 410/С-15917: хранилище техники -1984 г., бетонно-блочное, обваловано землей, общая площадь 381,5м².	
Условия использования недвижимого имущества: вовлечение в хозяйственную деятельность в течение 1 года с момента заключения договора купли-продажи.	
Условия использования земельного участка, ограничения по использованию заключение победителем аукциона с Волковысским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок.	
Лот № 5 Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Капитальные строения **инв. № № 410/С-20696, 410/С-20689, 410/С-20690, 410/С-21446, 410/С-21447**, объекты озеленения, оборудование, отдельные предметы в составе оборотных средств, расположенные по адресу: Гродненская обл., г. Волковыск, ул. Брестская, 59 и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 420850100001007117 площадью 0,0834 га, сроком на 50 лет.
Начальная цена предмета аукциона – 86 218 962 руб., сумма задатка – 8 621 000 руб.	
Продавец недвижимого имущества: РУП «Гродненский центр стандартизации, метрологии и сертификации», контактные телефоны: (8 0152) 77 01 00, 79 45 58.	
Сведения об объектах недвижимости: инв. № 410/С-20696: лабораторно-производственный корпус с пристройкой и холодной пристройкой, общей площадью 154,6 кв. м, с забором металлическим и воротами металлическими площадью 181 кв. м, уборной дощатой; **инв. № 410/С-20689:** внутридворовая водопроводная сеть – 1985 г., протяженностью 22,58 п. м; инв. **№ 410/С-20690:** кабельная линия электропередач 0,4кВ – 2004 г., протяженностью 5 п.м; **инв. № 410/С-21446:** асфальтовое покрытие – 1982 г. площадью 243,8 кв.м; **инв. № 410/С-21447:** канализационная сеть с ж/б отстойником – 1985 г. протяженностью 4,0 п. м; объекты озеленения – ель, акация, ольха – 2 ед.; оборудование: три гаража цельнометаллических передвижных, котел отопительный водогрейный КС-ТГ-20, охранно-пожарная сигнализация «Аларм»; отдельные предметы в составе оборотных средств: счетчик учета расхода воды, счетчик учета газа, щит пожарный, электрический счетчик однофазный СО-И 446М, электрический счетчик трехфазный САЧУ-И 672М, электрический автомат отключения А-31 ЧА, трансформатор тока ТК-20, трансформатор тока ТК-20, трансформатор тока ТК-20, шкаф учета ЯУЭ.	
Условия использования недвижимого имущества: строительство нового здания на месте снесенного с соблюдением норм и требований проектирования, либо капитальный ремонт существующего здания; вовлечение в хозяйственный оборот в течение 1 года с момента заключения договора купли-продажи.	
Условия использования земельного участка, ограничения по использованию: получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка государственной регистрации права на земельный участок.	
Организатор аукциона: Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул.17 Сентября, 39, тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней).	

1. Аукцион состоится **23 ноября 2009 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона **по 17 ноября 2009 года до 16.00**, по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, **кабинет 6**.

К заявлению прилагаются следующие документы:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

21 кастрычніка 2009 г. № 33 (185)

СВОЙ ПОГЛЯД

КРЫЗІС ПРОЙДЗЕ, А ДРЭННАЕ РАШЭННЕ ЗАСТАНЕЦЦА

Неадназначна паставілася вёска да артыкула «Вакол аднаго аб'яднання...» («МС» за 7 кастрычніка г.г.). Многае ў ім чыноўнікі патлумачылі — нават навуковую базу падвялі, многае абгрунтавалі, нават паскардзіліся, што «мы, маўляў, гаворым, але нас не чуюць»...

І ў чытачоў магло скласціся ўражанне, што жыхары вёскі Лучын — проста «ўпёртыя» людзі, не хочуць зразумець не толькі дзяржаўнай патрэбы, але і сваёй жа выгады, што ім — абы паскардзіцца ды шуму нарабіць, абы панастойваць.

Але ці так гэта?

...Вестка пра тое, што чакаецца аб'яднанне сельсаветаў і наш цэнтр тады будзе не ў Лучыне, а ў Забалоцці, прагучала, як гром сярод яснага неба. Ну па-першае, Лучын — паселішча вельмі адметнае. Найперш тым, што ўзгадваецца ў пісьмовых крыніцах з 1126 года, гэта значыць, што вёсцы ні многа ні мала 873 гады. Па ўзросце яна старэйшая за Рагачоў і таксама была горадам.

Па-другое, трэба аддаць належнае нашым продкам. Яны ведалі, дзе трэба сяліцца, каб добра жыць. Таму ў Лучына пад бокам, як кажуць, і высокі бераг Дняпра, і бойкая дарога Рагачоў — Жлобін. Па-трэцяе, у вёсцы і цяпер жыве без малога 900 чалавек. Прычым далёка не зломкаў, бо яшчэ зусім нядаўна тут была адна з наймацнейшых гаспадарак раёна. Не слабейшая яна і цяпер. У вёсцы ёсць і новая школа, і Дом культуры, і дзіцячы садок, і бібліятэка, і ФАП, і кавярня. Чатыры крамы ў нас, лазня, пошта, 10 кіламетраў водаправоду, асфальт на вуліцах, за ваколіцай — ферма... Карацей, у Лучыне даўно раскуплены ўсе старыя пустыя дамы і лёгка засяляюцца новыя, бо жыць тут (апроч іншага — за 6 кіламетраў ад райцэнтра) зручна і выгадна.

Нам прыводзяць важкі аргумент: Забалоцце, маўляў, гэта аграгарадок, а ваш Лучын — не.

Крыць тут, як быццам, няма чым, што праўда, то праўда. Але ж гэты рух не завершаны: нам абяцалі (і людзі чакалі, не абураліся), што аграгарадком вёска стане ў 2008 годзе, потым — што ў 2009-м, цяпер кажуць, што ўжо ў наступным — рукою падаць. Значыць, заўтра гэта аргументам ужо не будзе. Лучын ажыве яшчэ больш! Дык чаму тады ў ім не павінна быць сельсавета? Чаму людзям адтуль, дзе віруе жыццё, па нейкую даведку трэба будзе ехаць за 15 вёрстаў (6 — гэта па полі)?

Не так часта мы ў гэтым маем патрэбу, сцвярджае старшыня нашага сельскага Савета? І нават, як я зразумела, не вельмі задаволены тым, што кожны чалавек можа зайсці да яго не толькі ў прыёмныя дні, але і тады, калі каму спатрэбіцца.

Не ведаю, што ў гэтым дрэннага? Як па мне, дык мясцовая ўлада таму і называецца мясцовай, што ўсе пытанні вырашае менавіта на месцы. А калі можна, яшчэ і не чакаючы «прыёмных дзён», не марнуючы час у прыёмных, а «зараз жа», ды «па ходзе» — дык гэта і наогул тое, што доктар прапісаў! А старшыня лічыць, што гэта не зусім правільна і цывілізавана.

Любяць нашы чыноўнікі ўсё «аарганізаваць» — вось каб людзі запісваліся на прыёмы, сядзелі ў калідорах, чакалі, калі паклічуць зайсці, калі нешта зробяць, тады, атрымліваецца, гэта цывілізавана было б і правільна? Але ж адна справа пасядзець і пачакаць у сваёй вёсцы. І зусім іншая — хоць нам, хоць жыхарам Забалоцця і ваколіц — ехаць за 15 вёрст. Потым жа, яшчэ дабрацца неяк трэба.

А таму для людзей найлепей было б, найвыгадней, каб усё засталося, як ёсць.

Нам кажуць пра крызіс, пра грошы, пра тое, што іх — кожную капейку — трэба лічыць. Згодна. Але, на мой погляд, мы апошнім часам так зацыкліліся над пытаннем, як зэканоміць, што зусім перасталі думаць, па-першае, над тым, а ці нельга на нечым зарабіць, а па-другое, што страцім у выніку эканоміі, а што набудзем?

У нашым выпадку вёска з 870-гадовай гісторыяй страціць істотную частку сваёй адметнасці, свайго аўтарытэту, страціць мясцовы (і не местачковы!) суверэнітэт. Прычым страціць, як гэта ні крыўдна, цяпер на пад'ёме... Жыхары яе, што відавочна, нажывуць лішні галаўны боль. Не абыдзецца і без валакіты, без нязручнасцяў, без выдаткаў, бо многія маёмасныя дакументы, у якіх было пазначана «Лучынскі сельскі Савет», акажуцца несапраўднымі.

Таму праблему трэба разглядаць усебакова і вырашаць на карысць людзей, а не нейкага там крызісу. Ён да нас прыйшоў і пойдзе, а дрэннае рашэнне застанецца. Успомніце, колькі іх (і, здавалася ж, правільных?) давялося потым адмяняць.

Вось і ідэя з аб'яднаннем маім аднавяскоўцам падаецца шкоднай.

Не думаем, аднак, што гэта нейкія падкопы з боку мясцовых чыноўнікаў: не ўсё і сапраўды залежыць ад іх. І потым нам жа іх выбіраць...

Дык можа варта пашукаць іншыя шляхі для эканоміі сродкаў?

...З гісторыі вёскі мне вельмі падабаецца адзін факт: у XVI стагоддзі лучынцы пехатой, праз балоты зайшлі ў Петрыкаў — на прыём да самой каралевы Боны Сфорцы са скаргай на Магілёўскага эканома. І Бона адмяніла яго няправільныя рашэнні!

Няўжо і цяпер для таго, каб пастаяць за свае інтарэсы, нам трэба будзе збірацца ў паход?

Соф'я КУСЯНКОВА,
в. Лучын, Рагачоўскі раён.

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

РАМОНТ ПА ПРАВІЛАХ І БЕЗ

Пра «злашчасны» дом № 11 па вуліцы Парніковай, што ў Мінску, «МС» пісала роўна год таму. Яшчэ ў канцы 90-х дом быў здадзены ў эксплуатацыю з парушэннямі і дэфектамі, якія пачалі выяўляцца пасля засялення жыльцоў. Асабліва «пашанцавала» жыхарам першага паверха, дзе ў выніку пастаянных прарываў каналізацыі, затаплення нечыстотамі і адсутнасці вентыляцыі стварыліся нясцерпныя ўмовы для пражывання...

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

А шпалеры зноў адстаюць...

Перапіска жыльцоў з чыноўнікамі і адказнымі асобамі (якая цягнулася 9 гадоў) не прынесла якіх-небудзь відавочных вынікаў і кардынальных зменаў у лепшы бок. І тады ў нашу рэдакцыю звярнулася Людміла Бачкарова, жыхарка кватэры № 68 згаданага дома. Мала таго, што кватэра Людмілы, дзе яна жыла з дзвюма дочкамі, рэгулярна затаплялася «знізу». Ад пастаяннай павышанай вільготнасці і нізкай тэмпературы (дом быў дрэнна ўцеплены) у кватэры пачалі адставаць ад сцен і адвальвацца шпалеры і плітка, а самі сцены пакрыліся налётам плесні. Спецыялісты з Інстытута мікрабіялогіі, абследаваўшы кватэру Бачкаровай, вынеслі вердыкт: у наяўнасці — крытычна высокі ўзровень пашкоджання спорамі плесневых грыбоў, небяспечных для здароўя людзей.

Магчыма, Людміла Мікалаеўна знайшла б у сабе сілы «яшчэ крыху пацярпець», калі б стан здароўя яе дачкі Лены не стаў пагаршацца. Дваццаць гадоў таму, праз некалькі месяцаў пасля нараджэння, Лене паставілі несуцяшальны дыягназ. Анкалагічнае захворванне амаль не пакідала шанцаў на выжыванне — але насуперак усім прагнозам і дзякуючы намаганням урачоў Беларусі, Расіі і Германіі дзяўчынка выкараскалася. Хваробу ўдалося часова ўтаймаваць. Аднак Людмілу Мікалаеўну папярэдзілі, што «выбух» можа адбыцца ў любы момант.

Калі Бачкарова даведалася пра наяўнасць у кватэры плесневых грыбоў (у тым ліку і аспергілаў, вельмі небяспечных для анкахворых), то забіла ва ўсе званы. На працягу некалькіх гадоў у доме № 11 пабывалі дзясяткі камісій. Усе яны прызнавалі, што і сам будынак, і кватэра Бачкаровых, і іншыя кватэры на першым паверсе маюць патрэбу ў тэрміновым выпраўленні будаўнічых дэфектаў і рамонце з абавязковай апрацоўкай супрацьгрыбковымі сродкамі.

Камісіі змянялі адна адну, але ЖЭС-86 Першамайскага раёна сталіцы, у чыім падпарадкаванні знаходзіўся ўзгаданы дом, не спяшаўся выконваць усе іх рэкамендацыі. Рамонт у кватэрах жыльцоў, натуральна, рабіўся, і неаднаразова, але... шпалеры раз за разам клалі на вільготныя сцены, паедзеныя плесняй. У выніку чаго тыя адвальваліся зноў...

Пра ўсё гэта я напісала год таму. Тады ж дамовілася з Людмілай Бачкаровай праз пэўны час сустрэцца зноў.

Памятаючы пра нашу дамоўленасць, днямі патурбавала Людмілу Мікалаеўну. Яна шчыра здзівілася:

— Ад нашых праблем у асноўным адмахваюцца, а вы патэлефанавалі самі. Прыязджайце — усё пабачыце.

І вось я на Парніковай, у доме № 11. Па маёй просьбе Людміла Мікалаеўна наладжвае невялікую «экскурсію» па кватэры. Змены тут адбыліся відавочныя, і ў лепшы бок. Сёння кватэра № 68 ужо не нагадвае часовае прыстанішча без дзвярэй, падлогі і шпалераў, няўтульнае і не вельмі прывабнае для вока. Падлога (хоць і не драўляная, як рэкамендавалі санслужбы, а з лінолеуму) пакладзеная, столь пабеленая, санвузел адрамантаваны, а новенькая плітка на сценах проста радуе вока... Што засмучае гаспадыню — у прыхожай зноў адсталі ад сцяны шпалеры, якія ЖЭС-86 паклеіў усяго месяц таму.

— Гэта была ўжо трэцяя паклейка за апошні час. Першыя два разы шпалеры паклеілі з парушэннем тэхнічных патрабаванняў, без шпакляванння сцен, — тлумачыць Людміла. — Калі рамонт робіцца па правілах — не толькі «еўра», але і самы звычайны — неабходна шпакляваць і грунтаваць сцены, бо гэта тэхнічная норма. Калі ж праігнараваць яе, шпалеры рана ці позна адваляцца... Напэўна, наш ЖЭС вырашыў: калі Бачкарова не аплачвае рамонт, значыць, на ёй можна зэканоміць — зэканоміць на клеі, на шпаклёўцы, на метражы шпалераў. Праўда, пасля таго, як нядаўна тут пабываў прадстаўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, сцены пашпаклявалі. Але шпалеры ўсё адно адсталі.

— Вы самі звярталіся ў Адміністрацыю Прэзідэнта?

— Не я — людзі звярталіся, сусядзі... Яшчэ летам напісалі ліст — пасля таго, як ЖЭС пачаў рамантаваць у маёй кватэры прыбіральню і ванны пакой. Спачатку знялі ўнітаз, ванну і ўмывальнік. Потым збілі плітку са сценак. Потым два тыдні шукалі майстра, каб пакласці новую плітку. З'явіўся майстар — зноў узнікла праблема: няма саставу, каб гэту плітку прымацаваць. Паявіўся састаў — не маглі знайсці машыну, каб яго прывезці... Потым высветлілася, што саставу не хапае — яшчэ тыдзень яго дазвалілі... Гэта доўжылася амаль два месяцы, на працягу якіх мы ўтраіх — я і дочкі — жылі без прыбіральні і ванны.

Па выніках абследавання кватэр дома на Парніковай было складзена больш за 130 актаў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

АДКРЫТЫ ФОРУМ

Распісана да капеечкі

Рэальных крыніц выхаду на самафінансаванне ў сельвыканкама няма?

Ва ўмовах сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу на першы план выходзіць уменне эканоміць і самастойна зарабляць, нягледзячы на ўсе цяжкасці. Указам № 21 ад 12 студзеня 2007 года прадугледжаны 16 крыніц папаўнення бюджэтаў сельскіх і пасялковых выканкамаў. Што з прапанаванага згаданым дакументам мясцовыя Саветы ўжо ўзялі на рэалізацыю і ці атрымалася ў іх знізіць сваю датацыйнасць?

Мікалай ГАЙДУКЕВІЧ, старшыня Жодзішкаўскага сельскага Савета дэпутатаў Смаргонскага раёна:

— Бюджэт наш і так датацыйны, а цяпер яго яшчэ і «ўрэзалі». На пачатак года бюджэт быў запланаваны ў памеры 150 млн, але пасля яго ўдакладнення, якое адбылося летам, 25 працэнтаў з нас «знялі». Нашы даходныя крыніцы: падатак з продажу, падатак на нерухомасць, на зямлю, дзяржпошліна, арэндная плата за карыстанне ўчасткамі, даходы ад продажу зямлі ў прыватную маёмасць. Самай «важкай» крыніцай папаўнення бюджэту па-ранейшаму застаецца датацыя — 79,2 млн на гэты год.

Пасля ўдакладнення бюджэт на 2009 год склаў 125,4 млн рублёў. Для кагосьці гэтая лічба можа падацца нармальнай, але наш сельсавет — гэта 20 тыс. квадратных км, 53 населеныя пункты і 2,9 тыс. насельніцтва. З улікам гэтага наш бюджэт вельмі невялікі (ёсць і меншыя сельсаветы з бюджэтам, большым за наш). Улічыце яшчэ, што ў гэты бюджэт закладзена аплата вулічнага асвятлення. На добраўпарадкаванне першапачаткова нам было закладзена 36 млн, пасля ўдакладнення засталося 28 млн, з якіх 20 млн ідзе на вулічнае асвятленне. І толькі 8 млн застаецца непасрэдна на само добраўпарадкаванне (спілоўванне дрэваў, упарадкаванне звалак і г.д.). Мы паставілі рэле часу і цяпер расходуем электрычнасць больш эканомна, таму і «ўкладваемся» ў акрэсленыя нам сумы. За перыяд ліпень-жнівень за вулічнае асвятленне мы заплацілі ўсяго 6,6 млн рублёў. Выратавала і тое, што на лета мы вулічнае асвятленне ўвогуле адключалі.

Наш леташні бюджэт (2008 года) раўняўся 114 млн рублёў. Раней у нас быў падаходны падатак, цяпер замест яго з'явіўся падатак з продажу. Гэта своеасаблівая замена, бо ў грашовым вымярэнні яны прыкладна аднолькавыя.

У сувязі з крызісам асабліва расходаў у нас не прадугледжана. Толькі заробак работнікам, бензін і камунальныя. Мы хацелі ў пачатку года набыць камп'ютар, нам не дазволілі. Усе эканомяць, а мы — моцна эканомім.

Мы пакуль ніяк не можам зарабіць больш. У нас на тэрыторыі сельсавета месціцца некалькі сядзібаў. Збор ад аграэкатурызму складае 35 тысяч рублёў. Хацелася б, каб падаткі нашых мясцовых арганізацый, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета (а гэта абласная псіхбальніца, СВК, лясгас, лясніцтва) заставаліся ў нас, на нізавым узроўні — тады быў бы эфект. Чаму, калі мы добра працуем, мы не маем добрага бюджэту? Гэтыя грошы сельвыканкам размеркаваў бы на канкрэтныя справы. А калі мы на датацыі сядзім, то нічога і не зменіцца. Што возьмеш з аграэкатурызму? Людзі слаба карыстаюцца гэтымі паслугамі, акрамя таго, гаспадары сядзібаў плацяць адзіны падатак. Рэальных крыніц, каб выйсці на 100 працэнтаў самафінансавання, у сельвыканкама няма.

Мы меркавалі стварыць КУП, 5 гадоў рыхтавалі дакументацыю, але нам не дазволілі (маўляў, мы — нізавое звяно вертыкалі ўлады і не павінны займацца гаспадарчай дзейнасцю). Калі быў бы трактар і брыгада чалавекі 2-4, то яны б сябе акупілі і яшчэ сельсавету прыбытак прынеслі. У нас шмат пенсіянераў, каля 600 жывуць адны, 78 — адзінокіх. КУП мог бы ім дапамагаць нарыхтоўваць дровы (для нас гэта актуальнае пытанне), апрацоўваць участкі. А так мне даводзіцца пастаянна прасіць некага абкасіць пустазелле на тэрыторыі.

Вера МІХАЛАП, старшыня Аболецкага сельскага Савета дэпутатаў Талачынскага раёна:

— Першапачаткова наш бюджэт быў сфарміраваны ў суме 155,8 млн. З чэрвеня ў яго былі ўнесены ўдакладненні — нам урэзалі асігнаванні на 28 млн (гэта прыкладна 18 працэнтаў) практычна па кожным артыкуле расходаў. Нашы даходныя крыніцы: падаходны, зямельны падатак, падатак на нерухомасць, частка падатку з продажу, збор з нарыхтоўшчыкаў, збор з уладальнікаў сабак, дзяржпошліна, арэндная плата за карыстанне зямлёй, даходы ад продажу зямельных участкаў і г.д. Датацыя на 2009 год склала 30, 9 млн — гэта каля 20 працэнтаў. Зямельны падатак, падатак на нерухомасць з фізічных асобаў і падаходны прыносяць найбольшы прыбытак. Гэта тры асноўныя крыніцы фарміравання нашага бюджэту (на нашай тэрыторыі 2 прыбытковыя сельгаспрадпрыемствы). Што датычыцца аграэкатурызму, у нас гэтае пытанне пакуль у праекце. Пэўныя задумы ёсць.

Калі гаварыць пра расходныя артыкулы, у першую чаргу назаву добраўпарадкаванне. На вулічнае асвятленне нам было прадугледжана 13 млн — пакуль што ўкладваемся. У нас 22 рэле часу амаль ва ўсіх населеных пунктах, акрамя маланаселеных неперспектыўных, дзе ўсяго 2—5 жылых хат. Там нерацыянальна ўсталёўваюць рэле — стаіць ліхтар ля калодзежа. На лета ў мэтах эканоміі мы адключалі вулічнае асвятленне. Непасрэдна на добраўпарадкаванне сёлета нам засталося 3 млн рублёў. Выкручваліся за кошт свабодных рэшткаў — на пачатак года ў нас заставалася 28 млн, якія нам дазволілі расходаваць на добраўпарадкаванне.

Ёсць яшчэ пазабюджэтны фонд — гэта так званыя добраахвотныя ахвяраванні грамадзян (у сярэднім 5 тысяч у год з аднаго падворка). Іх памер вызначаецца на раённай сесіі дэпутатаў. Пазабюджэтны фонд — добрая справа. Летась мы выкарыстоўвалі яго на ачыстку грамадскіх калодзежаў (затрацілі 1,3 млн рублёў). Сёлета 1,2 млн пайшло на прыбіранне аварыйных дрэў.

Аляксей ЛЕНІНЕЦ, старшыня Карчэўскага сельскага Савета дэпутатаў Баранавіцкага раёна:

— Даходная частка ў нас складаецца з зямельнага падатку з фізічных асобаў, падатку на нерухомасць з фізічных асобаў, падатку з продажу, дзяржпошліны, даходаў ад здачы ў арэнду маёмасці і г.д. Дзяржаўная датацыя — 61,2 млн. Усяго наша даходная частка сёлета — 142,4 млн рублёў (гэта з улікам удакладнення бюджэту, калі з нас «зрэзалі» 18 працэнтаў). Асноўнымі крыніцамі паступлення даходаў з'яўляюцца зямельны падатак, падатак на нерухомасць і падатак з продажу (на тэрыторыі сельсавета ёсць 3 крамы Баранавіцкага райпа, а таксама крама птушкафабрыкі «Дружба»).

Аграэкатурызм у нас у стадыі развіцця. Ёсць сядзіба ў вёсцы Грачыхі, там працы засталося няшмат, але пакуль што ніякіх даходаў у бюджэт не паступае. Мы плануем развіваць гэты кірунак, бо турыстычны патэнцыял у нас значны — ёсць і Камень філарэтаў, і паркі, і вадасховішча.

Наша расходная частка ўключае рэзервовы фонд — 810 тысяч рублёў (на «чорны дзень»), аплату камунальных паслуг, іншыя дзяржаўныя расходы. На вулічнае асвятленне нам выдаткавана 18,6 млн, на добраўпарадкаванне — 3 млн рублёў. Ільвіную долю расходаў склалі выдаткаванні з раённага бюджэту на капітальны рамонт будынка сельвыканкама (прыкладна 51,5 млн). У параўнанні з мінулым годам наша даходная частка амаль не змянілася. Памер датацыі застаўся на тым жа ўзроўні.

Што датычыцца вулічнага асвятлення, летась эканоміі ў нас не атрымлівалася, бо стаялі старыя фотарэле. Пасля ўсталявання ў самых буйных населеных пунктах рэле часу сітуацыя змянілася. Сёлета мы плануем выйсці на нядрэнную лічбу па эканоміі.

Васіль АСІПЕНКА, старшыня Вепрынскага сельскага Савета дэпутатаў Чэрыкаўскага раёна:

— Бюджэт наш датацыйны. Сёлета яго памер — 286 млн. З іх 164 млн — мэтавыя грошы на рамонт будынка сельскага Савета. Наша даходная частка складае 124 млн. Асноўнымі крыніцамі папаўнення бюджэту з'яўляюцца падатак на нерухомасць і падатак з продажу (у нас 2 буйныя населеныя пункты, тры стацыянарныя крамы рознічнага гандлю і аўтакрамы).

З улікам спецыфікі размяшчэння нашага сельсавета такія крыніцы, як аграэкатурызм і збор з нарыхтоўшчыкаў, для нас не актуальныя. Адзіная рэальная перспектыва павелічэння долі ўласных даходаў — рост магутнасцяў мясцовага СВК. Яно спецыялізуецца на малочнай жывёлагадоўлі і сёлета павялічыла пагалоўе з 360 да 750. СВК забяспечвае заробак работнікам, своечасовую выплату падаткаў. У нас на тэрыторыі сельсавета ёсць яшчэ некалькі арганізацый — цэх «Магілёўлеса», мехустаноўка Чэрыкаўскага лясгаса, дрэваапрацоўчы камбінат. Калі б нам пакінулі частку падаходнага падатку, то напаўненне нашага бюджэту было б вельмі і вельмі добрым. Мы маглі б закрываць усю даходную частку.

У параўнанні з мінулым годам бюджэт асабліва не змяніўся — за выключэннем інвестыцый на капрамонт. Летась памер датацый склаў дзесьці 36 працэнтаў.

Удакладненняў бюджэту ў нас не было — няма чаго было рэзаць, усё да капеечкі распісана.

Інга МІНДАЛЁВА.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ВЫКЛЮЧНА НА СТАНОЎЧЫХ ПРЫКЛАДАХ МНОГАМУ НЕ НАВУЧЫШСЯ»

Гэты навучальны год Інстытут вышэйшых кіраўніцкіх кадраў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь распачаў у новым для сябе статусе — з верасня ён стаў факультэтам павышэння кваліфікацыі Інстытута дзяржаўнай службы ўсё той жа Акадэміі. Чым былі выкліканы такія змены і якія вынікі мяркуецца ад гэтага атрымаць, мы папрасілі расказаць дырэктара інстытута дзяржслужбы, кандыдата філасофскіх навук, дацэнта Мікалая ШЧОКІНА.

— Патлумачце, калі ласка, чым была абумоўлена рэарганізацыя?

— Ва ўмовах жорсткай канкурэнтнай барацьбы, сусветных фінансава-эканамічных узрушэнняў асаблівае значэнне мае слушная ацэнка і рэгуляванне працэсаў, якія адбываюцца. Гэтыя працэсы часам патрабуюць ад кіраўніка не столькі дзеянняў, колькі аналізу і прагнозу, крэатыўнага мыслення. Пры гэтым важна, каб яно абапіралася на сучасныя веды, было сітуатыўным, шматфактарным, гнуткім і аператыўным.

У нашай краіне адбыліся значныя змены на шляху фарміравання дэмакратычнага адкрытага грамадства. Акадэмія кіравання таксама не магла застацца ў баку ад тых пераўтварэнняў, якія скіраваны на паляпшэнне жыцця як чалавека ў прыватнасці, так і ўсёй краіны ў цэлым. Кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача аптымізаваць усю сістэму падрыхтоўкі кадраў. Указам № 275 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў у галіне кіравання» быў зацверджаны новы статут Акадэміі кіравання, які і абумовіў правядзенне рэарганізацыі. Наяўнасць розных інстытутаў — інстытута вышэйшых кіраўніцкіх кадраў, інстытута дзяржслужбы — не заўсёды давала магчымасць хутка каардынаваць дзеянні, бо навучанне было шматпланавым. Цяпер усё зроблена для таго, каб узняць якасны ўзровень адукацыі, зрабіць работу па падрыхтоўцы кадраў, якія ўваходзяць у рэестр кіраўніка дзяржавы і адзінага перспектыўнага кадравага рэзерву, больш сістэмнай.

У новым статуце Акадэміі кіравання асаблівая ўвага надаецца якасці падрыхтоўкі кадраў, пастаўлена задача цеснага ўзаемадзеяння з органамі дзяржаўнага кіравання. Інстытут дзяржслужбы адразу адрэагаваў на новыя патрабаванні — кожная наша кафедра цяпер замацавана за пэўнай вобласцю і будзе цесна супрацоўнічаць з мясцовымі цэнтрамі павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі. Мы думаем нават зрабіць пашпарты запатрабаванасці кадраў у абласцях. Нашы выкладчыкі будуць выязджаць у раёны і на месцы праводзіць маніторынг (сацыялагічнае апытанне насельніцтва) — якія кадры больш запатрабаваны ў пэўным рэгіёне, дзе работа пастаўлена не эфектыўна. Потым мы падрыхтуем навуковае абгрунтаванне — што і як лепш змяніць у кожнай вобласці, дзе, магчыма, гэтым кадрам (работнікам аддзелаў, упраўленняў выканкамаў) варта прайсці перападрыхтоўку ці павышэнне кваліфікацыі. Усе нашы намаганні скіраваныя на тое, каб узняць якасць работы дзяржаўных чыноўнікаў. Часта многім з іх неабходна патлумачыць сутнасць тых жа дырэктыў, указаў і іншых заканадаўчых дакументаў, якія прымаюцца ў нашай краіне, якім чынам іх прымяняць на практыцы.

— Інстытут вышэйшых кіраўніцкіх кадраў пасля рэарганізацыі стаў факультэтам павышэння кваліфікацыі інстытута дзяржслужбы. Ці не ада-б'ецца гэта на якасці навучання?

— Ні ў якім разе. Лекцыі ў нас чытаюць найлепшыя выкладчыкі ў рэспубліцы. У адпаведнасці з новым статутам Акадэміі кіравання, цяпер мы атрымалі практычна ідэальную мадэль падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кіраўнікоў.

— Што ўяўляе сабой навучанне ў вашым інстытуце?

— Ёсць некалькі варыянтаў навучання — перападрыхтоўка, павышэнне кваліфікацыі. Сёлета ў нас сфарміраваны факультэт падрыхтоўкі — такога ў рэспубліцы яшчэ не было, але саму падрыхтоўку мы распачнём з наступнага года. Тут будзе навучацца рэзерв кіраўніка дзяржавы. Гэта будзе эксклюзіўная падрыхтоўка кіраўнікоў вышэйшага звяна, эксклюзіўная спецыяльнасць і другая вышэйшая адукацыя. Новы статут Акадэміі кіравання даў магчымасць кіраўнікам атрымліваць другую вышэйшую адукацыю. Хто туды патрапіць — вырашыць Адміністрацыя Прэзідэнта.

Навучанне на факультэце перападрыхтоўкі праводзіцца на бюджэтнай (згодна з дзяржзаказам) і на платнай асновах. Тэрмін навучання на вочнай форме — 10 месяцаў, на завочнай — 1 год і 10 месяцаў. У межах дзяржаўнага заказу праводзіцца мэтавы набор слухачоў са складу кіруючых работнікаў, пасады якіх уключаны ў кадравы рэестр кіраўніка дзяржавы, іх рэзерву, а таксама перспектыўнага кадравага рэзерву.

Навучанне на факультэце павышэння кваліфікацыі нашага інстытута праводзіцца ў форме кароткатэрміновых курсаў (5 ці 10 дзён). Вучэбныя планы прадугледжваюць спалучэнне агульнатэарэтычнай і прыкладной падрыхтоўкі і распрацоўваюцца пад канкрэтныя катэгорыі пасад слухачоў, з улікам спецыфікі іх прафесійнай дзейнасці. Планы навучання будуюцца па блочна-модульным прынцыпе (сацыяльна-эканамічны і ідэалагічны; прафесійны і кіраўніцкі). Абавязковым кампанентам навучання сталі кадравыя і прававыя пытанні, а таксама пытанні, звязаныя з дэбюракратызацыяй, з укараненнем прынцыпу «Аднаго акна», з работай са зваротамі і скаргамі грамадзян, з выкананнем асноўных дзяржаўных праграм (адраджэння і развіцця вёскі, развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадоў і інш.)

— Ці хопіць 10 дзён чалавеку, які ўпершыню абраны, скажам, старшынёй сельвыканкама і які не мае адпаведнай кіраўніцкай практыкі?

— Новых абраных старшынь сельвыканкамаў накіроўваюць на курсы ў адпаведнасці з дзяржзаказам і планам-графікам павышэння кваліфікацыі. Анкетаванне гэтай катэгорыі паказвае, што 10 дзён для павышэння кваліфікацыі дастаткова. Кіраўнік дзяржавы паставіў перад намі задачу забяспечыць слухачоў больш якаснымі ведамі за меншы перыяд навучання, таму мы прапануем своеасаблівую квінтэсенцыю самай неабходнай інфармацыі. Мы імкнёмся аператыўна адсочваць тыя праблемы і сітуацыі, якія ўзнікаюць у нашым грамадстве, і «ўцягваць» гэтыя актуальныя тэмы ў вучэбны працэс. Мы пастаянна карэктуем вучэбныя планы.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

«ВЫКЛЮЧНА НА СТАНОЎЧЫХ ПРЫКЛАДАХ МНОГАМУ НЕ НАВУЧЫШСЯ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Значыць, старшыні, якія праходзяць навучанне цяпер, атрымліваюць іншую інфармацыю ў параўнанні з той, якую асвойвалі іх калегі на вясновых курсах?

— Так. У іх могуць адрознівацца і дысцыпліны, і выкладчыкі... Перападрыхтоўка больш статычная — гэта ўсё ж амаль 2-гадовае навучанне. Хоць і тут мы імкнёмся кожны год мяняць планы, каб зрабіць іх дынамічнымі. І на курсы павышэння кваліфікацыі, і на перападрыхтоўку мы запрашаем кіраўнікоў органаў дзяржкіравання, вядучых навукоўцаў у галіне кіравання, сацыяльнай сферы, эканомікі. У нас і міністры чытаюць лекцыі. Калі ў дзяржавы і грамадства з'яўляюцца новыя задачы, мы адразу імкнёмся па гэтых кірунках запрашаць адпаведных спецыялістаў. Напрыклад, вы ведаеце, што ў нашай краіне будзе будавацца АЭС. У сувязі з гэтым мы запрашаем на лекцыі спецыялістаў з Міністэрства энергетыкі. Сутнасць у тым, што часам старшыні не толькі сельскіх, але і раённых выканкамаў, начальнікі ўпраўленняў не ў стане адказаць на ўсе пытанні, з якімі да іх прыходзяць на прыём людзі (пры тым, што з імі трэба весці тлумачальныя размовы, гэта па сутнасці і ёсць ідэалогія). А калі кваліфікаваны спецыяліст, які непасрэдна бярэ ўдзел у праекце будаўніцтва АЭС, рыхтуе адпаведныя дакументы, на лекцыі даступна патлумачыць — для чаго нам патрэбна АЭС, якія выгады яна нам дасць — то і самі чыноўнікі потым змогуць даць слушныя адказы грамадзянам.

— Як змяніліся вашы вучэбныя планы пасля прыняцця Указа № 21, закліканага павысіць ролю мясцовых органаў кіравання і самакіравання ў вырашэнні праблем людзей? На што стаў рабіцца націск?

— Прыняцце Указа № 21 запатрабавала ад нас унясення значных змяненняў у планы павышэння кваліфікацыі старшынь сельскіх, пасялковых, гарадскіх і раённых Саветаў. Асаблівую актуальнасць набылі пытанні фарміравання бюджэтаў пярвічнага ўзроўню, якія Указам № 21 упершыню замацаваныя нарматыўна. Кіраўнікам органаў мясцовага кіравання і самакіравання спатрэбілася лепшае валоданне пытаннямі падаткаабкладання. Акрамя таго, з павышэннем статусу старшыні Савета з'явіліся новыя патрабаванні і да ўзроўню яго кіраўніцкай кампетэнтнасці ў рабоце з людзьмі. Усё гэта знайшло адлюстраванне ў вучэбных планах.

— На курсах павышэння кваліфікацыі слухачы праяўляюць асаблівую цікавасць да сустрэч з канкрэтнымі спецыялістамі (прадстаўнікамі Мінфіна, камітэта па землекарыстанню, дарожнікамі, камунальнікамі і г.д.) З кім яшчэ вы мяркуеце актыўна супрацоўнічаць сёлета?

— Акрамя прафесарска-выкладчыцкага складу Акадэміі, у павышэнні кваліфікацыі навучэнцаў актыўны ўдзел бяруць кіруючыя работнікі Адміністрацыі Прэзідэнта, апарата Савета Міністраў, Нацыянальнага сходу, судоў, адказныя супрацоўнікі міністэрстваў, дзяржкамітэтаў, ВНУ і навукова-даследчых інстытутаў. На патоках старшынь пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў рэгулярна праходзяць «круглыя сталы» з удзелам членаў камісій Савета Рэспублікі, Савета па ўзаемадзеянні. Пастаяннымі сталі сустрэчы, якія праходзяць у межах вучобы, са Старшынёй Савета Рэспублікі Барысам Батурам. Такія сустрэчы вельмі карысныя. Яны дазваляюць у форме дыялогу агучыць і абмеркаваць актуальныя пытанні дзейнасці Саветаў. Старшыня Савета Рэспублікі ведае ўсіх слухачоў у твар і па прозвішчы, ведае і праблемы, якія яны ўзнімаюць. Між іншым, шэраг пытанняў вырашаецца непасрэдна падчас абмеркавання.

— Ці прадугледжаны ў працэсе навучання практычныя заняткі з выездам на месца?

— Безумоўна. Практычная скіраванасць навучання кадраў у многім забяспечваецца менавіта за кошт правядзення выязных заняткаў на базе лепшых прадпрыемстваў і сельсаветаў, вызначаных аблвыканкамамі. Напрыклад, нашы слухачы ездзілі ў «Аэрапорт «Мінск-2». Некалі ён быў стратным, а цяпер прыносіць даход. Нам рэальна паказалі, што і як для гэтага патрэбна было зрабіць. Не так даўно старшыні пасялковых і сельскіх Саветаў наведалі Старобінскі пасялковы Савет, дзе пазнаёміліся з практыкай рэалізацыі Указа № 21. Аналагічныя заняткі прайшлі ў Вілейскім, Асіповіцкім, Калінкавіцкім і іншых раёнах. Хутка чарговая група слухачоў факультэта з мэтай вывучэння практыкі фарміравання бюджэту выедзе ў адзін з раёнаў Міншчыны.

— Вы выязджаеце толькі на паспяховыя прадпрыемствы і ва ўзорныя сельсаветы, разглядаеце толькі станоўчыя прыклады кіравання?

— Выключна на станоўчых прыкладах многаму не навучышся. Трэба бачыць рэальную сітуацыю, а ёсць жа і крызісныя прадпрыемствы, і праблемныя сельсаветы. У наступны раз разам з Саветам па ўзаемадзеянні органаў мясцовага кіравання і самакіравання мы мяркуем правесці выязныя заняткі ў «сярэднім» па паказчыках раёне, каб пабачыць не толькі дасягненні, але і праблемы, а заадно і паспрабаваць агульнымі сіламі вынайсці рашэнні.

Увогуле мы актыўна ўкараняем самыя розныя формы заняткаў. У навучальным працэсе побач з лекцыямі, дзелавымі сустрэчамі, «круглымі сталамі» і выязнымі практычнымі заняткамі шырока прымяняюцца інавацыйныя адукацыйныя тэхналогіі — рэфлексіўныя практыкумы, аналітычныя трэнінгі, прэзентацыі, камп'ютарнае гульнявое мадэляванне...

— Якія гульні вы прапануеце вашым слухачам?

— У нас ёсць база пэўных праблемных сітуацый, кіраўніцкіх мадэляў, а слухач павінен знайсці аптымальнае выйсце. Усё гэта робіцца для таго, каб чалавек навучыўся прымаць кіраўніцкія рашэнні.

У цэлым, падводзячы вынікі вышэйсказанаму, хацеў бы вызначыць тры асноўныя стратэгічныя кірункі развіцця Інстытута дзяржаўнай службы: у галіне адукацыі — гэта забеспячэнне апераджальнага задавальнення патрэбаў сістэмы дзяржаўнага кіравання ў высакаякасных адукацыйных паслугах і канкурэнтаздольнасці дзяржаўных служачых; у навуковай і інавацыйнай галіне — гэта развіццё і паглыбленне фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў, інавацыйнай дзейнасці і практычная іх рэалізацыя ў сферы кіравання, у народнай гаспадаркі і вучэбным працэсе; у арганізацыйна-ідэалагічнай галіне — культывацыя духоўна-маральных каштоўнасцяў, гатоўнасці да выканання новых сацыяльных функцый, пачуцця патрыятызму, фарміраванне адказнага стаўлення да прафесійнага станаўлення.

Падкрэслю, што ад якасці падрыхтоўкі новага пакалення кіраўнікоў залежыць дынамічнае развіццё нашай дзяржавы. З гэтага вынікае, што падрыхтоўка кадраў — задача палітычная. І эфектыўна вырашыць яе можна толькі разам, у цесным узаемадзеянні ўсіх зацікаўленых бакоў — Акадэміі кіравання, рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання.

Гутарыла Інга МІНДАЛЁВА.

РАМОНТ ПА ПРАВІЛАХ І БЕЗ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Дзевяць гадоў перапіскі.

Сітуацыя, расказвае Людміла Бачкарова, склалася форс-мажорная, асабліва, калі ўлічыць, што Лене кожны вечар неабходна было даставаць пратэз, прамываць поласць вока, рабіць шэраг іншых працэдур... Людміла Мікалаеўна бясконца ўдзячная суседзям, якія даралі ім ключы ад сваіх кватэр і дазвалялі карыстацца санвузлом.

— Але ў рэшце рэшт людзі не вытрымалі, іх абурыла такое стаўленне да нас, такая знявага. І яны напісалі ў Адміністрацыю Прэзідэнта.

У давяршэнне ўсіх бедаў пад кватэрай № 68 пацякла каналізацыйная труба. Людміла Мікалаеўна зноў звярнулася ў ЖЭС: «Вы ж бачыце, што адбываецца — зрабіце хоць што-небудзь!». «Мы думаем», — адказалі ёй.

Пяць дзён Бачкарова змагалася з нечыстотамі, якія прасочваліся ў адтуліну ад знятага ўнітаза... Нарэшце, каналізацыйную трубу замянілі. А да пачатку жніўня завяршылі і рамонт санвузла.

— Я аднаго не разумею — чаму мы ўвесь час павінны былі змагацца за элементарныя рэчы? І кожны раз ледзь ці не на каленях прасіць работнікаў ЖЭСа выканаць тую працу, за якую яны рэгулярна атрымліваюць зарплату? — пытаецца Людміла. — Некалькі гадоў я дабівалася, каб у кватэры знялі старую шпаклёўку, апрацавалі сцены супрацьгрыбковым сродкам, паклалі новую шпаклёўку і паклеілі шпалеры... Але работнікі ЖЭСа ўпарта выконвалі толькі адзін «пункт» — клеілі шпалеры, добра разумеючы, што яны не будуць трымацца. Толькі пасля звароту жыльцоў у Адміністрацыю Прэзідэнта ЖЭС пачуў, нарэшце, маю просьбу і пашпакляваў сцены перад паклейкай!

І ўсё ж дзевяць гадоў хаджэння па інстанцыях і барацьбы за права жыць у нармальных умовах не прайшлі дарэмна. Жыльцы «злашчаснага» дома (як ахрысцілі яго чыноўнікі) убачылі, нарэшце, святло ў канцы тунэля.

— Пасля таго, як у падвале замянілі каналізацыйную трубу, там стала суха і ўжо некалькі тыдняў няма смуроду, які людзі цярпелі столькі гадоў. У наш пад'езд цяпер прыемна заходзіць, — дзеліцца добрымі навінамі Людміла Бачкарова. — Паступова аднаўляюцца вентыляцыйныя каналы, пра якія ў свой час «забыліся» будаўнікі. У кватэрах ліквідавана асноўная маса плесні, а сам дом уцеплены. Каму ад гэтага стала горш? Нікому. Толькі лепш. Але чаму, каб усе нашы мары ператварыліся ў рэальнасць, неабходна было патраціць столькі сілаў, нерваў і часу?

Праўда, дадае Людміла Мікалаеўна, асабіста для яе і яшчэ для некаторых «празмерна актыўных» суседзяў выпрабаванні яшчэ не скончыліся.

— У нас любяць, каб жыльцы сядзелі ціха, не высоўваліся, а тым больш не паведамлялі пра хібы і непаладкі «наверх». Я і сама не прыхільнік канфліктаў, канфрантацыі. Колькі разоў гаварыла кіраўніцтву нашага ЖЭСа — давайце вырашаць пытанні разам, давайце выпраўляць будаўнічыя дэфекты, давайце хадзіць па інстанцыях... Але ім не хацелася «выносіць смецце з хаты».

Людміла Бачкарова прывыкла ўжо выслухоўваць пагрозы і знявагі — прамыя і прыхаваныя — ад службовых асобаў.

— Чым мяне толькі не палохалі... Гаварылі, што рамонт мне зробяць толькі «на паперы». І што за кожнае, нават дробнае, парушэнне будуць складаць пратаколы. А колькі разоў мне даводзілася чуць: маўляў, скаржнікі доўга не жывуць! Але хіба я скарджуся ад добрага жыцця? Чалавек, якога ўсё задавальняе, ніколі не пойдзе па «інстанцыях»...

З Бачкаровай спрабавалі праводзіць «гутаркі». Калі ж не дапамагло, навесілі ярлык «спажывецкай экстрэмісткі».

— Я не экстрэмістка, — уздыхае яна. — Я звычайная маці, і як магу змагаюся за кожны лішні дзень жыцця для сваёй дачкі. У мяне пытаюцца: чаму вы клеіце ў прыхожай белыя шпалеры, гэта ж непрактычна? Таму што, адказваю, хачу, каб у жыцці маёй дзяўчынкі было больш светлага. У дзіцячым узросце Лена прайшла праз такія выпрабаванні, што і ворагу не пажадаеш. Пасля 18 курсаў хіміятэрапіі, пасля апрамяньвання радыеактыўным рутэніем яна літаральна балансавала на краі. І не для таго выкараскалася пасля найцяжэйшага лячэння, каб павольна згаснуць у сценах уласнай кватэры ад грыбковай інфекцыі. Кожны анколаг скажа вам, наколькі згубная такая інфекцыя для хворага на анкалогію — яна знішчае і без таго вельмі слабы імунітэт.

Некалькі гадоў таму Людміла Бачкарова была вымушана пакінуць працу, каб падрыхтаваць дачку да паступлення ў ВНУ. Ніякія рэпетытары ні за якія грошы не здолелі б зрабіць тое, што зрабіла яна, начытваючы падручнікі ўслых днём і ноччу, каб зберагчы Лене зрок і другое вока... Людміла Мікалаеўна і сёння імкнецца, наколькі гэта ў яе сілах, падтрымліваць дачок (старэйшая заканчвае медуніверсітэт і таксама жыве з маці). Сям'я існуе на вельмі сціплыя даходы (дзве стыпендыі і пенсію).

— Мне некаторыя гаварылі: замест таго, каб абіваць парогі ЖЭСа і адміністрацыі Першамайскага раёна, зрабілі б рамонт за ўласныя сродкі. Але, па-першае, усё да капейкі мы трацім на тое, каб забяспечыць хоць бы мінімум неабходнага для Лены. А па-другое, чаму я павінна выпраўляць, прабачце, чыюсьці «халтуру»?

Людміла Мікалаеўна прызнаецца, што яе ўжо калоціць ад адной толькі думкі аб чарговым рамонце. Аднак яна вельмі спадзяецца, што ён, нарэшце, будзе апошнім...

Наталля КАРПЕНКА.

АБМЕЖАВАНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ І... НЕАБМЕЖАВАНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

Нядаўна з работай мясцовай улады Вілейскага раёна ў сацыяльнай сферы пазнаёмілася незвычайная дэлегацыя — група жонак паслоў замежных краін, акрэдытаваных у Беларусі. Нагадаем, у Мінску дзейнічае клуб пасольскіх жонак. Яны, акрамя іншых важных задач, займаюцца і дабрачыннасцю. У рамках візіту прадстаўніцы клуба наведалі Вілейскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, аднаму з яго аддзяленняў падарылі кухню.

Сустрэцца і пагутарыць з дырэктарам цэнтра Людмілай Сляпцовай параіў мне старшыня раённага Савета дэпутатаў Яўген Ігнатовіч.

— Калектыў цэнтра — гэта нашы партнёры. Пытанні аб тым, як маладыя інваліды жывуць, вучацца, бавяць вольны час і па магчымасці працуюць, якім чынам яны могуць удзельнічаць у жыцці грамадства, а таксама новыя формы работы з гэтымі людзьмі — нашы агульныя клопаты. Вось цяпер разам рыхтуемся да правядзення чарговага дабрачыннага марафону з нагоды Дня інвалідаў. У ім традыцыйна самы актыўны ўдзел бяруць усе сельскія Саветы. Стартуе марафон 3 лістапада і доўжыцца месяц. За гэты час нашы выканкамы дапамагаюць і ў зборы фінансавых ахвяраванняў на патрэбы інвалідаў.

Падчас марафону не толькі збіраюцца грашовыя сродкі. Усё ж галоўнае — звярнуць увагу кіраўнікоў прадпрыемстваў, устаноў, іх работнікаў, членаў грамадскіх арганізацый на тое, што побач з імі жывуць людзі, у тым ліку і маладыя, якія маюць патрэбу ў падтрымцы, добрым слове, элементарнай чалавечай увазе, — кажа Яўген Антонавіч.

У большасці маладых інвалідаў нягледзячы на іх абмежаваныя магчымасці, даволі вялікі патэнцыял для асабістага развіцця. Таму матэрыяльная дапамога і маральная падтрымка сям'і, дзе жыве такі чалавек, заўсёды да месца.

Але не менш важны, на думку Людмілы Сляпцовай, індывідуальны падыход да кожнай такой сям'і, каб з улікам яе ўнутраных рэсурсаў разам супрацьстаяць бядзе. У гэтым сэнсе карыснымі зарэкамендавалі сабе псіхалагічныя кансультацыі, стварэнне групы самадапамогі для маці, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў і маладых інвалідаў. Летась у такой групе прайшло 10 заняткаў, сёлета ў раёне ўжо дзве групы. У структуру тэрытарыяльнага цэнтра ўваходзіць пяць аддзяленняў, якія дапамагаюць розным катэгорыям насельніцтва. Сярод іх 184 маладыя інваліды ва ўзросце ад 18 да 31 года.

Работа па ўдасканаленні сацыяльнага абслугоўвання працягваецца. Зразумела, вядзецца яна разам з органамі мясцовай улады. Важнай сумеснай працай у гэтым сэнсе з'явілася адкрыццё пры цэнтры ў Вілейцы аддзялення дзённага знаходжання маладых інвалідаў, у тым ліку і калясачнікаў. Месца аддзялення знайшлі на тэрыторыі адной дзіцячай дашкольнай установы. Выдзеленае там памяшканне адрамантавалі і прыстасавалі: пашырылі дзвярныя праёмы, зрабілі ўваход, прыбудавалі пандус і г. д.

— Цяпер гэта аўтаномнае аддзяленне, якое разлічана на 20 чалавек. Яны чатыры гадзіны штодзень знаходзяцца пад пільным наглядам загадчыцы, двух спецыялістаў і медыцынскай сястры. У бацькоў інвалідаў такім чынам з'яўляецца час на тое, каб па-за межамі дома некуды пайсці па справах, зрабіць нешта па гаспадарцы, — расказвае Людміла Міхайлаўна.

Тут імкнуцца кожнаму знайсці занятак і па душы, і па магчымасці. Калі не паддаецца творчасць, раяць праявіць сябе ў іншым — скажам, у вырашэнні дробных бытавых праблем сваёй сям'і. Напрыклад, вучаць як наведаць краму, выбраць там пэўныя тавары і самастойна разлічыцца. Ці як адправіць ліст на пошце, заплаціць за тэлефон, як вырашыць нейкае іншае нескладанае, але неабходнае пытанне.

Увогуле ў аддзяленні пануе прынцып самаабслугоўвання. У сярэдзіне дня звычайна наладжваецца «сумесны чай». Інваліды самі яго рыхтуюць: расстаўляюць посуд, частуюць адно аднаго ўзятымі з дому цукеркамі, пячэннем, бутэрбродамі. Потым самі прыбіраюць стол, мыюць кубачкі, талеркі...

Каб час кароткага знаходжання ў аддзяленні прыносіў яшчэ больш карысці, у цэнтры вырашылі адчыніць творчую майстэрню. Цяпер ідзе падрыхтоўка яе памяшкання. Свой унёсак у стварэнне майстэрні робіць мясцовая ўлада, тое-сёе дапамаглі зрабіць спонсары, а летам маладыя валанцёры-ірландцы замянілі там дзверы. У выніку ўдалося многае зрабіць. Магчыма, у наступным годзе запрацуе свой ганчарны цэх. Далей плануюць заняцца распінаводствам — вырошчваць у цяпліцы пятрушку, кроп, кінзу, іншыя травы, якія потым будуць пастаўляць прадпрыемствам мясцовага грамадскага харчавання. У планах і дрэваапрацоўка. У Вілейцы два прадпрыемствы працуюць з драўнінай: мэблевая фабрыка і завод «Буддэталь». Мяркуецца, што асобныя дробныя дэталі інваліды будуць даводзіць да ладу, напрыклад, афарбоўваць. Цяпер вывучаецца пытанне набыцця неабходнага для майстэрні абсталявання, падрыхтоўкі памяшкання.

Пераважная большасць дзяцей-інвалідаў і маладых інвалідаў калі і рухаюцца самастойна, то з вялікай цяжкасцю. Забеспячэнне транспартам — адна з галоўных тэхнічных праблем цэнтра. Але яна нядаўна вырашана: на грошы абласнога бюджэту набыты спецыяльна абсталяваны мікрааўтобус. Наяўнасць такога транспарту дазволіць сацыяльным работнікам часцей наведваць у аддаленых вёсках дзяцей-інвалідаў і маладых інвалідаў, а калі спатрэбіцца, прывозіць іх у дзённае аддзяленне. Хоць тут паўстае пытанне з аплатай паліва. Але ў цэнтры разлічваюць на тое, што ў будучыні бацькі пагодзяцца кампенсаваць частку выдаткаў на бензін.

— Нашы падапечныя — людзі з абмежаванымі магчымасцямі, але з неабмежаваным патэнцыялам. І наша задача дапамагчы раскрыць яго. А такое хутчэй можа здарыцца ў калектыве, дзе людзі з абмежаванымі магчымасцямі могуць праявіць сябе, прадэманстраваць свае здольнасці, — пераканана Людміла Сляпцова.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.
Вілейскі раён.

КАРОТКАЕ ЗАМЫКАННЕ

Жыхары двухсот шматпавярховых дамоў у Гродне амаль на паўсутак пазбавіліся электрычнасці.

У ноч з 17 на 18 кастрычніка мікрараён «Фолюш» горада Гродна ў выніку пажару, які ўзнік на мясцовай падстанцыі, быў абясточаны. Каманда МНС на месца здарэння прыбыла ў лічаныя хвіліны, і пажар быў аператыўна ліквідаваны. Паводле папярэдніх звестак, узгаранне адбылося з-за кароткага замыкання. Жыхары двухсот шматпавярховых дамоў амаль на паўсутак пазбавіліся электрычнасці. Падачу электраэнергіі ў мікрараёне «Фолюш» аднавілі да 14.00.

БЕЛТА.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:
НАВІЦКІ Г.В., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні
БАЙКОЎ В.М., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце
АЦЯСАЎ А.Я., старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў
СЦЕПАНЕНКА А.М., адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
ПРЭДКА С.У., старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці
МАКСІМЕНКА С.А., старшыня Прылепскага сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК:
Наталля КАРПЕНКА.
Кантактны тэлефон
292 21 03.

Як «абудзіць» мясцовыя супольнасці?

У Беларусі стартаваў праект па актывізацыі тэрытарыяльна-арыентаванага развіцця рэгіёнаў, якія пацярпелі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Яго прэзентацыя адбылася ў Гомелі. Праект з'яўляецца вынікам сумеснай ініцыятывы Праграмы развіцця ААН і Еўрапейскай Камісіі. Выканаўчым агенцтвам праекта ад Беларусі стала Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Новы праект разлічаны на 30 месяцаў, яго бюджэт — больш за 1,5 мільёна еўра. Мяркуецца, што яго рэалізацыя будзе садзейнічаць актывізацыі мясцовых супольнасцяў у «чарнобыльскіх» рэгіёнах, акажа ім практычную дапамогу ў распрацоўцы і рэалізацыі праектных ініцыятыў па вырашэнні канкрэтных сацыяльна-эканамічных праблем вёсак і населеных пунктаў.

З гэтай нагоды будзе абрана па меншай меры пяць пэўных супольнасцяў (населеных пунктаў) у кожным з шасці мэтавых раёнаў, якія будуць ахопленыя праектнымі мерапрыемствамі. У якасці такіх раёнаў ужо вызначэныя Веткаўскі, Буда-Кашалёўскі, Хойніцкі і Жыткавіцкі, а да канца рэалізацыі праекта будуць абраныя яшчэ два раёны з Гомельскай і Магілёўскай абласцей.

У прыватнасці, у кожным з мэтавых раёнаў сумеснымі намаганнямі зацікаўленых бакоў (мясцовых уладаў, прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнэсу і інш.) мяркуецца рэалізаваць як мінімум адзін праект, накіраваны на стварэнне новых працоўных месцаў і павышэнне ўзроўню жыцця малазабяспечаных сацыяльных груп насельніцтва.

Леанід ТУГАРЫН.

ФОРМА І СУТНАСЦЬ

Са старшынёй Падольскага сельскага Савета дэпутатаў Астравецкага раёна Рыгорам ЦЭЙКА размаўляем аб перспектывах развіцця ўласных падсобных гаспадарак, высвятляем: ёсць гэтыя перспектывы ці іх няма? Рыгор Часлававіч як «карэнны вясковец» схіляецца да станоўчага адказу на пытанне. Але многае, гаворыць ён, залежыць ад заработнай платы ў сельскай мясцовасці.

— Вось глядзіце: пачала ў нас моладзь зарабляць на камбайнах па мільёну і больш — і ўсё, ім ужо нічога больш не трэба, — тлумачыць ён мясцовую арыфметыку.

— Значыць, рост дабрабыту ў вёсцы і павелічэнне зарплаты рана ці позна прывядуць да заняпаду падсобных гаспадарак?

— Ну, па-першае, вясковым заробкам яшчэ вельмі далёка да гарадскіх... Нават калі яны і зраўняюцца, у падсобных гаспадарак усё адно застанецца шанц на выжыванне — пры ўмове, што цэны на сельгаспрадукцыю будуць такімі, што людзі нават з высокімі заробкамі захочуць яе вырошчваць. Ну, а калі цэны застануцца на месцы ці папаўзуць уніз, дык і пры нізкіх заробках мала хто захоча трымаць уласную гаспадарку. Чалавек перш за ўсё павінен адчуваць выгаду.

Для старшыні сельскага Савета гэта не пустое тэарэтызаванне. Пра ўсе «плюсы» і «мінусы» вясковага падворка ён ведае не па чутках. Да таго, як пераехаць у Падольцы, Рыгор Цэйка з сям'ёй жыў на хутары (у Астравецкім раёне гэтым нікога не здзівіш, хутары тут літаральна на кожным кроку). На падворку былі і конь, і каровы, і авечкі, і іншая жыўнасць... Потым на гэта не стала хапаць часу. «Ад вялікай гаспадаркі, — усміхаецца Рыгор Часлававіч, — засталася «дробязь» — куры і сабакі».

Але не толькі. Засталося веданне зямлі, сутнасці вясковай працы — з яе непасрэднай і пастаяннай залежнасцю ад умення гаспадара, ад капрызаў надвор'я і... ад стаўлення кіраўніка сельгаспрадпрыемства.

— Таму я і імкнуся ўвесь час наладжваць адносіны і шукаць узаемаразуменне з саўгасам «Падольскі». Скардзіцца не буду. Калі сёлета трэба было, напрыклад, знайсці новы ўчастак пад сенакос у вёсцы Свіранкі, зрабілі гэта без праблем, па ўзаемнай згодзе з кіраўніком саўгаса. Людзі засталіся задаволеныя.

Падольскі сельсавет па колькасці насельніцтва невялікі — 900 чалавек. Затое населеных пунктаў аж 26, і большая іх частка — хутары. А хутар без прысядзібнага ўчастка, без падсобнай гаспадаркі і ўявіць цяжка. Людзі тут не распешчаныя высокімі заробкамі, затое з дзяцінства прывучаныя да «сямейнай» працы на сваім падворку. З гэтага жывуць, гадуюць дзяцей, адпраўляюць іх на вучобу ў горад...

Сям'я Любові Яновіч жыве ў вёсцы з прыгожай назвай Белая Вада. Дакладней, лічыцца, што жыве ў вёсцы, а насамрэч — на хутары. Муж працуе трактарыстам у саўгасе «Падольскі». А сама Любоў Іванаўна — хатняя гаспадыня. Ужо даўно, гадоў пятнаццаць.

Адразу заўважу, што сэнс, які ўкладваецца ў паняцце «хатняя гаспадыня» рознымі «гламурнымі» часопісамі, не мае нічога агульнага з рэальным жыццём Любові Яновіч. Працу ў калгаснай канторы яна пакінула не таму, што захацелася адпачыць. Калі ў сям'і нарадзіліся дзеці (іх трое), Любоў Іванаўна вырашыла, што ад яе знаходжання дома будзе больш карысці... Дзве старэйшыя дачкі ўжо выраслі, сын вучыцца ў школе. А яна так уцягнулася ў сваю гаспадарку, што іншага спосабу жыцця не ўяўляе і, галоўнае, не хоча нічога змяняць.

Сэнс, які ўкладваецца ў паняцце «хатняя гаспадыня» рознымі «гламурнымі» часопісамі, не мае нічога агульнага з рэальным жыццём Любові Яновіч.

Устае Любоў Іванаўна а палове пятай. За парог выйшла — і ўжо на працы. На падворку — дзве каровы, цяля, свінні, парасяты, куры. Клопатаў да неба, праца цяжкая, далёка не «чыстая», пераважна фізічная. Каб пракарміць такую «плойму», на ўчастку каля хаты Яновічы высаджваюць бульбу і збожжа.

— Садзім, сеем і ўбіраем «соткі» самі. Калі трэба, можна без праблем выпісаць у саўгасе трактар, — расказвае Любоў Іванаўна. — Але ў асноўным спадзяёмся на свае сілы — пакуль што іх хапае. Вось нядаўна купілі бычка — мяркую, гэта будзе больш выгадна, чым трымаць свіней.

Рынак ёсць рынак, у яго свае законы. Сёлета ў людзей не ўрадзіла бульба, і попыт на парасят рэзка знізіўся. Затое па-ранейшаму выручае малако. Дзве каровы «прыносяць» сям'і па 500 тысяч рублёў дадатковага даходу ў месяц. А ўвогуле, дзеліцца «сакрэтам» Любоў Іванаўна, яе сярэдні заробак (сюды ўваходзяць і «малочныя» грошы, і выручка ад рэалізацыі свініны) атрымліваецца часам нават большым, чым у мужа.

Здаюць Яновічы па 30 літраў малака штодзень. Малаказборшчык прыязджае кожную раніцу. Грошы за здадзенае малако прывозіць таксама рэгулярна — тры разы на месяц.

— Не ведаю, як бы мы вучылі дзяцей, калі б не ўласная гаспадарка, — разважае Любоў Іванаўна.

Адна яе дачка працуе юрыстам у Астраўцы, другая вучыцца ў медуніверсітэце.

— Не захацелі займацца вашай працай? — пытаюся ў гаспадыні.

— Ды я і сама не хацела, каб яны гэтым займаліся. Моладзь ужо іншая — яна імкнецца вывучыцца, пабачыць свет. А на зямлі цяжка працаваць. Хочаш — не хочаш, здаровы ці хворы — карову даіць трэба... Ну, можа, сын, калі вырасце, будзе трактарыстам. Ён яшчэ ў школу не хадзіў, а меў свой асобны «ўчастак» і з задавальненнем там корпаўся.

У прынцыпе, Любоў Яновіч задаволена тым, як склалася яе жыццё. Яна працуе на сябе, на ўласным кавалку зямлі. Яе сям'я практычна поўнасцю забяспечана натуральнымі прадуктамі, якія (што б там ні гаварылі) не параўнаць з тымі, што з крамы.

— А ў краме што купляеце? — цікаўлюся ў Любові Іванаўны.

— Хлеб, соль, муку... Што яшчэ? Рыбкі часам хочацца, селядца... А прысмакі розныя дачка з Астраўца прывозіць. Так што на лёс я не скарджуся.

Аднак і Падольскі сельсавет не абмінула агульная тэндэнцыя да змяншэння насельніцкага статку, нягледзячы нават на тое, што цяпер на кожную карову саўгас выдзяляе 30 сотак сенакосу, 30 сотак пашы і 40 сотак пад пасадку бульбы. На прыватных падворках сёння засталося 169 кароў. Трымаюць іх — у асноўным дзеля дадатковага заробку — сем'і, дзе ёсць дзеці (прычым незалежна ад узросту апошніх). Дарэчы, сёлета адбыўся непрыемны выпадак: жыхарам Падольскага сельсавета вярнулі назад партыю здадзенага на завод малака.

— Хацелася б, каб у сельгаспрадпрыемстве, якое нясе адказнасць за малако ад насельніцтва, былі ў наяўнасці спецыяльныя прыборы ці тэсты для праверкі яго на ўтрыманне антыбіётыку, — гаворыць Рыгор Цэйка. — Пакуль такога няма, заўсёды будзе існаваць рызыка вяртання няякаснага прадукту цэлымі партыямі. Застаецца праводзіць тлумачальную работу з насельніцтвам і спадзявацца на сумленнасць людзей.

Пачынаючы з ранняй вясны, у вёсках сельсавета праходзяць сходы грамадзян: людзей хвалюе наяўнасць пашы і сотак пад пасадку. Дарэчы, старшыня саўгаса «Падольскі» паабяцаў у наступным годзе выдзеліць па 40 сотак сенакосу на карову замест ранейшых 30. Ці здольны будзе такі крок у нейкай ступені прытармазіць працэс «згортвання» ўласных падсобных гаспадарак, пакажа час. Старшыня Падольскага сельскага Савета Рыгор Цэйка настроены дастаткова аптымістычна.

— Я ўпэўнены, — гаворыць ён, — што нават пры ўмове высокіх заробкаў у вёсцы ніколі не перавядуцца людзі, якія будуць трымаць уласную гаспадарку. Няхай такіх застанецца 20 ці нават 10 працэнтаў. Задача мясцовай улады — падтрымаць іх у той форме, у якой яны самі захочуць існаваць. Галоўнае, каб захавалася сутнасць.

Наталля КАРПЕНКА,
Астравецкі раён.

ПЕРАПІС НАСЕЛЬНІЦТВА: «ДЗЯРЖАВЕ ТРЭБА ВЕДАЦЬ...»

Перапісчыкам папрацавала карэспандэнт «Звязды» Настасся Занько

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ВАШ СТАН У ШЛЮБЕ? — ТАК САБЕ

ПЕРАПІСНЫ ўчастак № 5 Фрунзенскага раёна месціцца ў танцавальным класе СШ № 116. Менавіта сюды сцякаюцца першыя звесткі перапісной кампаніі-2009. Тут застаюцца на ноч зялёныя партфелі перапісчыкаў з запоўненымі бланкамі.

Першы дзень папярэдняга перапісу я сустрэла не ў поўнай амуніцыі. На наш інструктарскі ўчастак было выдзелена тры флікеры, адзін ліхтарык і свісток. Як усё гэта дабро падзяліць паміж пяццю перапісчыцамі, ніхто не ведаў. Не хапала таксама і беларускамоўных бланкаў. Мне іх выдалі толькі два. Праўда, пасля тэлефанаванняў у Нацыянальны статыстычны камітэт бланкі ўсё ж з'явіліся.

Мой участак — дом № 4 па вуліцы Сердзіча. Доўгі салатавы пяціпавярховы будынак. Сем пад'ездаў і 115 кватэр — фронт працы на найбліжэйшы тыдзень.

— Наш дом — той яшчэ дом, — «узрадавала» жанчына з другога пад'езда. — Тут столькі алкаголікаў і бамжоў.

Дарэчы, бамжоў я таксама павінна перапісваць. Аднак расштурхаць мужчыну, які спаў на лаўцы каля трэцяга пад'езда, я так і не вырашылася. Ад яго несла перагарам за некалькі дзясяткаў метраў.

Паколькі асноўная маса людзей прыходзіла дамоў пад вечар, шчыра прызнаюся, хадзіць па пад'ездах у прыцемках было даволі страшна. І той факт, што цябе застрахавалі, не асабліва суцяшаў.

Людзі прымалі перапісчыка ў абсалютнай пераважнасці добра, запрашалі на гарбату, расказвалі пра жыццё. Але ў 24 кватэрах мне не адчынілі ўвогуле. Былі і катэгарычныя адмовы.

— Я не хачу ўдзельнічаць у гэтым перапісе! — крычаў, перагнуўшыся цераз парэнчы, мужчына ў спартовых штанах. — І нават не заходзьце да мяне.

ПРА ПАСВЕДЧАННЕ СПЫТАЛІ ТОЛЬКІ ТРЫ ЧАЛАВЕКІ

— Добры дзень, перапіс насельніцтва, — кажу я завучаную фразу (часам мне падаецца, што я яе ў сне паўтараць пачну).

— Пасведчанне ваша можна? — з парога спытаў падцягнуты мужчына ў чорных джынсах і вадалазцы.

Я працягнула паперку, мужчына прынёс з суседняга пакоя лупу і пачаў праз яе разглядаць дакумент.

Дарэчы, нягледзячы на ўсе папярэджанні і апісанне выпадкаў крадзяжу лжэперапісчыкамі, пасведчанне ў мяне папрасілі толькі тры чалавекі. У асноўным людзі, бачачы заплечнік і значок на адзенні, адчынялі і запрашалі зайсці.

Добра гэта ці дрэнна, не ведаю.

Адноўлы ўзнікла пытанне і наконт канфідэнцыйнасці.

Мужчына каля 50 у цяльняшцы і з татуіроўкай «Афганістан», перш чым я пачала пісаць, пацікавіўся, ці гарантую я канфідэнцыйнасць.

— Я ведаю, што вы падпісвалі паперу аб нераспаўсюджанні інфармацыі. Таму я магу спадзявацца, што ні мае суседзі, ні хто іншы пра гэта не даведаюцца? — занепакоена спытаў ён.

Я запэўніла мужчыну, што насамрэч падпісала паперу. І акрамя мяне ніхто не даведаецца ні пра яго адукацыю, ні пра родную мову і г.д.

Так што, дарагія чытачы, вы ўжо прабачце, але ніякіх імёнаў, а тым больш нумароў кватэр у гэтым матэрыяле не знойдзеце.

«ГЭТА ШТО — ВОПІС МАЁМАСЦІ?»

Менавіта такую рэакцыю выклікалі ў некаторых пытанні наконт плошчы кватэры, каналізацыі і водаправода.

...Другі пад'езд. Мяне сустракае жанчына гадоў сарака пяці і яе дарослы сын. Мы праходзім у пакой, дзе маленькая дзяўчынка гуляе на камп'ютары.

— Плошча вашай кватэры? Ці прыватызаваная яна? Ці ёсць яшчэ якое-небудзь жыллё ва ўласнасці? — задаю пытанні.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Слухайце, што гэта такое? — абурэецца жанчына. — Навошта такія пытанні? Каму якая розніца, што ў мяне ёсць, а чаго няма?

— Камп'ютар ёсць? — гляджу ў вочы жанчыне.

— Гэта вопіс маёмасці ці перапіс насельніцтва? — ускрыквае жанчына.— Няма! — адказвае яна і абурана ўсклікае: — Давайце перапішам мой халадзільнік, а яшчэ патэльню!

Пажылая пара, якая папрасіла перапісацца ў пад'ездзе, на пытанне пра камп'ютар засмяялася.

— А давайце кухонныя камбайны перапісваць, — рагатаў мужчына.

— Не, лепш мясарубкі, — залівалася яго жонка.

— У нас вунь капітальны рамонт ніяк не могуць зрабіць, а вы пра каналізацыю і гарачую ваду пытаецеся, — абураюцца жыхары.

Пытанне пра членаў домагаспадаркі выклікае зусім нечаканыя адказы.

— Я прыходжу ў адну кватэру і пытаю: хто ў вас пражывае, — расказвае мая калега Ларыса. — Мужчына называе сваё імя, прозвішча, пасля маці, пасля яшчэ адно. Я ўсё гэта пішу. «Апошні хто?» — пытаюся. «Сабака», — без аніякай сарамлівасці адказвае ён.

РОДНАЯ МОВА — ТРАСЯНКА?

Наконт мовы ў перапісе ёсць цэлыя два пытанні. Гэта — «ваша родная мова» і «на якой мове вы размаўляеце дома».

— Ваша нацыянальнасць? — пытаю я саракадвухгадовага мужчыну ў шэрым швэдары.

— Беларус.

— Родная мова?

— Беларуская.

— На якой мове размаўляеце дома?

— Гм... На рускай — чырванее мужчына, — хоць, пішыце на трасянцы, як і ўсе.

Прыведзены дыялог — гэта стандартны дыялог у большасці кватэр. Роднай мовай беларускую лічыць большая частка жыхароў дома чатыры па вуліцы Сердзіча, аднак размаўляюць, у асноўным, па-руску ці на трасянцы. І самае цікавае, што людзі вельмі няёмка сябе адчуваюць, калі роднай мовай прызнаюць беларускую, а дома размаўляюць па-руску. Многія тады пачынаюць апраўдвацца.

— Мы ў школе яе не вучылі, — тлумачыць пяцідзесяцігадовая жанчына з другога пад'езда, — а дзе было яе больш вучыць і чуць?

— Вы ведаеце, я вельмі люблю сваю родную мову, — кажа працаўніца хлебазавода, — але вось неабходнасці ў ёй цяпер няма. Каб уся дакументацыя вялася па-беларуску, то тады, безумоўна, статус беларускай мовы падняўся б. Вось прыбалты ж здаюць экзамен на веданне роднай мовы. А ў нас што? Талерантнасць? Не, гэта прахадны двор, а не талерантнасць.

«ДЗЕ ПРАЦУЮ, НЕ СКАЖУ»

Блок пытанняў аб працы нярэдка выклікае не меншае абурэнне, чым пытанні пра кватэру.

— Што за незразумелыя пытанні аб працы? Дзе хачу, там і працую, што, ужо і гэта забаронена? — раздражняецца трыццацігадовы мужчына.

Больш за ўсё не разумеюць рэспандэнты пытання «Якую прадукцыю выпускае ці якія паслугі робіць прадпрыемства, дзе вы працуеце».

— Пішыце «харавая дзейнасць», — кажа жонка спевака філармоніі. — А што? Якое пытанне, такі і адказ.

— Сабе працую, — адказваю я.

— Ну, гэта ўжо нешта, — задаволена кажа жанчына. — Пішыце, што сабе.

Так на пытанне пра шлюб адказаў чарнавалосы мужчына.

— А што? Няпраўда? — усміхаецца ён. — Кажуць, калі жонка патрапіцца добрая, будзеш жыць шчасліва, калі дрэнная — станеш філосафам.

Жанчын на маім участку было шмат. Прычым большасць незамужніх і бяздзетных. Гаварыць пра шлюб з імі бывае вельмі цяжка.

— Я ніколі не была замужам, — адказвае адна жанчына, — а дзе знойдзеш таго адзінага?

— Няма ў мяне дзяцей, — усхліпвае другая, — неяк не пашчасціла.

«ГЭТА ЛІЧЫЦЦА?»

Дзверы мне адчыніла жанчына, якая не магла гаварыць. Дзякуй Богу, да яе ў госці прыехала сяброўка. Напрыканцы я задаю пытанне, ці ёсць у яе дзеці. Жанчына захрыпела і хутка выйшла на балкон. Адтуль пачуліся ўсхліпы.

— У яе адзіны сын памёр нядаўна. Яна з-за гэтага і захварэла, нават размаўляць не можа, — расказала сяброўка.

Аналагічнае пытанне на нашым стацыянарным участку дзяўчаты задалі маладой жанчыне.

— У мяне было тры выкідышы. Гэта лічыцца? — ледзь не ў істэрыцы спытала жанчына.

Яшчэ адзін праблемны момант — пытанні пра нябожчыкаў. Па правілах, усіх памерлых пасля 14 кастрычніка перапісчыкі павінны запісаць жывымі. І псіхалагічна цяжка распытваць у блізкіх пра нябожчыка.

КРЫЗІС І ПЕРАПІС

Наконт самага перапісу людзі выказваюцца па-рознаму. Большасць лічыць, што краіне патрэбна ведаць, колькі чалавек у ёй пражывае.

Некаторыя сыходзяцца на тым, што з перапісам Беларусі можна было пачакаць.

— Крызіс у свеце, а мы перапіс праводзім, — кажа жанчына з трэцяга пад'езда.

— Ды навошта гэты перапіс, усё адно ніхто нічога не скажа — наконт кватэр ці месца працы, — кажа мужчына з чацвёртага пад'езда.

— Гэта агульнасусветная практыка, — кажа дзядуля ў сінім паліто. — Дзяржаве трэба ведаць, якія працэсы ў ёй адбываюцца...

СПАЖЫВЕЦКАЯ КААПЕРАЦЫЯ ГАТОВАЯ ЗАПЛАЦІЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВУ ЗА 1—1,5 ТЫСЯЧЫ ТОН ЗДАДЗЕНЫХ ГРЫБОЎ 8—10 МІЛЬЯРДАЎ РУБЛЁЎ

НА сёння гародніна ў краіне ўбраная ўжо на 67 працэнтах пасадачных плошчаў, у тым ліку капуста — на 33 працэнтах плошчаў, буракі — на 66 працэнтах, морква — на 54 працэнтах, цыбуля — практычна на ўсіх пасадачных плошчах. Што датычыцца ўраджайнасці, дык сёлета па капусце яна вышэйшая за сярэднюю ў краіне па Гомельскай і Магілёўскай абласцях, па бураках — па Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай, па моркве — па Гомельскай, Гродзенскай, Магілёўскай, па цыбулі — па Віцебскай, Гомельскай і Гродзенскай абласцях. Сёлета з-за неспрыяльных умоў надвор'я 3,3 тысячы гектараў гародніны загінула, адпаведна, колькасць уборачных плошчаў зменшылася. Уборка яблыкаў яшчэ працягваецца, пакуль жа іх сабрана 34 тысячы тон. Усяго ў стабілізацыйныя фонды на міжсезонны перыяд павінна быць закладзена 64,5 тысячы тон гародніны і 10 тысяч тон садавіны, прычым, па Брэсцкай вобласці план закладкі па садавіне ўжо цалкам выкананы, паведаміла на «круглым стале» ў прэс-цэнтры Дома прэсы галоўны аграном аддзела па вытворчасці і гандлі плодаагароднінай прадукцыяй Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Таццяна ГУМЯНЮК.

Для патрэбаў перапрацоўчай галіны (а гэта 102 арганізацыі, 41 з якіх займаецца нарыхтоўкай і перапрацоўкай пладова-ягаднай сыравіны і 61 — вытворчасцю пладова-ягадных вінаў) нарыхтавана 172,6 тысячы тон пладова-ягаднай сыравіны і 30 тысяч тон гародніны. Патрэбы ў пладова-ягаднай сыравіне задаволеныя на сёння на 75 працэнтаў, прыкладна на столькі ж — у сыравіне гародніны. Для вінаробства нарыхтавана 80 працэнтаў патрэбнай сыравіны, для кансервавання патрэбы задаволеныя пакуль на 70 працэнтаў. У апошнім выпадку ёсць аб'ектыўныя прычыны — сыравіна павінна выспець. А калі гаварыць пра вінаробства, дык, у адпаведнасці з зацверджанай праграмай, запланавана штогадовае зніжэнне аб'ёмаў нарыхтовак сыравіны для вытворчасці пладовых вінаў на 10 працэнтаў, з паралельным павелічэннем вытворчасці вінаў палепшанай якасці, расказала журналістам **начальнік аддзела плодаагароднінай і крухмалапатачнай галінаў Беларускага дзяржаўнага канцэрна харчовай прамысловасці «Белдзяржхарчпрам» Марына ДАЙНЯК**. Сёлета быў зменены і ўдакладнены асартымент прадукцыі, якая выпускаецца. Напрыклад, летась у цэлым па краіне былі спажытыя 22 мільёны ўмоўных слоікаў кансерваваных агуркоў, а сёлета было выраблена такіх кансерваў 23,1 мільёна ўмоўных слоікаў, што практычна цалкам пакрывае патрэбы краіны. Значна павялічыўся выпуск імпартазамяшчальных плодаагароднінных кансерваў, тых жа кансерваваных марынаваных таматаў. Іх было выраблена 5,1 мільёна ўмоўных слоікаў, што, праўда, пакуль забяспечвае патрэбы краіны толькі на 35—40 працэнтаў. Але і таматы ў нас растуць не ва ўсіх абласцях.

— Сёлета паспяхова працуюць па вытворчасці кансерваў з кукурузы Тураўскі завод, да якога далучыліся яшчэ два прадпрыемствы — з Глыбокага і прыватнае замежнае. Тураўскі завод у параўнанні з мінулым годам павялічыў выпуск такіх кансерваў у пяць разоў, — паведаміла далей Марына Платонаўна.

Выпускам дзіцячага харчавання ў краіне займаюцца тры прадпрыемствы. За дзевяць месяцаў гэтага года яны засвоілі каля 30 новых найменняў прадукцыі.

— Нарыхтоўка сельскагаспадарчай прадукцыі і сыравіны вядзецца ў асноўным ад насельніцтва. Такім чынам мы выконваем і сацыяльна-эканамічную задачу па садзейнічанні павелічэнню росту даходаў сельскіх жыхароў. І мы яе рашаем: за дзевяць месяцаў года ў насельніцтва закуплена прадукцыі на 145 мільярдаў рублёў, што на 17 працэнтаў больш за леташні паказчык. Усе апошнія чатыры гады гэты паказчык стабільна павялічваецца, — распавёў **начальнік упраўлення нарыхтовак Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў «Белкаапсаюз» Уладзімір ГАПАНОВІЧ**.

Паводле яго слоў, сёлета ўжо нарыхтавана 115 тысяч тон яблыкаў, што на 7 працэнтаў больш, чым летась на тую ж дату. «Гэта пры тым, што сёлета меншая ўраджайнасць. Будзем імкнуцца дасягнуць мінулагодняга паказчыка ў 121 тысячу тон, аднак трэба ўлічваць, што сезон ужо заканчваецца».

— Сёлета мы нарыхтавалі найбольшы аб'ём чарніц ад насельніцтва за ўсю гісторыю існавання спажывецкай каапэрацыі. І гэта пры тым, што цэны на еўрапейскім рынку ўпалі практычна на 50 працэнтаў. Дасягнулі паказчыка ў 4 700 тон. Але рэзервы ёсць, мы ведаем, як трэба працаваць, каб павялічыць гэты аб'ём, — сказаў далей Уладзімір Уралавіч. — Нарыхтавана капусты амаль 7 тысяч тон, што на 26 працэнтаў больш за леташнюю лічбу, 2,8 тысячы тон таматаў, або на 142 працэнты больш, чым у мінулым годзе, морквы — 1,8 тысячы тон, што больш на 26 працэнтаў, чорных парэчак — 2 тысячы тон, або на 21 працэнт болей. Грыбоў пакуль нарыхтавалі 300 тон, гэта ў два разы больш, чым летась. Але гэты паказчык нас не можа задавальняць. Чаму? Мы можам нарыхтоўваць разоў у пяць больш — не меней. Чаму гэтага ўжо не адбылося? Восень гэта не вельмі спрыяльная для грыбоў. А грыбоў трэба нарыхтоўваць больш, таму што мы бачым на прылаўках шмат імпартнай прадукцыі з Польшчы, Расіі, Германіі. А ў краіне грыбы ёсць. Дзе спажывецкай каапэрацыі не праблема нарыхтоўваць 1—1,5 тысячы тон грыбоў. Для насельніцтва гэта 8—10 мільярдаў рублёў дадаткова да іх бюджэту. Гэта таксама вельмі важна.

Як і іншыя выступоўцы, Уладзімір Гапановіч адзначыў сёлетнюю праблему з нізкім ураджаем бульбы.

— Мяркуецца, што попыт на бульбу ў міжсезонны перыяд будзе высокім і яна будзе запатрабаваная на ўнутраным рынку. На жаль, цана, што склалася на бульбу ў краіне, робіць яе неканкурэнтаздольнай на рынку Расіі, мы пакуль не можам прадаць туды ніводнага кілаграма. Нас гэта не вельмі турбуе, хоць эксперт, валюта патрэбныя. Паўтаруся, попыт у міжсезонны перыяд на бульбу будзе высокім, і мы будзем прадаваць яе ў сваёй рознічнай сетцы. Ужо зараз мы актыўна прадаём бульбу на кірмашах, распродажах, і прадукцыя гэта рэалізуецца добра.

Гаворачы пра нарыхтоўку журавін, прадстаўнік Белкаапсаюза адзначыў, што летась па гэтай ягадзе быў пастаўлены своеасаблівы рэкорд нарыхтоўкі — амаль 2,5 тысячы тон. Сёлета ж пакуль закуплена ад насельніцтва 1 080 тон. І не таму, што ўраджай дрэнны, ён якраз дастатковы, як адзначыў выступоўца. «Гэтая ягада не настолькі запатрабаваная на знешнім рынку, як чарніцы, асабліва ў Еўропе. Густы астатніх еўрапейцаў крыху іншыя, чым у славян, яны не зусім адаптаваныя да журавін. І цана ў Еўропе, трэба сказаць, зараз надзвычай нізкая — усяго толькі 80 еўрацэнтаў, гэта 3 600 рублёў. А летась мы людзям плацілі 5—5,5 тысячы рублёў за кілаграм. Сёлета ж мы не можам прадаць гэту ягаду даражэй, чым 3,5 тысячы рублёў. Таму і вядзём нарыхтоўку па 2—2,5 тысячы рублёў у залежнасці ад рэгіёна. Пакуль насельніцтва не надта актыўна здае ягаду. Той, хто традыцыйна займаецца зборам журавін, сабралі ягады — а яны добра захоўваюцца — і чакаюць павелічэння цаны. Мушу сказаць, што ніякіх перадумоў для такога павелічэння цаны няма, таму я заклікаў бы насельніцтва збіраць і здаваць журавіны ў сезон. Гэта не наша прыхамаць, цану дыктуе рынак».

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО КОНКУРСА

Открытый конкурс (далее — конкурс) по продаже объектов коммунальной собственности г. Минска и на право заключения договора аренды земельного участка для их обслуживания **состоится 4 декабря 2009 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. № 310.**

Продавец и организатор конкурса: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, тел. (8017) 200 20 89, каб. 227. **На конкурс выставляются:**

№ лота		лот № 1	лот № 2
Предмет конкурса		Структурное подразделение КУП «Бытэкс» (прачечная самообслуживания) и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания	Структурное подразделение ПТ КУП «Чайка» (прачечная самообслуживания) и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания
Место нахождения недвижимого имущества		г. Минск, пер. Северный, 17	г. Минск, ул. Пожарского, 27
Начальная цена предмета конкурса, руб.		2 365 962 000 белорусских рублей (в том числе: структурное подразделение – 1 101 438 606 белорусских рублей; право заключения договора аренды земельного участка – 1 264 523 394 белорусских рубля)	1 971 185 000 белорусских рублей (в том числе: структурное подразделение – 1 096 619 453 белорусских рубля; право заключения договора аренды земельного участка – 874 565 547 белорусских рублей)
Размер задатка (рублей), срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета		236 596 200 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в конкурсе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества	197 118 500 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в конкурсе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества
Информация о земельном участке для обслуживания недвижимого имущества и условия его использования		Общая площадь – 0,2802 га, кадастровый номер – 500000000005003883, отведен для дальнейшего использования под общественную функцию	Общая площадь – 0,2615 га, кадастровый номер – 500000000002002193, отведен для дальнейшего использования под общественную функцию
Арендодатель земельного участка и срок аренды		Минский городской исполнительный комитет, срок аренды – 56 лет	Минский городской исполнительный комитет, срок аренды – 63 года
Информация о недвижимом имуществе		Здание (прачечная) специализированное для бытового обслуживания населения (инвентарный номер 500/С – 28281); здание (котельная) специализированное энергетики (инвентарный номер 500/С - 28143)	Здание (прачечная) специализированное для бытового обслуживания населения (инвентарный номер 500/С – 30793); здание (котельная) специализированное коммунального хозяйства (инвентарный номер 500/С – 30792)
Условия проведения конкурса		1. организация физкультурно-оздоровительного комплекса; 2. сохранение числа рабочих мест сроком на 2 года (с продлением трудовых отношений с работниками структурного подразделения); 3. погашение новым собственником кредиторской задолженности на момент подписания акта приема-передачи; 4. заключение новым собственником договора безвозмездного пользования имуществом, находящимся в коммунальной собственности г. Минска, на объект инженерной инфраструктуры общего пользования (зеленые насаждения) с Управлением бытового обслуживания населения Мингорисполкома	1. частичное сохранение профиля объекта*; 2. сохранение числа рабочих мест сроком на 2 года (с продлением трудовых отношений с работниками структурного подразделения); 3. погашение новым собственником кредиторской задолженности на момент подписания акта приема-передачи
Приоритетное условие для определения победителя конкурса		наивысшая цена предмета конкурса	наивысшая цена предмета конкурса
Численность работающих, человек		14	8
Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий		нет	нет
Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов (патенты, торговые знаки и другие)		нет	нет
Финансовое состояние структурного подразделения по состоянию на 01.04.2009	Активы по балансу, рублей	1 116 068 689	1 106 435 210
	Задолженность кредиторская, рублей	14 261 575	9 815 956

* - по согласованию с Управлением бытового обслуживания населения Мингорисполкома и администрацией Заводского района г. Минска.

Порядок проведения конкурса осуществляется в соответствии с Положением о проведении конкурсов по продаже объектов коммунальной собственности города Минска и права на заключение договора аренды нежилого помещения, утвержденным решением Минского городского исполнительного комитета от 3 декабря 2002 г. № 1740 и Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

К участию в конкурсе допускаются: граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное местожительство за границей, и лица без гражданства), представившие Организатору конкурса в сроки, указанные в извещении на участие в конкурсе, следующие документы:

заявление на участие в конкурсе по установленной форме;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка в белорусских рублях на расчетный счет, указанный в извещении;

предложения в письменной форме по выполнению условий конкурса, в том числе и по выполнению приоритетного условия, подписанные участником и заверенные печатью, запечатанные в отдельном конверте, который передается участником конкурса в конкурсную комиссию в день и час проведения конкурса, опубликованные в извещении о проведении торгов;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающую государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в конкурсе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителям заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в конкурсе заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Продавец (организатор конкурса) вправе отказаться от проведения конкурса в любое время, но не позднее чем за 30 дней до даты его проведения. Объект может быть снят с торгов по решению Продавца (организатора конкурса), конкурсной комиссии в любое время до объявления объекта проданным.

Заявления на участие в конкурсе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227 – по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 3 декабря 2009 года включительно, конт.тел. (8017) 200 20 89.

В случае, если предложения двух и более участников полностью соответствуют условиям конкурса, конкурсная комиссия определяет победителем того участника, который представил наилучшие предложения по приоритетному условию, опубликованному в извещении, что фиксируется в протоколе конкурса. Если и в этом случае невозможно определить победителя конкурса, то победителем признается участник, предложивший наивысшую цену.

В случае, если конкурс признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником и соответствии его предложений условиям конкурса (далее – претендент на покупку), предмет конкурса продается этому участнику на предложенных им условиях.

Минский горисполком в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах конкурса по продаже предмета конкурса принимает решение о предоставлении земельного участка победителю конкурса (претенденту на покупку). Победитель конкурса (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (в случае предоставления рассрочки ее внесения – часть платы) и возместить затраты на организацию и проведение конкурса, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении земельного участка. Размер, порядок и сроки возмещения затрат доводятся до сведения участников до начала проведения конкурса. Условия и порядок предоставления рассрочки внесения платы за объект приватизации определены постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 5 сентября 2009 г. № 36, а за право заключения договора аренды земельного участка определены решением Минского горисполкома от 30 апреля 2009 г. № 1015.

Победитель конкурса (претендент на покупку) в течение одного рабочего дня со дня оплаты должен представить копии платежных документов, названных выше, Продавцу (организатору конкурса), после чего, не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями конкурса Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Минским горисполкомом – договор аренды земельного участка. Оплата за предмет конкурса производится в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи.

Осмотр объекта на местности участниками конкурса производится представителем Управления бытового обслуживания населения Мингорисполкома, конт. тел. (8017) 227 21 60.

Кітай гаворыць... па-беларуску!

ПРАДСТАЎНІКІ Міжнароднага радыё Кітая прэзентавалі ў Мінску беларускамоўны сайт, створаны ў межах партала CRI-он-лайн — belarusian.cri.cn. Акрамя таго, МРК і Белтэлерадыёкампанія падпісалі пратакол намераў аб супрацоўніцтве ў інтэрнэце, які прадугледжвае абмен спасылкамі на сайты, абмен інфармацыяй і аўдыёпраграмамі, абмен супрацоўнікамі, а таксама сумесныя мерапрыемствы па культурным абмене паміж Беларуссю і Кітаем.

Міжнароднае радыё Кітая — адзінае ў КНР дзяржаўнае радыё, якое вяшчае на замежжа больш як на 50 мовах і мае 30 карпунктаў у розных краінах свету. Інтэрнэт-сайт CRI-Online, якому крыху больш за 10 гадоў, яшчэ больш разнастайны — сёння на ім змяшчаюцца матэрыялы на 59 мовах. Сайт на рускай быў афіцыйна запушчаны ў снежні 1999 года, але гэтым рэдакцыя не абмежавалася — і 23 верасня гэтага года запусціла тэставую версію беларускамоўнага сайта. Яго наведвальнікам прапаноўваюцца не толькі навіны з сучаснага жыцця Кітая, але і інфармацыя пра яго гісторыю і культуру, традыцыі і турыстычны патэнцыял. Ахвотныя могуць бліжэй пазнаёміцца з кітайскай кухняй, навучыцца пісаць іерогліфы і ўзяць віртуальныя ўрокі кітайскай мовы, паслухаць папулярную і класічную музыку... «Наша мэта — пазнаёміць бліжэй свет з Кітаем, а Кітай са светам, зрабіць сябрамі людзей з розных краін. Спадзяёмся, што беларускамоўны сайт будзе выконваць ролю моста і садзейнічаць развіццю двухбаковых стасункаў паміж Беларуссю і Кітаем. Абедзвюм краінам трэба атрымліваць больш інфармацыі адна пра адну», — адзначыў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі Лу Гуйчэн.

— Мы былі вельмі ўражаныя тым, што кітайскі бок выказаў жаданне стварыць сайт на беларускай мове, бо нават не ўсе беларускія СМІ яго маюць, а тут за гэта ўзяўся адзін з найбуйнейшых міжнародных вяшчальнікаў, — падзяліўся старшыня Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр Зімоўскі. — Наколькі я ведаю, збольшага гэта была ініцыятыва кітайскага боку, і яны правялі асноўную падрыхтоўку самастойна, наша дапамога мела хутчэй кансультацыйны характар.

— Сайт — гэта толькі пачатак нашай сумеснай работы, — дадаў дырэктар радыёстанцыі «Беларусь» Навум Гальпяровіч. — Па папярэдняй дамове з кітайскім бокам, супрацоўнікі Беларускага радыё будуць працаваць на працягу года ў КНР і дапамагаць там арганізоўваць вяшчанне і сайт на беларускай мове. Прадстаўнікі абодвух бакоў многа гаварылі аб перспектывах сумеснага інтэрнэт-вяшчання — думаю, на сёння гэта вельмі актуальная задача, і нам ёсць чаму павучыцца ў кітайскіх калег.

Праўда, да пытання, ці з'явіцца ў якасці ветлівасці ў адказ кітайскамоўная версія, напрыклад, у сайта радыёстанцыі «Беларусь», што вяшчае на замежжа, афіцыйныя асобы падыходзяць асцярожна, хоць і не выключаюць такой магчымасці ў будучыні. «У нас ужо ёсць маленькія носьбіты кітайскай мовы — напрыклад, навучэнцы 23-й сталічнай гімназіі. І калі яны пасталеюць і будуць вучыцца на журфаку, мы будзем рады бачыць іх на кітайскамоўных версіях нашых сайтаў», — мяркуе Аляксандр Зімоўскі.

Што да перспектыў далейшага супрацоўніцтва, яны выходзяць за межы інтэрнэта. Неўзабаве БТРК мае намер паўдзельнічаць у стварэнні рускамоўнага тэлеканала на кітайскім тэлебачанні — кітайскі бок ужо звяртаўся па рэкамендацыі наконт таго, якія журналісты маглі б на некалькі месяцаў паехаць у Кітай папрацаваць у інфармацыйнай службе.

Дарэчы, убачыць Кітай на свае вочы — такая магчымасць ёсць не толькі ў журналістаў. Міжнароднае радыё Кітая, Белтэлерадыёкампанія і Пасольства КНР у Беларусі абвясцілі сумесны конкурс ведаў пра Кітай, пераможца якога атрымае спецыяльны падарунак — білет Мінск—Пекін—Мінск і бясплатную экскурсію па краіне. Умовы конкурсу ў найбліжэйшы час будуць змешчаныя на беларускамоўным сайце МРК. Так што — Ni hao*, Кітай!

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

* Ni hao! (ні хао!) — «Прывітанне!»

ДАРОЖНІКІ ЗАЎЖДЫ НА ВЫШЫНІ

Калектыў камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскаблдарбуд» паспяхова спраўляецца з самымі сур'ёзнымі задачамі

У кожнай краіны, зразумела, ёсць свае адметнасці, якія адрозніваюць яе ад іншых. Гэта і асаблівасці побыту, культуры, мовы, а яшчэ прыродныя ўмовы. Да такіх важных момантаў, безумоўна, можна аднесці таксама знешняе аблічча населеных пунктаў — гарадоў, пасёлкаў, даволі вялікіх і нават зусім маленечкіх вёсак. Аблічча тых ці іншых мясцін разам вызначае агульны імідж дзяржавы, усё тое, пра што замежныя турысты будуць узгадваць, калі вернуцца дадому. Нездарма ж кожная краіна ў гэтым сэнсе заўсёды імкнецца быць індывідуальнай, адметнай і прывабнай як для месцічаў, так і для гасцей. Год роднай зямлі, які сёлета аб'яўлены ў Беларусі, вызначае стаўленне да такой надзвычай важнай і актуальнай праблематыкі ў нашай краіне. Гэта не толькі захаванне гістарычнай спадчыны (што, вядома ж, адносіцца да ліку асноўных дзяржаўных прыярытэтаў), але і добраўпарадкаванне, прафесійны падыход да планіроўкі населеных пунктаў, асобных аб'ектаў вытворчай і сацыяльнай сферы.

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ, КАЛЕГІ!

Ад усёй душы віншую ўсіх вас з надыходным прафесійным святам.

Сёння мы падводзім вынікі сваёй працы, узгадваем творчыя перамогі, будуем планы на будучыню. Няхай усё тое, што намечана, абавязкова здзейсніцца, няхай нам шчасціць у сямейным коле і на прафесійнай ніве, няхай здзейсняцца ўсе самыя запаветныя мары! Шчыра зычу вам, вашым родным і блізкім шчасця, здароўя, удачы і больш падстаў для усмешак, чым для расчаравanняў.

Генеральны дырэктар КУП «Віцебскаблдарбуд» Валерый ЛАППО.

Пры гэтым заўсёды ў цэнтры ўвагі — развіццё сеткі дарог. Без надзейных магістраляў цяжка сабе ўявіць дынамічнае развіццё народнагаспадарчага комплексу. Прычым гэта датычыцца як вялікіх трас (неабходна памятаць пра значныя транзітныя магчымасці нашай дзяржавы, якія прыносяць адчувальныя даходы), так і сеткі мясцовых дарог. Прыярытэтнае развіццё адпаведнай галіны мае вялікі сэнс, паколькі такія ўкладанні — сапраўдныя інвестыцыі ў будучыню, пра што нельга забываць.

Беларусь тут у лепшы бок адрозніваецца на постсавецкай прасторы. Аднак немагчыма спыняцца на дасягнутым, паколькі дарогі заўжды патрабуюць належнага догляду. Спецыялісты з трывогай адзначаюць, што апошнім часам сітуацыя не з лепшых: рамонт сеткі адбываецца не ў тых памерах, як тое належыць. Зразумела, прадпрыемствы дарожнай галіны не сядзяць склаўшы рукі, а шукаюць аптымальнае выйсце нават з самага складанага становішча. Адбываецца тэхнічнае пераўзбраенне, укараняюцца найноўшыя тэхналогіі, што дазваляе змяншаць затраты. Таму можна быць упэўненымі: работы выконваюцца якасна і надзейна. Зрэшты, у гэтым пераканаліся, калі ў чарговы раз завіталі на камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Віцебскаблдарбуд». Летась тут адзначалі 70-годдзе з дня ўтварэння. Да юбілейнай даты калектыў падышоў з вялікімі здабыткамі, заваяваў заслужаны аўтарытэт сярод калег і шматлікіх заказчыкаў. Але якая сітуацыя сёлета, як «Віцебскаблдарбуд» адчувае сябе ў даволі складаныя часы? Гэта мы і паспрабавалі высветліць.

Вопыт дарожнікаў Віцебшчыны вельмі важны не толькі для прадпрыемстваў галіны, але і для суб'ектаў гаспадарання іншых сфераў дзейнасці. Паколькі поспех у эканоміцы складаецца агульнымі намаганнямі. І варта звяртаць увагу на лепшыя прыклады і імкнуцца ўкараняць карысны вопыт, адказнае стаўленне да выканання сваёй працы. Толькі такім чынам магчыма дасягнуць станоўчых вынікаў. Таму мы так пільна сочым за дасягненнямі «Віцебскаблдарбуда». Прызнаемся шчыра: у кожнай з паездак сюды ўдаецца адшукаць нешта новае, неардынарнае. Так, дарэчы, адбылося і на гэты раз...

Сярод буйных аб'ектаў віцебскіх дарожнікаў — тэрыторыя, прылеглая да медыцынскага гарадка ў абласным цэнтры. Тут аб'ектыў убачыў за работай дарожнага майстра Яўгена МЫЧКОВА, майстра Юрыя АНДРУШЫНА з машыністам бульдозера Мікалаем МАТРОСАВЫМ і вадзіцелем катка Уладзімірам ЮДЭНКАМ, засняў будаўніцтва аўтадарогі, якая стане адной з самых шырокіх у горадзе.

У прафесіяналаў праца ладзіцца

Сетка мясцовых аўтамабільных дарог, якая абслугоўваецца камунальным унітарным прадпрыемствам «Віцебскаблдарбуд», даволі вялікая — агульная працягласць складае больш чым 14,5 тысячы кіламетраў. Пагадзіцеся, лічба сапраўды ўражвае. Адчуванне ўзмацняе той факт, што адпаведны кіламетраж — больш чым трэцяя частка экватара. І кожны ўчастак патрабуе пастаяннага догляду і ўвагі. Гэта штодзённая карпатлівая праца вялікага калектыву «Віцебскаблдарбуда». Мяркуючы па стане мясцовых дарог Віцебшчыны справа сапраўды ў надзейных руках прафесіяналаў.

— Сетка мясцовых дарог з кожным годам павялічваецца: сёлета мы ўжо прынялі на абслугоўванне 100 кіламетраў, а ў найбліжэйшы час — яшчэ 300 км, — заўважае генеральны дырэктар камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскаблдарбуд» Валерый Лаппо. — Вядома ж, справа заўсёды ладзіцца, калі ёй займаюцца прафесіяналы. Кожны работнік на сваім участку стварае агульны вынік, усім неабходна імкнуцца да таго, каб выканаць даручанае як мага лепш. Аб'ём работ даволі вялікі. Прывяду такія лічбы: у Віцебскай вобласці больш чым 6 тысяч населеных пунктаў. Зразумела, ёсць вёскі, дзе засталіся па 1-2 двары, а таксама аддаленыя хутары. Але паўсюль жывуць людзі і неабходна забяспечыць праезд. Зразумела, нельга бяздумна выкарыстоўваць сродкі, таму ў кожным канкрэтным выпадку павінна быць сваё адэкватнае рашэнне наконт дарогі. Безумоўна, узнікаюць цяжкасці ўвосень ці ўвесну. Але гэтыя надзённыя пытанні своечасова вырашаюцца ў рабочым парадку, паколькі яны пад жорсткім кантролем. Людзі разумеюць узровень адказнасці і сур'ёзна ставяцца да выканання сваіх абавязкаў. Давайце будзем выходзіць з таго, што дарогі — дзяржаўны прыярытэт. Менавіта на гэтым неабходна будаваць усю дзейнасць.

Камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Віцебскаблдарбуд» разам з усімі сёлета адчула пэўныя цяжкасці: зменшыліся аб'ёмы фінансавання. Аднак, нягледзячы на гэта, усе аб'екты, якія запланаваны на гэты год, паспяхова выконваюцца. На працягу студзеня—верасня асвоена 116,1 мільярда рублёў. З іх больш чым палова (54 працэнты) — на дарогах агульнагаспадарчага значэння.

2,3 млрд рублёў выкарыстана на будаўніцтва і рэканструкцыю транспартнай сеткі. З пачатку года ўведзена ў эксплуатацыю 4,7 кіламетра аўтадарог і 41,7 пагоннага метра мастоў. Асноўны аб'ём па дарогах быў выкананы ў Лепельскім раёне. А на Глыбоччыне пабудаваны два масты: адзін на пад'ездзе да вёскі Лучайка, а таксама праз рэчку Бярозаўка.

Пасля капітальнага рамонту ўведзена 7,7 кіламетра аўтамабільных дарог: 5,1 км — у Пастаўскім раёне і 2,6 км — у Сенненскім. На правядзенне работ па бягучым рамонце асвоена 25,7 мільярда рублёў — уведзена 183,9 кіламетра дарог і 93 пагонныя метры мастоў. Усе гэтыя лічбы яскрава адлюстроўваюць дынаміку развіцця камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскаблдарбуд», дзе заўжды імкнуцца такім чынам выканаць работы, каб узмацніць дзелавы імідж і пацвердзіць аўтарытэт.

Як заўважыў начальнік Віцебскага ДРБУ № 144 Юрый Жураўскі, тут пастаянна імкнуцца нарошчваць аб'ёмы работ. Пакуль што паспяхова ўдаецца ісці на ўзроўні мінулага года. Так атрымліваецца дзякуючы дадатковым аб'ектам. Дарожнікі будуюць дарожную сетку ў новым мікрараёне Віцебска. Тут будзе вялікі праспект, які злучыць вуліцы Чкалава і Петруся Броўкі.

— Вопыт Віцебскага ДРБУ № 144 — прыклад удалага гаспадарання ва ўмовах рэзкага змяншэння фінансавання з рэспубліканскага дарожнага фонду, — заўважае намеснік генеральнага дырэктара камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскаблдарбуд» Яўген Мычкоў. — У такім разе за кошт правядзення работ па іншых дагаворах удаецца пэўным чынам змяніць да лепшага складаную сітуацыю. Мы імкнёмся, каб менавіта ў гэтым кірунку развівалiся ўсе нашы структурныя падраздзяленні. Аб'ектыўныя цяжкасці — не надта аптымістычнае становішча, але ў такіх умовах і загартоўваецца калектыў. Прадпрыемствы зноў-такі набываюць каштоўны вопыт, праводзяць больш гнуткую палітыку, пастаянна знаходзяцца ў пошуку заказчыкаў. Нават асвойваюць новыя напрамкі дзейнасці.

Ініцыятыва прыносіць поспех

Сёлета на прадпрыемстве за кошт уласных сродкаў на 2 мільярды рублёў было закуплена тэхнікі. Зразумела, патрэба большая, аднак у «Віцебскаблдарбудзе» спадзяюцца на тое, што да канца года належныя сродкі ўсё ж паступяць, паколькі пераўзбраенне — задача з разраду стратэгічных.

— Аднак нельга проста сядзець на месцы і чакаць, каб нехта прыйшоў і дапамог, — перакананы Валерый Лаппо. — Мы ўвесь час актыўна вядзём пошук патэнцыяльных заказчыкаў і каля паловы ўсіх выкананых работ — менавіта па такіх дагаворах. Я ўвесь час пераконваюся, што ініцыятыва прыносіць рэальны поспех. Актыўнасць заўсёды мае станоўчы вынік. Так атрымліваецца ў любой дзейнасці. Узяць, напрыклад, наша прадпрыемства: нават у складаных умовах удаецца працаваць з прыбыткам — па выніках дзевяці месяцаў рэнтабельнасць склала 7,6 працэнта.

Дарожныя рамонтна-будаўнічыя ўпраўленні, што ўваходзяць у склад КУП «Віцебскаблдарбуда», абслугоўваюць ад 600 кіламетраў да 1 тысячы мясцовых дарог. У сярэднім у ДРБУ працуюць па 80—140 чалавек. Няцяжка падлічыць, якая нагрузка прыпадае на аднаго работніка. Аднак спраўляюцца, і спраўляюцца нядрэнна. Асобныя з ДРБУ нават не зменшылі аб'ёмаў у параўнанні з мінулым годам.

Адзін з такіх прыкладаў — Віцебскае дарожнае рамонтна-будаўнічае ўпраўленне № 144. За дзевяць сёлетніх месяцаў прадпрыемствам асвоена каля 9 мільярдаў рублёў.

Як зменшыць затраты?

У Шумілінскім ДРБУ № 204 таксама вядзецца пастаянны пошук перспектыўных заказаў. Прычым прадпрыемства не прывязваецца да канкрэтнай тэрыторыі, дзе размешчана вытворчая база. Як адзначыў начальнік Шумілінскага ДРБУ № 204 Руслан Насцюшкін, бяруцца за выкананне любой работы. З мая гэтага года працуюць у Віцебску. Актыўна займаюцца добраўпарадкаваннем, тым больш што вопыту ў правядзенні адпаведных работ ім не займаць (летась падчас падрыхтоўкі да рэспубліканскага свята «Дажынкі» ў Оршы асвоілі каля 1 мільярда рублёў). У найбліжэйшай будучыні спецыялісты прадпрыемства плануюць займацца надзвычай перспектыўнай і рэнтабельнай дзейнасцю — уладкаваннем інжынерных сетак. Як бачым, гнуткае гаспадаранне здольнае прыносіць добрыя вынікі.

За кошт асваення шэрагу кірункаў вытворчай дзейнасці ўдаецца ўпэўнена рушыць наперад. У гэтым пераканаліся, калі завіталі на Лепельскае ДРБУ № 202. Прадпрыемства абслугоўвае значную сетку — 620 кіламетраў мясцовых дарог. Гэта зона штодзённа-

Як трэба развіваць мясцовую дарожную сетку на Лепельшчыне? Гэта пытанне абмяркоўваюць начальнік філіяла «Лепельскае ДРБУ-202» Уладзімір ГІРЫНСКІ і намеснік генеральнага дырэктара КУП «Віцебскаблдарбуд» Яўген МЫЧКОЎ.

— Наш офіс, — гэтак, па-сучаснаму, называюць будынак сваёй дырэкцыі лепельскія дарожнікі. Сапраўды, выгляд у будынка і навакольнай тэрыторыі варты гэтага.

Начальнік філіяла «Шумілінскае ДРБУ-204» Руслан НАСЦЮШКІН узначальвае калектыў, які вядомы не толькі працоўнымі дасягненнямі, але і здабыткамі ў арганізацыі ўмоў працы і адпачынку. На здымку малады кіраўнік дэманструе нядаўна атрыманую дарожнікамі ўзнагароду за лепшае ландшафтна-архітэктурнае вырашэнне ў раённым конкурсе «Родная Зямля».

га клопату і вялікай адказнасці. Аднак паспяваюць спраўляцца не толькі з адпаведнымі абавязкамі, але і працаваць у іншых раёнах. Напрыклад, выконвалі работы ў абласным цэнтры, Бягомлі, Наваполацку.

Як заўважыў начальнік Лепельскага ДРБУ № 202 Уладзімір Гірынскі, у свой час была створана магутная вытворчая база, яна ў поўнай меры задзейнічаная і дазваляе выстаяць у няпросты час. Тут працуюць два асфальтабетонныя заводы, драбільная гаспадарка, нават дрэваапрацоўчы цэх (які, дарэчы, дзейнічае вельмі паспяхова — забяспечвае неабходнай прадукцыяй патрэбы не толькі галіновых прадпрыемстваў, але і сельгаскааператывы).

На Лепельскім ДРБУ № 202 з 1998 года працуе ўстаноўка па вытворчасці бітумнай катыённай эмульсіі. Дарэчы, адзіная ў Віцебскай вобласці. Варта нагадаць, што бітумную эмульсію паспяхова выкарыстоўваюць для паверхневай апрацоўкі і рамонту дарог з цвёрдым пакрыццём. Гэта арыгінальны рэцэпт — сумесь бітуму, вады і спецыяльных хімічных дабавак. Прымяненне эмульсіі дазваляе павялічваць тэрмін эксплуатацыі дарог, заплуатацыі дарожнага пакрыцця. Адпаведна, паляпшаюцца эканамічныя паказчыкі працы прадпрыемстваў «Віцебскаблдарбуда». Тут заўжды трэба трымаць руку на пульсе часу, паколькі сучасныя тэхналогіі развіваюцца вельмі імкліва.

Людзі — галоўная каштоўнасць

Спецыялісты камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскаблдарбуд» актыўна ўдзельнічаюць у рэалізацыі мерапрыемстваў у межах дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі. Сёлета ў Віцебскай вобласці запланавана абуладкаваць 45 аграгарадкоў. Дарожнікі дапамагаюць не толькі правадзіць грунтоўнае добраўпарадкаванне населеных пунктаў, але і аднаўляць вытворчую сферу. Паколькі без дарог, як і без вады, — ну ніяк не абысціся. Як паведаміў Яўген Мычкоў, сіламі дарожных рамонтна-будаўнічых упраўленняў падчас рэалізацыі мерапрыемстваў праграмы адраджэння і развіцця вёскі з пачатку гэтага года асвоена 18 мільярдаў рублёў.

Зразумела, паспяховае выкананне шэрагу сур'ёзных задач было б немагчымае без прафесійнага калектыву прафесіяналаў, майстроў сваёй справы. У гэтым плане «Віцебскаблдарбуда» сапраўды пашанцавала, паколькі менавіта такія людзі тут і працуюць. Яны здольныя на многае. Нездарма ж генеральны дырэктар з такой цеплынёй адгукаецца аб вялікім працоўным калектыве.

— У сістэме «Віцебскаблдарбуда» 2,5 тысячы работнікаў, — кажа Валерый Лаппо. — Гэта цудоўныя, добрасумленныя, працавітыя людзі. Нават у самыя складаныя часы нам удалося захаваць калектыў, не зменшыць колькасць работнікаў. Пагадзіцеся, таксама станоўчы вынік, паколькі людзі — галоўная каштоўнасць. Так я лічу. І нельга скарацца перад цяжкасцямі і згортваць колькасць работнікаў. У такім разе ў прадпрыемства няма перспектывы, будучыні. Памятаеце фразу наконт таго, што кадры вырашаюць усё? Гэта ж сапраўды так. Хто будзе прасоўваць навацыі і рэалізоўваць сур'ёзныя дзяржаўныя праграмы? Гэтае пытанне заўсёды актуальнае і кіраўнік ніколі не павінен пра яго забываць.

І сапраўды, клопат пра працоўны калектыў, клапатлівае стаўленне да надзённых патрэб людзей выклікае павагу. І стымулюе работнікаў да прадукцыйнай працы. Пагадзіцеся, кожнаму прыемна працаваць у калектыве, дзе такія ўзаемаадносіны. Зразумела, бываюць розныя часы, але цяжкасці — зусім не падстава для масавых скарачэнняў. Больш за тое, сацыяльныя гарантыі работнікаў «Віцебскаблдарбуда», замацаваныя ў калектыўным дагаворы, не толькі не зменшыліся, а, наадварот, — пашырыліся.

Нядаўна на прадпрыемстве было прынятае рашэнне наконт матэрыяльнай падтрымкі ветэранаў. Тыя, хто адпрацаваў тут 20 гадоў і больш, дадаткова атрымліваюць штомесяц адну базавую велічыню. Каму прысвоена званне «ветэран дарожнай галіны» — дзве базавых, ганаровым дарожнікам другой ступені выплачваюць тры базавыя, ганаровым дарожнікам першай ступені — чатыры. Заслужаным людзям вельмі важна павага і памяць, а таксама дадатковы даход зусім нялішні.

Разам з заўсёдным клопатам пра ветэранаў вялікая ўвага надаецца прыцягненню маладых спецыялістаў. Прадпрыемства плённа супрацоўнічае з усімі профільнымі навучальнымі ўстановамі. І выпускнікі ахвотна робяць свой выбар на карысць «Віцебскаблдарбуда». Напрыклад, сёлета прыехала 17 маладых спецыялістаў. Чым прывабнае адпаведнае працоўнае месца? Перш за ўсё нядрэннымі заробкамі, магчымасцю вырашыць жыллёвае пытанне, добразычлівымі адносінамі ў працоўным калектыве. Паколькі тут не толькі плённа і адказна працуюць, але і з карысцю бавяць вольны час. Традыцыйным стала правядзенне спартакіяд, у якіх з задавальненнем бяруць удзел работнікі. Так што дарожнікі заўжды ва ўсім на вышыні — у гэтым няма сумнення.

Кіпіць праца на ўчастку капітальнага рамонту дарогі каля садаводчага таварыства «Альгова». Тут мы сустрэлі начальніка філіяла «Віцебскае ДРБУ-144» Юрыя ЖУРАЎСКАГА.

Філіял «Лепельскае ДРБУ-202» вядомы сваімі высокакваліфікаванымі кадрамі. На гэтым прадпрыемстве шмат сучаснай энерганасычанай тэхнікі і складанага абсталявання. Так, напрыклад, на асфальтабетонным заводзе дзейнічае свая шырокакалейная чыгунка (яе нам паказаў праараб Анатоль РАБАЎ). Сама вытворчасць спалучае мноства аб'ектаў кіравання і кантролю. На здымках вы бачыце інжынера-лабаранта Сяргея ПШОНКУ і памочніка аператара Аляксандра ЖАРНАСЕКА.

Захар БУРАК.
Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 300003210.

ЗЛАЧЫНСТВА ВІРТУАЛЬНАЕ — ПАКАРАННЕ РЭАЛЬНАЕ

У дачыненні да 34-гадовага жыхара Ваўкавыска ўзбуджана крымінальная справа за камп'ютарны сабатаж, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.

У гэтага чалавека быў уласны інтэрнэт-рэсурс, які некаторы час з'яўляўся лідарам сярод падобных у рэгіёне. Аднак затым сталі ўтварацца іншыя сайты, больш прыгожыя па афармленні і лепшыя па змесце. Убачыўшы, што цікавасць карыстальнікаў да яго віртуальнага тварэння паступова згасае, мужчына вырашыў узламаць рэсурсы сваіх канкурэнтаў, для чаго выкарыстаў шкодныя праграмы. З іх дапамогай ён атрымаў несанкцыянаваны доступ да закрытай інфармацыі апанентаў і знішчыў змест гэтых сайтаў.

Злачынства ў віртуальнай сетцы для раней ужо судзімага за аналагічныя незаконныя дзеянні хакера закончылася рэальным узбуджэннем крымінальнай справы, яму пагражае пазбаўленне волі на тэрмін да пяці гадоў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ВЫЙШЛІ ПАДЛЕТКІ НА ВУЛІЦУ НОЧЧУ

А 3-й гадзіне ночы на вуліцы Цэнтральнай у Пінску на мінака напалі пяцёра і гвалтам забралі мабільнік, 800 тысяч рублёў і дакументы з ключамі ад кватэры.

А праз дзве гадзіны быў абрабаваны на гэтай жа вуліцы яшчэ адзін жыхар Пінска.

Рабаўнікоў удалася затрымаць. Імі былі: ліцэіст, два навучэнцы каледжа, вучань вячэрняй школы і 16-гадовы падлетак, які не вучыцца і не працуе.

ГАРЭЛКА, КУХОННЫ НОЖ І...

Вечарам 22-гадовая брастаўчанка, якая знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці, пасля выпіўкі з беспрацоўным у сваёй кватэры па вул. Зубачова ўдарыла яго кухонным нажом у жывот.

А ў Ляхавічах з кватэры супрацоўніцы каледжа ў бальніцу прывезлі беспрацоўнага, таксама з раненнем жывата. Аператыўнікі высветлілі, што ўдар кухонным нажом яму нанёс беспрацоўны з в. Тухавічы, які прыраўнаваў пацярпелага да гаспадыні кватэры.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

НАВОШТА ПІЛА З НЕВЯДОМЫМ?

Жыхарка Пінска, далёка не юная, згадзілася выпіць гарэлкі з незнаёмым чалавекам. А калі ён добра падпіў, то сілай адабраў у жанчыны наяўныя грошы, нятанны тэлефон і нават выдзер з вушэй залатыя завушніцы. Тады яна пайшла ў міліцыю і напісала заяву.

КАЛІ КАМЕРА ЗАХОЎВАННЯ НЕНАДЗЕЙНАЯ...

Жыхарка Кобрына зайшла ў краму «Мерыдыян» па вуліцы Дзяржынскага, а сваю сумачку з рэчамі паставіла ў ячэйку камеры захоўвання.

Як гэта нярэдка бывае цяпер, у ячэйцы адсутнічаў ключ. Пакуль яна выбірала пакупкі, 29-гадовы зламыснік выцягнуў сумку і збег, а там былі рэчы на немалую суму. Добра, што яго па гарачых слядах затрымалі. Так што не пакідайце рэчы ў ячэйках камераў захоўвання, якія не замыкаюцца. А калі крама не можа забяспечыць надзейнасць захавання рэчаў пакупніка, то няхай мірыцца з тым, што пакупнік ходзіць па аддзелах з вялікай торбай альбо валізкай.

СЫН АБАКРАЎ МАЦІ

У міліцыю звярнулася брастаўчанка, бо з кватэры прапалі тэлевізар, DVD-прайгравальнік, іншыя рэчы. Калі пачалі разбірацца, то высветлілася, што рэчы павыносіў 24-гадовы сын гаспадыні.

Яна СВЕТАВА.

КАМУ Ў БЕЛАРУСІ ЖЫЦЬ ДОБРА?

Грамадзянка В'етнама будзе дэпартаваная на сваю радзіму пасля таго, як супрацоўнікі ўпраўлення па грамадзянстве і міграцыі УУС Гомельскага аблвыканкама правялі рэйд на цэнтральным рынку Гомеля.

Як расказала намеснік гэтага ўпраўлення Ірына Кобрусева, у жанчыны няма візы, якая дазваляе знаходзіцца на тэрыторыі нашай краіны. Акрамя таго, у райаддзел міліцыі для разбору былі дастаўлены і 3 грамадзяніны Азербайджана, якія не маюць рэгістрацыі, якая дазваляла б законнае знаходжанне ў Беларусі. Ім прапанавана аформіць неабходныя дакументы і заплаціць штраф. Сітуацыя не адзінкавая, адзначае Ірына Валер'еўна:

— Многія замежныя госці імкнуцца легалізавацца на нашай тэрыторыі любым спосабам, для чаго, напрыклад, заключаюць фіктыўныя шлюбы. Урэшце атрымліваецца, што незаўважна з гасцей яны ператвараюцца ў гаспадароў. Нашы грамадзяне часам занадта талерантна ставяцца да прыезджых з усходніх краін, дапамагаюць ім, а потым урэшце працуюць на іх.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Сімвал Славянскага сяброўства

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«Славянскае сяброўства» адкрылі вучаніца мінскай школы № 158 Вераніка ЗЛОБІНА і вучань маскоўскай школы № 140 Алег САУЛІН.

Скульптурная кампазіцыя пад такой назвай з'явілася ў сталіцы краіны. Цяпер гэты сімвал сяброўства паміж Беларуссю і Расіяй будзе ўпрыгожваць пляцоўку каля Палаца дзяцей і моладзі. Аўтары скульптуры — маскоўскія скульптары Вадзім і Стас Кірылавы. На ўрачыстае адкрыццё прыехала дэлегацыя ў складзе настаўнікаў і вучняў маскоўскай 140-й школы.

РАКОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 3 (трех) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

лот 1 — земельный участок в деревне Дубоши, площадь участка 0,1561 га, кадастровый номер участка 622085705601000043, начальная цена 7 805 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удаленность от центра агрогородка Раков 10 километров, находится в начале населенного пункта, на границе участка имеется искусственный водоем, электричество, асфальтированный подъезд;

лот 2 — земельный участок в деревне Бузуны площадью 0,2000 гектара, кадастровый номер участка 622085702101000107, начальная цена — 10 000 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удаленность от центра агрогородка Раков 3 километра, асфальтированный подъезд, в перспективе газификация, имеется в деревне водопровод;

лот 3 — земельный участок в деревне Выгоничи, площадь участка 0,1000 гектара, кадастровый номер участка 622085703101000149. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удаленность от центра агрогородка Раков 3 километра, имеется в деревне газопровод, в перспективе водоснабжение.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется квитанцией в Главное управление МФ РБ по Минской области, р/с 3600614140152 в филиале № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, УНП 600537220, назначение платежа 04901.

Аукцион состоится **20 ноября 2009 года** в 10.00 по адресу: а/г Раков, площадь Свободы, 11, 2-ой этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются до **16 ноября 2009 года** (включительно) до 17.00 по адресу: а/г Раков, пл. Свободы, 11, кабинет секретаря.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

Контактные телефоны: (8 01772) 52 2 36; 8 029 1405437.

Утерянную печать УП «Ровлад» г. Заславль **считать недействительной**.

«Магістры» ігры

Фестывалі

«Восень» запрашае на музычную «рэабілітацыю»

РАМАНТЫКА «Беларускай музычнай восені» пачалася ўчора — з канцэрта для двух фартэпіяна з аркестрам. Музыка гучала французская. Зоркі расійскія — народны артыст СССР Мікалай Пятроў і заслужаны артыст Расіі Аляксандр Гіндзін. Аркестр наш — Нацыянальны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі. І такіх канцэртаў, калі будзе «на каго» пайсці, нам да 7 лістапада абяцаюць 15.

«Беларуская музычная восень» «рэабілітуе» Пятра Елфімава — ён выйдзе на сцэну як спявак класічнага рэпертуару. І ацэньваць яго будзе не аўдыторыя «Еўрабачання», а публіка, дасведчаная ў музыцы, якая ходзіць у «Белдзяржфілармонію». Гэта той выпадак, калі слова «нефармат» успрымаецца выключна са знакам «плюс». Сольны канцэрт пад назвай «Магістр» пройдзе ў рамках міжнароднага фестывалю. Пятру давядзецца паказаць усё сваё майстэрства спеваў, бо выступаць ён будзе разам з двума аркестрамі — «Маладая Беларусь» Беларускай акадэміі музыкі і Нацыянальным акадэмічным народным аркестрам імя Жыновіча. У нейкім сэнсе гэта вяртанне спевака да самога сябе — вучыўся ён вакалу ў сценах акадэміі музыкі. І вяртанне прыхільнікаў да іншага, яшчэ «не раскручанага» Елфімава. А можа, ну яе, гэтую «раскрутку», якая лёгкімі капрызамі бязлікага закадравага натоўпу можа ператварыцца ў «закрутку»?.. Іншая рэч — працаваць не на імгненны вынік, спрабуючы вывесці нейкую ўніверсальную формулу ўніверсальнай песні...

Вось як калісьці рабілі нашы бессмяротныя «Песняры» разам з Уладзімірам Мулявіным. Іх песні і да нашага часу жывейшыя за шмат якія іншыя. Можа, таму іх з задавальненнем сёння перапяваюць іншыя артысты. Дарэчы, як гэта ў іх атрымліваецца, можна будзе паслухаць у канцэрце 6 лістапада — гэта для аматараў «зорак беларускай эстрады».

Зрэшты, і ў беларускай музыцы, акрамя «зорак», ёсць яшчэ што паслухаць. Сёлета адзначыць 80-годдзе кампазітара Яўгена Глебава прапануе праграма Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Але і Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Аляксандра Анісімава звяртае слухача да музыкі гэтага беларускага кампазітара, напрыклад, праграмай «Запрашэнне ў краіну дзяцінства». Нацыянальнага каларыту варта чакаць ад Нацыянальнага акадэмічнага хору імя Цітовіча пад кіраўніцтвам прафесара Дрынеўскага.

Восень — звычайна тая пара, калі выдатныя музыканты, выканаўцы, імёны якіх гавораць самі за сябе, прыязджаюць на гэты фестываль: адкрываць Беларусь і адкрыць ёй сваю музыку. Сёлета сярод гасцей — арганіст Роналд Эбрэхт, балалаечнік Андрэй Гарбачоў, акардэаніст Ігар Квашэвіч, Аркадзь Шылклопер з новай джазавай праграмай, лаўрэаты міжнароднага конкурсу скрыпачоў імя Ойстраха, «Новы рускі квартэт»... Сёлета чакаюцца госці з Германіі, ЗША, Ізраіля, Расіі, Украіны.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Да ведама

УВОДЗЯЦЦА ПАСКОРАНЫЯ ЦЯГНІКІ

З 23 кастрычніка на ўчастках Мінск — Асіповічы — Мінск, Мінск — Орша — Мінск для паляпшэння абслугоўвання пасажыраў прызначаюцца паскораныя электрацягнікі.

Як паведамілі ў Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі, на ўчастку Мінск — Асіповічы — Мінск штодня будзе курсіраваць электрацягнік Мінск — Асіповічы адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 18.40, прыбыццём на станцыю Асіповічы ў 20.21. Таксама штодня будзе хадзіць электрычка Асіповічы — Мінск адпраўленнем са станцыі Асіповічы ў 17.58, прыбыццём на станцыю Мінск-Пасажырскі ў 19.40.

На ўчастку Мінск — Орша — Мінск электрацягнік Орша — Мінск адпраўленнем са станцыі Орша ў 18.08 будзе адпраўляцца ў 18.25, далей ісці згодна са зменены раскладам на ўчастку Мінск — Барысаў, прыбываць на станцыю Мінск-Усходні ў 21.45. Таксама штодня электрычка Мінск — Орша адпраўленнем са станцыі Орша ў 18.35 будзе адпраўляцца ў 18.55, далей ісці згодна са зменены раскладам на ўчастку Мінск — Барысаў, прыбываць у Оршу ў 22.23.

У сувязі з уводам паскораных электрацягнікоў змяняецца расклад руху. Электрацягнік Пухавічы — Мінск адпраўленнем са станцыі Пухавічы ў 18.33 па пятніцах і выхадных будзе адпраўляцца па пятніцах і выхадных у 18.46, прыбываць на станцыю Мінск-Пасажырскі ў 20.05. Электрычка Мінск — Пухавічы адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 18.38 па пятніцах і нядзелях будзе адпраўляцца па гэтых днях у 18.18, прыбываць на станцыю Пухавічы ў 19.34. Электрацягнік Барысаў — Мінск адпраўленнем са станцыі Барысаў у 17.22 штодня будзе адпраўляцца ў 17.26, прыбываць на станцыю Мінск, Інстытут культуры ў 19.09.

БУДУЦЬ ЗМЯНЕННІ

19—21 кастрычніка здымаецца з руху электрычка Асіповічы — Мінск-Пасажырскі адпраўленнем у 10.31. 19 і 21—22 кастрычніка не будзе курсіраваць электрацягнік Мінск-Пасажырскі — Асіповічы адпраўленнем у 13.17.

22 і 23 кастрычніка адмяняецца электрычка Мінск-Пасажырскі — Асіповічы адпраўленнем у 14.03. 22 кастрычніка таксама не будзе курсіраваць электрацягнік Асіповічы — Мінск-Пасажырскі адпраўленнем у 12.57.

23 кастрычніка гэтая ж электрычка Асіповічы — Мінск-Пасажырскі адпраўленнем у 12.57 прызначаецца ў рух па маршруце Пухавічы — Мінск-Пасажырскі, а электрацягнік Мінск, Інстытут культуры — Асіповічы адпраўленнем у 11.50 — па маршруце Мінск — Пухавічы. 23 кастрычніка здымаецца з руху электрычка Асіповічы — Мінск, Інстытут культуры адпраўленнем у 14.53.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СЁННЯ

Месяц

Маладзік 18 кастрычніка.
Месяц у сузор'і Стральца.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.48	17.59	10.11
Віцебск —	7.41	17.46	10.05
Магілёў —	7.39	17.49	10.10
Гомель —	7.32	17.49	10.17
Гродна —	8.03	18.15	10.12
Брэст —	8.01	18.18	10.17

Імяніны

Пр. *Надзеі, Таццяны, Таісіі, Васіля, Дзмітрыя, Паўла, Пятра.*
К. *Урсулы, Гіляра, Якуба.*

Фота Уладзіміра ФЯДОТАВА.



НАДВОР'Е на заўтра

Усміхнемся!

У рэстаран заходзіць малады чалавек і замаўляе ў афіцыянта бутэльку гарэлкі, затым просіць памяняць бутэльку гарэлкі на бутэльку каньяку, выпівае каньяк і накіроўваецца да выхаду.

Афіцыянт:

— Малады чалавек, вы ж не заплацілі за каньяк!

— Дык я ж вам за яго бутэльку гарэлкі аддаў!

— Дык вы ж і за гарэлку не плацілі!

— Дык я ж яе і не піў!!!

☺

Раніцай ад яго патыхала дарагім дэзадарантам. Але пад абед прырода брала сваё.

☺

Дзяўчына пытаецца ў хлопца:

— Колькі мы з табой ужо знаёмыя?

— Ды пакуль яшчэ ні разу.

☺

Адэса, рэвалюцыя. Грук у дзверы кватэры. Жанчына адчыняе, а на парозе двое:

— Мы ў вас у акне паставім кулямёт.

— Стаўце хоць гармату, але што скажуць людзі? У мяне дарослая дачка, а з акна страляюць зусім незнаёмыя мужчыны!

☺

Цімаці атрымаў ролю ў пастаноўцы «Гамлета» ў Вялікім тэатры. Менавіта яго чэрап будзе трымаць у руках прынц Дацкі.

21 кастрычніка

Дзве даты

1878 год — нарадзіўся Уладзімір Іванавіч Пічэта, гісторык, акадэмік НАН Беларусі (1928), АН СССР (1946). Заслужаны прафесар БССР (1926), заслужаны дзеяч навукі Узбекскай ССР (1943). Адзін з арганізатараў і першы рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1921-29г.г.). У 1930 годзе асуджаны да высылкі тэрмінам на 5 гадоў і пазбаўлены звання акадэміка. У 1940 годзе адноўлены ў гэтым званні, цалкам рэабілітаваны ў 1967-м. Аўтар больш за 500 навуковых прац. Яго навуковыя даследаванні прысвечаны гісторыі Беларусі, Расіі, Польшчы, Украіны, гісторыі права. Памёр у 1947 годзе.

1067 год — у час 1-га крыжовага паходу была асаджана Атыёхія, адзін са значных гарадоў Усходняга Міжземнамор'я. У хуткім часе П'ер Бартэлемі, манах з Марселя, голасна распавёў крыжаносцам пра сваё бачанне — нібы перад ім паўстаў апостал Андрэй і паведаміў аб тым, што ў Антыёхіі схавана кап'ё, якім быў прабіты бок Ісуса. Іншы манах, Стэфан Валенскі, сцвярджаў, што яму з такой жа навіной з'яўляліся Панна Марыя і сам Збавіцель. Хутчэй за ўсё, гэтыя неверагодныя аповеды былі вынікам нервовага і фізічнага знясілення хрысціян пасля доўгіх месяцаў бясконцых бітваў і голаду. Аднак крыжаносцы пачалі пошукі ў храме

св. Пятра і неўзабаве знайшлі «кап'ё гасподняе, якое, кінутае рукой Лонгіна, працяла бок нашага Збавіцеля». Верагодней за ўсё, знаходка была сфабрыкавана, многія сталі вінавацяць П'ера Бартэлемі ў хлусні -- ужо занадта своечасова была выяўлена Святая дзіда, і гэта акалічнасць не магла не выклікаць падазрэнняў. Манах прапанаваў наладзіць яму выпрабаванне агнём. Прайшоўшы па дарожцы, паабапал якой шугала вогнішча, Бартэлемі атрымаў страшныя апёкі і, прамучыўшыся 12 дзён, памёр. Адных крыжаносцаў смерць манаха пераканала ў тым, што дзіда была фальшыўкай, але іншыя сталі лічыць рэліквію сапраўднай.

Цытата дня

«Постаць чалавека — фасад яго душы».

Бальтасар Грасіян (1601—1658), іспанскі пісьменнік-мараліст.

ГЭТА МЫ...

Простая мова

СУПАЛА (і ці толькі ў мяне?): ранняй раніцай уключыла тэлевізар, убачыла малечу, якая разважала над тым, што трэба зрабіць, каб стаць знакамітым. «Навучыцца іграць на піяніна», «Займацца спортам», «Смачна гатаваць», «Выратаваць чалавека» — розныя былі адказы.

А трохі пазней разгарнула газеты. У той дзень — ці не ўсе яны? — паведамлялі, што ў адной з прыватных клінік пасля цяжкага ранення сканаў такі вядомы «злодзей у законе» па прозвішчы «Япончык».

Факт. І, як кажуць, без каментарыяў.

Ідэя

...Раней гэты прыпынак, як прыпынак быў — нічога асаблівага. Потым непадалёк металічную сетку паставілі — прычапілі расцяжку «Продаж аўтамабіляў».

І яны, аўтамабілі, там напраўду стаяць — але ж, мусіць, не прадаюцца, бо ніякага руху за дротам няма: дзве сабачыя будкі ў розных канцах, вялікі, самотны дварняк, побач — мужчына. Акурат такі ж... Быў. Пакуль да вуха мабільнік не прыклаў. А тады... Усе вочы там — ну як з ланцуга якога сарваўся: стаў крычаць, размахваць рукамі, некага бэсціць, брахаць...

Людзі, што былі на прыпынку, слухалі (бо куды ж ты дзенешся?..), раз-пораз пазіралі і, магчыма, думалі: як жа добра было б, каб такіх вось (усіх!) ды трымаць за кратамі!

Так было. І ёсць!

«Гэтым летам я, як хамяк на коле: пакуль кола стаіць, набіваю запысныя мяшкі, разглядаюся з цікавасцю, нават прыгажосць наваджу... Але вось нехта крутане кола і пабегла. Спыніцца немагчыма. Шалеючы, знемагаючы. А саскочыць з кола не дазваляе слабаразвітасць розуму.»

Гэта — Наталка Бабіна. Напэўна, пра многіх. І пра мяне.

То кола ўжо крутанулі. Пабегла — па кватэры, па кухні, па вуліцы, па крамцы...

Прыпынак — нарэшце — у поўным сэнсе гэтага слова, тралейбус: можна ні аб чым не думаць. Але... У пярэднія дзверы салона — цяжка, павольна, з дапамогай «падпоркі» — «упаўзае» стары.

Трохі маладзейшы, але без яе, тут жа «падскоквае» — саступае месца.

Усе астатнія як сядзелі, так і сядзяць, чытаюць кніжкі-газеты, глядзяць за акно.

І тым самым сцвярджаюць, што сыты галоднаму па-ранейшаму не спачувае.

Спачувае, як правіла, галодны (ці той, хто галадаў). І дапамагае. Калі можа.

І калі не можа!

Чакай Пятра...

Не ведаю, мо цяпер там гандлююць інакш — гадоў 10 назад у Тунісе...

Ну вось па парадку: зацікавіла вас якаясьці рэч — пытаеце кошт, чуеце (умоўна) — 100 долараў. 100?! За гэта?! Вы акругляеце вочы (паціскаеце плячыма, круціце галавой, збіраецеся сысці...), бо гэта не проста дорага, гэта — хіба з'ехаўшы з глузду!

Гандляр вашу рэакцыю, безумоўна ж, бачыць, але каб крыўдзіцца — і не падумае. Ён штосьці балбоча (па-свойму), падае вам паперу і насадку — прапануе напісаць свой кошт, гэта значыць, суму, якую за гэту рэч вы гатовыя заплаціць.

Што і казаць — прапанова для вас нечаканая. І складаная — трэба яшчэ раз прыгледзецца да абранага тавару, успомніць, колькі штось падобнае каштуе ў нас, потым цану ў беларускіх перавесці на долары...

Але ж вы, дапусцім, справіліся. І тады на той прапанаванай папярыне асцярожненька, баючыся ў тым ліку пакрыўдзіць гандляра, пішаце... 10.

Ён абураны! Ён махае рукамі! Ён кажа вам шмат нечуваных слоў... І аж два — чуваныя: «Не!» і «Сабатаж!...».

Але зноў жа (гэта вы потым зразумееце) кажа, не «перабіраючы», асцярожна, так, каб вы не сышлі. Бо торг — толькі пачынаецца: прынамсі, першапачатковую лічбу (100) гандляр закрэслівае крыж-накрыж, выводзіць побач меншую (удвая!), зноў аддае вам асадку з ужо відавочным: я саступіў вам, зрабіў крок насустрач, то зараз — ваша чарга...

Адступаць — няёмка: закрэсліваеце і вы сваю лічбу 10, пішаце, ну, напрыклад, 12.

Гандляр на гэта яшчэ раз (і проста «дзіка» абураецца), яшчэ раз паўтарае слова «сабатаж!», аднак вас... не адпускае: закрэслівае сваю лічбу 50 і піша 25. Вы — закрэсліваеце свае 12, пішаце 13. Урэшце, на нейкіх 15 вы такі сышліся — здзелка адбылася.

Але вялікай радасці, як правіла... не прынесла. Вам — таму што найбольшы кошт той пакупцы (правільна, правільна спярша падлічылі!) не больш за 10 долараў, гандляру — таму, што ўзяў не... 100.

А мог жа, мог, бо нават у нашай, беларускай, групе быў турыст (Пятром яго звалі), які, штось цікавае бачыў — і адразу купляў (за 100 дык за 100) — ніколі ні з кім не таргаваўся...

(Да слова — вось такіх пакупнікоў тамтэйшыя гандляры ў міг вока вылучалі з натоўпу, абступалі, наперабой, настойліва прапаноўвалі нешта купіць.

Наш Пётр на гэту ўвагу спачатку купляўся і штосьці купляў — у некага аднаго... Другога ж, трэцяга, пятага — па чалавечы прасіў, каб далі прайсці, расступіліся, адчапіліся... Прасіць, аднак, было марна... Тады, мякка кажучы, разэлаваўшыся, ён крычаў: «Да пошли вы...!» І казаў, куды.

Вось гэта ўжо спрацоўвала: весела паўтараючы адзін аднаму, відаць, добра знаёмае: «Пошли на ...!», «Пошли на ...!», прадаўцы разбягаліся).

...Я навошта пра іх? І пра тога Пятра — вось тут... І цяпер?

Кошты ў многіх нашых крамах ну вельмі нагадваюць туніскія — першапачатковыя. Аднак закрэсліваць іх — зніжаць у два, у чатыры, у восем разоў — ніхто не збіраецца.

У чаканні Пятра?

Яшчэ не вечар

...Крамкі гэтыя былі невялікія, але дужа фарсістыя: сваё «Мы открылись!!!» «крычалі» прынамсі, на ўвесь мікрараён!..

І было гэта ці не ўчора — мінулай вясной...

Восенню ж найбліжэйшая з іх абвясціла пра зніжкі, потым — пра «распродаж тавару ў сувязі з ліквідацыяй».

Дзве другія пакуль ліпяць: вісіць тавар, сядзяць прадавачкі, зрэдчас заходзяць «экскурсанты». Пакупнікоў — лічы, што няма...

Крахуюць, як сказаў бы знаёмы чэх.

Што трэба

...Мы ехалі, ехалі і такі ж прыехалі ў госці! Толькі б вітацца цяпер ды гасцінцы раздаваць — нехта грукае ў дзверы. Гаспадар падаўся ў вітальню. Чулася — з некім гаманіў.

— Перапісчыца гэтак загадзя, — патлумачыў, з'явіўшыся. — Спытала прозвішча-імя, сямейнае становішча, якая адукацыя і калі будаваўся дом... Сказала яшчэ, што больш не пойдзе — інфармацыю ўсю перапіша...

— А пра мову, пра мову яна спыталася? — хвалюемся мы.

— Не, — чухае патыліцу гаспадар і дадае, — пра яе, мусіць, што трэба, тое і напіша.

Гэта мы...

Ранічка. Дом — шматпавярховы і досыць доўгі. Двор — забіты машынамі. Яны тут стаяць паўсюль, дзе толькі можна... Дзе нельга, дарэчы, стаяць таксама: дзве з іх правымі коламі заехалі на ходнікі — загарадзілі дарогу. Сыходжу на асфальт, каб неяк абысці. І ў той жа момант, лічы... дранцвею — ад віску тармазоў, ад жаху: каля ног... у пядзі (!), але... спыняецца (!) «Жыгуль», што выскачыў збоку...

Вадзіцель — ужо не малады і такі ж спалатнелы ад страху — да памяці прыходзіць першым: мацюкаецца, досыць рэзка здае ўзад, выкручвае руль, з'язджае. Я — паціху сыходжу.

А па дарозе думаю, якое шчасце, што ён, гэты кіроўца, не «чайнік», не першы дзень за рулём, што ехаў на спраўнай машыне, што зарыентаваўся, затармазіў, калі б — крый Божа! — не...

Тут што цікава было б: па вялікім рахунку яго ў ДТЗ ніхто б не вінаваціў: я ішла па праезнай частцы. Але ж і мяне, як быццам, таксама?.. Бо пешаходная была занятая, застаўленая машынамі. Фармальна не было б віны і за тымі, хто яе «заставіў», заняў: ну, не знайшлі яны іншага месца: двары ў Мінску, за-бі-ты-я (транспартам) у поўным сэнсе гэтага слова.

Значыць, крайніх бы не знайшлі...

Аднак тады, магчыма, усе заўважылі б... вялізную пустку, што разляглася побач, у гэтым жа дварэ? На ёй, ну, напэўна ж, плануецца штось збудаваць, але — некалі. Цяпер — там можна было б зрабіць стаянку!

...Але (зноў жа...) не факт, што яе, хоць часовую, тут зрабілі б.

Нават тады.

Голас

...Уражанне гэта помню, як зараз: халат быў белы-белы і мяккі-мяккі. Да таго ж — пашыты сукеначкай: з хлясцікам на спіне, з кішэнькамі па баках, з залатой тасёмачкай па каўнерыку. І зусім не дарагі... Велікаваты, праўда. Але хто б на гэта звяртаў, умеючы трымаць іголку?! Прыдбала, пасядзела за машынкай, падагнала па фігуры, хацела тут жа апрануць, — не выйшла: на пале немаведама адкуль з'явілася плямка. Паспрабавала замыць — яна «ў адказ» толькі распаўзлася.

Што было рабіць — усю абноўку палажыла ў ваду з парашком, вымыла і такі ж прыбралася! Але хіба на дзень, бо халат меў дзве дзіўныя схільнасці: ну, па-першае, генерыраваць бруд, бо немагчыма ж «збіраць» яго там, дзе няма)... А па-другое — калі «разлягацца» ў пральнай машыне, то на ўвесь барабан...

Што, зразумела ж, не падабалася. І падабацца не магло. Таму пасля чарговага мыцця-прасавання я павесіла гэту адзежыну ў шафу і стала выцягваць адтуль толькі тады, калі прыязджаў хто з гасцей (прычым маёй камплекцыі) і заставаўся нанач. Гэта значыць — гады ў рады.

А вочы ж муляў штодзень!

Таму нядаўна я рашыла яго... парашыць: дастала, патрымала ў руках, узгадала «гісторыю яго жыцця» і над вухам пачула: «Адзін дурань пашыў — другі купіў».

Гэта — мама... З таго свету... І да скону... Як з гэтага.

Валянціна ДОЎНАР.

«ЗАПОІНЫ» — «АГЛЕДЗІНЫ»

Пасля ўдалага сватаўства, калі бацька і дачка давалі згоду на вяселле, пачыналіся так званыя «запоіны» («запівіны», «малыя заручыны», «малая гарэлка»). У гэты ж час за сталом вырашалі дзень «змовінаў», ці заручынаў. Пасля «запоінаў» дзяўчына лічылася засватанай. На Беларусі пра яе казалі: «яна запіта» ці «заедзена яечняй».

● Калі найбольш важныя пытанні для дружыны жаніха былі вырашаны, надыходзіў час развітвацца. Развітанне таксама мела рытуалізаваны характар. У цэнтры ўвагі знаходзіўся, бадай, галоўны атрыбут гэтага вечара — бутэлька, з якой прыходзілі госці. У адным выпадку бацькі дзяўчыны надзявалі на бутэльку саматканы пояс, «каб не рассохлася» (г.зн. каб яна і далей поўнілася на працягу будучай вясельнай урачыстасці). Пасля гэтага нявеста ці яе маці наліваюць у бутэльку зерне і перадаюць ў рукі жаніха. Сімволіка гэтага абрадавага дзеяння нагадвала першапачатковае стварэнне свету — зерне ў чашы як семя ва ўлонні маці: бясконцы ланцужок жыццёвых пераўтварэнняў працягваецца!

● Але пасля гэтага абраду вяселле яшчэ не было абавязковым. Калі па якой-небудзь прычыне адзін ці другі бок даведваліся што-небудзь дрэннае пра жаніха ці нявесту, калі ім не падабаўся пасаг ці штосьці яшчэ, дамоўленасць магла быць скасавана.

● У найбліжэйшую нядзелю пасля сватаўства маладая пара павінна была наведаць храм і паведаміць святару пра будучае вяселле. Нявеста магла ўзяць з сабой брата, сяброўку, жаніх ехаў з шаферам і сяброўкамі. Святар рабіў пэўны запіс у метрычнай кнізе і на працягу 2-4 тыдняў у нядзелю пасля набажэнства абвяшчаў аб будучым вянчанні. Кожны з прысутных у храме мог паведаміць святару пра немагчымасць гэтага вянчання. І калі доказы былі відавочнымі і пераканаўчымі, святар мог забараніць шлюб.

● Адным з важных этапаў перадвясельнага перыяду быў абрад «агледзінаў», «дамовінаў», «разгледзінаў», калі бацькі засватанай нявесты ехалі да жаніха. Трэба было зірнуць на тыя ўмовы, у якіх будзе жыць іх дачка, бліжэй пазнаёміцца з бацькамі жаніха, адчуць «дух» дома. У этнаграфічных запісах ёсць апісанні кур'ёзных выпадкаў, калі бацькі жаніха, імкнучыся «спадабацца» бацькам нявесты і выглядаць багацей, прыносілі ў свой дом ад суседзяў і сваякоў рэчы хатняй гаспадаркі, свойскую жывёлу, птушку і г.д.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №УМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292

У гэтай аўдыторыі ўсталяваная самая сучасная сельгастэхніка айчыннай вытворчасці. Заняткі праводзіць старшы выкладчык кафедры эксплуатацыі машынна-трактарнага парка Васіль ЗЁЛІКАЎ.

Студэнты Наталля ВАРАБЕЙ, Аляксандр ЯКУСІК, Любоў МАРОЗ, Кацярына МАЛЕЦ на занятках у лабараторыі кафедры энергатэхналогій.

Будучыя інжынеры-энергетыкі на лекцыі па электразабеспячэнні сельскай гаспадаркі. З новымі тэхналогіямі іх знаёміць кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Юрый МАКОСКА.

АДУКАЦЫЯ — НАЙПЕРШ ВЫХАВАННЕ

Сёлета БДАТУ стаў першым сярод ВНУ сталіцы ў выхаваўчай і ідэалагічнай рабоце

Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт днямі адзначае сваё 55-годдзе. Сёння гэта адна з вядучых ВНУ краіны, якая дынамічна развіваецца. Асабліва інтэнсіўная дынаміка развіцця ВНУ назіраецца ў апошнія гады: гэта аднаўленне і ўзмацненне матэрыяльна-тэхнічнай і навучальнай базы (БДАТУ, дарэчы, знаходзячыся на галоўнай сталічнай магістралі, справядліва з'яўляецца адной з візітовак не толькі праспекта Незалежнасці, але і Мінска), павышэнне ўзроўню прафесарска-выкладчыцкага складу, а разам з усім гэтым і рост цікавасці абітурыентаў да ВНУ. У 2007 годзе Еўрапейскай асацыяцыяй бізнэсу, навукі, мастацтва і адукацыі за забеспячэнне еўрапейскай якасці падрыхтоўкі спецыялістаў універсітэт узнагароджаны ўзнагародай у намінацыі «Лепшае прадпрыемства Еўропы», у 2008-м на IV Міжнароднай асамблеі якасці ў Маскве БДАТУ атрымаў «Залаты сертыфікат якасці». Апошняя ўзнагарода, дарэчы, — першая прыступка да дыпломаў міжнароднай сертыфікацыіі, што дасць магчымасць прызнання спецыялістаў у замежжы без перападрыхтоўкі. Сёлетні год таксама не абышоўся без узнагарод — у 2009-м БДАТУ стаў пераможцам сярод 23 ВНУ сталіцы па выхаваўчай і ідэалагічнай рабоце. Гэта тыя падзеі, якія дэманструюць дасягненні ўніверсітэта сёння і правільнасць абранага кірунку ў перспектыве.

Рэктар Беларускага дзяржаўнага аграрнага-тэхнічнага ўніверсітэта, прафесар, доктар сельскагаспадарчых навук, член-карэспандэнт Нацыянальнай Акадэміі Навук Мікалай Уладзіміравіч КАЗАРАВЕЦ.

І немагчымае магчыма

Трэба сказаць, што міжнародным узнагародам універсітэта папярэднічала яшчэ адна — у 2006 годзе рэктар універсітэта Мікалай Казаравец быў узнагароджаны прэміяй «Мінчанін года». Зразумела, што гэтай прэстыжнай узнагародай была высока ацэнена праца Мікалая Уладзіміравіча. У 2003 годзе Мікалай Казаравец атрымаў пасаду рэктара разам з навучальнай установай, ні адзін з 7 вучэбных карпусоў якой за час існавання (а будаваліся яны ў пасляваенны перыяд) не зазнаў капітальнага рамонту, да іх дадаваліся тры замарожаныя даўгабуды. Усе 8 будынкаў інтэрнатаў патрабавалі рамонту, не кажучы пра тое, у якім стане былі цеплавыя і іншыя інжынерныя сеткі... Але немагчымае стала магчымым: праз год, да паўвекавога юбілею, галоўны корпус ВНУ набыў абноўлены выгляд, прычым настолькі, што нават замежныя госці былі здзіўленыя такой «еўрапейскасцю» аграрнай ВНУ постсавецкай краіны. Пасля гэтага пачалося аднаўленне астатняй базы — паступовы рамонт карпусоў і інтэрнатаў, найноўшымі тэхнічнымі сродкамі сталі абсталёўвацца аўдыторыі і лабараторыі ўніверсітэта. У хуткім часе тут завершыцца будаўніцтва новага корпуса — аднаго з тых самых даўгабудаў. Гэта будзе шматфункцыйнае збудаванне самага сучаснага ўзроўню з выставачным павільёнам для доследных узораў сельгастэхнікі, з сучаснымі аўдыторыямі, кавярняй і бібліятэкай, а таксама інтэрнацкімі пакоямі на верхніх паверхах.

За 55 гадоў свайго існавання БДАТУ выпусціў больш за 36 тысяч спецыялістаў. Гэта адзіная ў краіне аграрная тэхнічная ВНУ, і тут ёсць некалькі ўнікальных факультэтаў і спецыяльнасцяў. Так, напрыклад, «Аграэнергетычны факультэт», які забяспечвае інжынерамі-энергетыкамі ўсю сельскагаспадарчую галіну, а таксама факультэт тэхнічнага сэрвісу. Усяго ж універсітэт мае восем факультэтаў, дзе вядзецца падрыхтоўка па наступных спецыяльнасцях: тэхнічнае забеспячэнне працэсаў сельскагаспадарчай вытворчасці; праектаванне і вытворчасць сельскагаспадарчай тэхнікі; тэхнічнае забеспячэнне працэсаў захоўвання і пераапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі; рамонтна-абслуговая вытворчасць у сельскай гаспадарцы; энергетычнае забеспячэнне сельскай гаспадаркі (электраэнергетыка, цеплаэнергетыка); матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне АПК; эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве; менеджмент; аўтаматызацыя тэхнічных працэсаў і вытворчасці ў сельскай гаспадарцы; кіраванне аховай працы ў сельскай гаспадарцы; метралогія, стандартызацыя і сертыфікацыя (агрtoпрамысловы комплекс).

Цікавасць абітурыентаў да ВНУ нязменна павышаецца, у прыватнасці, за апошнія пяць гадоў колькасць студэнтаў тут вырасла ў 1,8 раза. Цяпер на дзённай і завочнай формах навучання атрымліваюць адукацыю 13 600 студэнтаў. Расказвае **рэктар БДАТУ, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Мікалай КАЗАРАВЕЦ:**

— За апошнія пяць гадоў істотна змянілася наша ВНУ ў структурным плане. У структуры ўніверсітэта з'явіўся Істытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў АПК, які раней існаваў асобна. Разам са слухачамі інстытута на працягу года ў нас праходзіць навучанне 18 700 чалавек. З 2005 года ў структуры ўніверсітэта ёсць рэспубліканскі вучэбна-вытворчы цэнтр практычнага навучання новым тэхналогіям і асваення комплексу машын, на базе якога ажыццяўляецца практычная падрыхтоўка студэнтаў і слухачоў. Істотна павысілася якасць вучэбнай базы і ўзровень выкладчыцкага складу. Калі пяць гадоў таму ва ўніверсітэце было 14 дактароў навук, то зараз — 54, 247 кандыдатаў навук і дацэнтаў, працуе 40 кафедраў. Узмацнілася сувязь ВНУ з вытворчасцю. Зараз функцыянуюць 43 філіялы кафедраў на вытворчасці. Гэта кафедры на самых перадавых прадпрыемствах АПК, у прыватнасці, нашы кафедры знаходзяцца на Мінскім трактарным заводзе і «Белагрэсэрвісе», што дазваляе студэнтам і выкладчыкам, слухачам інстытута перападрыхтоўкі непасрэдна на заводзе вывучаць навінкі вытворчасці сельгастэхнікі. Філіялы кафедраў знаходзяцца на такіх унікальных сельгаспрадпрыемствах, як «Сноў» Нясвіжскага раёна, «Астрамечава» Брэсцкага раёна. З гаспадаркай СВК «Белавежскі» Брэсцкай вобласці, якую ўзначальвае наш выпускнік Юрый Мароз, мы нядаўна заключылі дагавор і таксама стварылі там філіял. На базе гэтых філіялаў мы навучаем слухачоў інстытута перападрыхтоўкі, куды, дарэчы, прыязджаюць вывучаць беларускі досвед і распрацоўкі нашых вучоных слухачы з краін-суседак. Зараз у нас стажыруецца група кіраўнікоў з Казахстана, нядаўна былі расіяне з Яраслаўскай вобласці. Разам з адукацыйным працэсам мы займаемся і навуковай дзейнасцю, да нас прыязджаюць выкладчыкі з Германіі, Нарвегіі, Нідэрландаў».

У выхаваўчай і ідэалагічнай рабоце — першыя

Не сакрэт, што большасць студэнтаў БДАТУ — з сельскай мясцовасці (мінчан тут увогуле ўсяго 7,3 працэнта). Адной з галоўных задач рэктар універсітэта лічыць выхаванне і ўсебаковае развіццё маладых людзей. У напрамках наладжвання выхаваўчай і ідэалагічнай работы кіраўніцтва ўніверсітэта прыклала бадай не меншыя намаганні, чым пры аднаўленні матэрыяльнай базы ВНУ. І вынік таксама не прымусіў сябе доўга чакаць. Зніклі не толькі правапарушэнні сярод студэнтаў. Сёлета Беларускі аграрны тэхнічны ўніверсітэт заняў першае месца сярод 23 сталічных ВНУ па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце. На яго базе адбылося выязное пасяджэнне Мінгарвыканкама з удзелам рэктараў усіх ВНУ, у выніку чаго было прынята рашэнне распаўсюдзіць свой досвед выхаваўчай работы сярод навучальных устаноў.

Падчас конкурсу ацэньвалася выхаваўчая праца ВНУ па шэрагу параметраў — ад сацыяльна-бытавых умоў і інфармацыйнай работы да метадычных распрацовак і абсталявання навучальных карпусоў і інтэрнатаў. А ў музеі гісторыі ўніверсітэта ёсць нават запіс кіраўніка рэгіянальнага офіса Міжнароднай харчовай арганізацыі ААН Марыі Кадлейчыкавай. У свой час яна кіравала адной з аграрных ВНУ ў Будапешце і выдатна ведала спецыфіку такіх навучальных устаноў. У Мінску ж спадарыню Кадлейчыкаву ўразіў сярод астатняга знешні выгляд і студэнтаў, і самой ВНУ. І запрасіў, рэктар універсітэта Мікалай Казаравец лічыць, што культуру прывіваць неабходна якраз праз побыт. Пяць гадоў таму, падчас рамонту актавай залы, узнікла пытанне, якімі крэсламі яго абсталёўваць. Драўлянымі? Гэты варыянт больш танны, але і практычны. Або плюшавымі, якія выглядаюць куды больш сучасна і эстэтычна? Другі варыянт многім падаўся рызыкоўным, бо аднаўляць усялякі раз крэслы не так і танна, аднак спыніліся менавіта на ім. І як прызнаюцца ва ўніверсітэце цяпер, за пяць гадоў у актавай зале не саспавана ніводнага крэсла, а выглядае яна гэтак жа, як і адразу пасля рамонту. «Калі мы навучым студэнтаў цаніць і захоўваць сваё працоўнае месца ў аўдыторыі, інтэрнаце, то і на вытворчасці гэты спецыяліст будзе па-гаспадарску ставіцца да матэрыяльных каштоўнасцяў», — лічыць рэктар універсітэта Мікалай Казаравец.

Лепшы інтэрнат сталіцы — у БДАТУ

Асобная размова — студэнцкія інтэрнаты. Вядома, што сёння інтэрнацкі побыт студэнтаў, асабліва ў сталіцы, не мае нічога агульнага з аскетычным побытам савецкіх і перабудовачных часоў. Інтэрнаты пазбавіліся ад жалезных ложкаў — сімвалаў студэнцкага жыцця мінулага стагоддзя. БДАТУ і тут стаўся адным з першых, хто можа падзяліцца сваім перадавым досведам і ў гэтым аспекце. Спачатку трэба сказаць, што на сёлетнім аглядзе-конкурсе сталічных інтэрнатаў інтэрнат БДАТУ № 6 заняў першае месца. Перамога была аддадзена менавіта яму, будынку зусім не новаму, нягледзячы нават на сур'ёзныя намеры астатніх канкурэнтаў.

Пачатак гэтай перамогі ў 2007 годзе, калі ў БАТУ былі распрацаваныя — гэта пакой адпачынку?

Таццяна Вашчаева расказвае, што адной толькі ўтульнасці і прыгажосці студэнцкага пакоя для перамогі ў конкурсе было недастаткова. Студэнты «ўзялі» камісію і сваімі творчымі талентамі:

— На ганку інтэрната хлопец з дзяўчынай у нацыянальных строях сустракалі камісію вершамі і запрашалі ў свой дом. У актавай зале праходзіла прэзентацыя нашага студэнцкага гарадка і тых адметных асаблівасцяў, якія мае наш інтэрнат. Там дзякуючы старанням загадчыцы інтэрната Любові Андрэйчык ёсць нават гасцёўня з камінам. І нашы студэнты маюць магчымасць не толькі займацца ва ўтульным пакоі (там праходзяць заняткі студэнцкага тэатра па тэхніцы маўлення) — нашы імяніннікі праводзяць там мірымай пазіцыяй Мікалая Уладзіміравіча нельга. Неабходна гэта і для падтрымання статусу самай здаровай сталічнай ВНУ (летась такую выснову зрабіла 33-я сталічная студэнцкая паліклініка).

«Сёлета першага верасня на ганку галоўнага корпуса і ў іншых недазволеных месцах не было ніводнага студэнта 2, 3, 4 ці 5 курса з цыгарэтай у руках. Толькі першакурснікі, якім мы тады яшчэ не паспелі растлумачыць, што курыць у нас можна толькі ў спецыяльна адведзеных месцах, — расказвае Таццяна Вашчаева. — І за гэтым сочаць не толькі выкладчыкі, але і дзяжурныя студэнты». І сапраўды, такую з'яву, як дзяжурства, мы назіраем падчас нашай размовы з Таццянай Мікалаеўнай.

— Цалкам адмовіцца ад курэння нам наўрад ці ўдасца ў найбліжэйшы час. Але станоўчая тэндэнцыя ёсць: гэтак жа, як моладзь паступова адмаўляецца ад чыпсаў і газаваных напояў, аддаючы перавагу больш здаровай ежы, гэтак жа паступова яна адмаўляецца і ад цыгарэт, — падкрэслівае Таццяна Вашчаева.

Музей гісторыі БДАТУ аднолькава цікаваы і для ветэранаў, і для моладзі. Тут сабрана мноства дакументаў пра мінулае і сённяшні дзень універсітэта. Лепшым гідам у гэтым акіяне інфармацыі з'яўляецца загадчык музея Алена КРУЖАЛАВА (на здымку). З асаблівым гонарам за свой універсітэт знаёміць яна з высокімі адзнакамі ВНУ — міжнароднымі ўзнагародамі і сертыфікатамі. У студэнцкім гарадку таксама шмат што распавядае пра гісторыю навучальнай установы — днямі тут была адкрыта памятная дошка ў гонар першага рэктара, доктара тэхнічных навык, прафесара В.П. Суслава.

Духоўна-асветніцкі цэнтр створаны ў студэнцкім гарадку з удзелам Мінскага Свята-Елізавецінскага манастыра. Студэнты і выкладчыкі сустракаюцца тут са святарамі, знаёмяцца з новай духоўнай літаратурай і фільмамі.

Самая здаровая ВНУ Мінска

Цікава, што існуе тут і спецыяльная праграма па барацьбе з курэннем. «У нас ёсць праблемы, і адна з іх — тое, што і хлопцы, і дзяўчаты, на мой погляд, шмат кураць», — кажа Мікалай Казаравец. Праўда, на наш погляд, Мікалай Уладзіміравіч як максімаліст па натуры крыху перабольшвае праблему. Паводле статыстыкі, усяго 36 працэнтаў студэнтаў БДАТУ маюць гэтую шкодную звычку, а яшчэ 2-3 гады таму іх было каля 70. Тым не менш у часы, калі мода на здароўе стала надзвычай актуальнай, не пагадзіцца з непрыемным фактам немагчыма. Таму ў ВНУ ўсе ўмовы для таго, каб студэнты маглі весці здаровы лад жыцця. Ёсць і спецыяльныя праграмы для тых, хто хоча пакінуць курэнне